№ 14 (468) 7 красавіка 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Аднаўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

# Што гэта было

Вясна–2006: сьведчаньні, вынікі і прагнозы. Старонкі 4—23.



**На фота: 25 сакавіка. Сьмяльчак адфутбольвае назад пад шэрагі спэцназу выпушчаную адтуль дымавую гранату.**

## Газтромб

Беларускае кіраўніцтва вымушанае выбіраць між кепскімі ды вельмі кепскімі для сябе сцэнарамі. Піша Аляксандар Класкоўскі. **Старонка 24.**

## Ня людзі за палітыкамі, а палітыкі за людзьмі

Ня людзі пайшлі за палітыкамі, а палітыкі былі вымушаны саступіць чаканьням нікому дагэтуль не вядомых юнакоў і дзяўчат. У выніку нешта зрушылася ў Беларусі. Што? Піша Віталь Тарас. **Старонка 4.**

## Сярэдненькія карты апазыцыі

Апазыцыя рабіла памылкі. Але гэта мала што мяняла, мяркуе швэдзкі палітоляг-беларусіст Нярыюс Пракявічус. **Старонка 6.**

## Новая грамадзянская супольнасьць

Вёсны-1996, -2006 — пасьлядоўныя і ўзаемазьвязаныя крокі грамадзтва па адваёўваньні для сябе прасторы свабоды. Які крок будзе наступным і калі? Піша Алесь Коцюбаў. **Старонка 8.**

# Ад рэдактара

Гэты нумар складаецца з камэнтароў і аналізу падзеяў 19—25 сакавіка, з экскурсамі назад, у выбарчую кампанію, і наперад, у поствыбарчы сындром, з рэакцый — ад палітычных да паэтычных — на гэтыя падзеі і чытацкай пошты на гэтую тэму. Дарэчы, «Наша Ніва” бліжэйшы час будзе такой, як гэты нумар, — «газэтай часопіснага тыпу”. Яна будзе складацца пераважна з камэнтароў, рэакцый, чытацкіх допісаў, а таксама культурніцкіх і літаратурных матэрыялаў. Нумары абсягам 48 старонак будуць чаргавацца з 32-старонкавымі. Іншы фармат у цяперашняй сытуацыі немагчымы. Яшчэ пытаньне, як утрымаць такі: зьяўляюцца новыя факты і формы ціску на газэту. Нас бясконца доўга водзяць за нос у ідэалягічным аддзеле Менскага гарвыканкаму (загадчык Генадзь Курбека, былы журналіст БТ), зь якім цяпер мусова ўзгадняць дробязныя пытаньні, датычныя юрыдычнага боку існаваньня газэты. Урэшце, у аўторак стала вядома, што газэту высяляюць з офісных плошчаў, якія яна займала шэсьць гадоў, і ёсьць меркаваньне, што гэта адбылося не без удзелу «ідэалягічных службаў”.

У такім кантэксьце пачынаецца новая палітычная пяцігодка.

Мы ня падаем духам.

Чаму пратэсты Вясны-2006 адрозьніваў такі адчайны ўздым, такі радыкалізм? Гэта была таксама рэакцыя на ціск, на зьнішчэньне прэсы, закрыцьцё грамадзкіх арганізацый. Былі перакрытыя клапаны, што давалі выхад пары.

Вясна-2006 уразіла высокай ступеньню самаарганізацыі незалежнага грамадзтва ў сталіцы. Гэта выяўлялася ў намётавым мястэчку, флэш-мобах, распаўсюдзе інфармацыі праз Інтэрнэт, масавай і зладжанай дапамозе вязьням. Самаарганізацыя была ня проста лепшай, чым у час існаваньня незалежнай прэсы, яна рабіла некаторыя працэсы непадкантрольнымі ўладам.

Сюрпрызам была энэргія і самаўзнаўляльнасьць пратэстаў. Беспрэцэдэнтная масавасьць затрыманьняў (1200 чалавек, паводле падлікаў праваабаронцаў) прывяла да такога перапаўненьня ізалятараў, што апошнія дні пратэстаў суды вымушаныя былі замяняць арышты штрафамі.

Не была затое нечаканасьцю жорсткасьць зьдзекаў зь людзей, якая характарызавала дзейнасьць асобных спэцпадразьдзяленьняў (ня ўсіх). Ці панясуць яны адказнасьць? — пытаньне, якім задаваліся многія на Акрэсьціна. На старонцы 23 наш кар. падае цікавую інфармацыю з Польшчы. У аўторак суд там вынес вырак міліцыянтам, што зьдзекаваліся з актывістаў апазыцыі 23 гады таму, у 1983-м. Тыя польскія міліцыянты таксама, мусіць, выконвалі загад начальства «прачысьціць мазгі опам”. Схапілі, пабілі, пагражалі забойствам, вывезьлі за горад і выкінулі ў лесе. Як гэта знаёма! Праз такое прайшлі дзясяткі нашых сучасьнікаў. Як бачым, у Польшчы справядлівасьць трыюмфуе, часам нават праз 23 гады.

Маральную сілу беларускім пратэстоўцам-2006 таксама надавала вера ў непазьбежную перамогу законнасьці.

* * *

Хацеў бы выказаць удзячнасьць усім тым знаёмым і незнаёмым людзям, якія падтрымлівалі нашу газэту і маю сям’ю падчас майго кароткага зьняволеньня.

Удзячны калегам з газэты «Белорусы и рынок”, нямецкіх газэтаў «Frankfurter Allgemeine Zeitung”, «Frankfurter Rundschau”, «Suddeutsche Zeitung”, швэдзкай «Cristianstadbladet», нарвэскіх «Aftenposten”, «Bergen Tidense”, аўстрыйскай «Die Presse”, іншых газэтаў з гэтых і іншых краінаў, інтэрнэт-часопісу «Eurozine.com”, якія вычарпальна пісалі пра маё затрыманьне і суд, пераклалі і выдрукавалі мой турэмны дзёньнік. Удзячны радыё «Свабода”, інфармацыйным агенцтвам «Associated Press», БелаПАН ды іншым, тэлеканалам Нямеччыны, Літвы, Скандынавіі, іншых краінаў, што інфармавалі пра мой працэс.

Дзякую Беларускай асацыяцыі журналістаў, Міжнароднаму ПЭН-клюбу, які аб’ядноўвае пісьменьнікаў і журналістаў, нацыянальным ПЭН-Цэнтрам Канады, Літвы, Нарвэгіі, Італіі, ЗША, іншых краінаў, украінскім сябрам Юр’ю Андруховічу, Андрэю Макравусаву, Віталю Панамарову за іхную салідарнасьць. Дзякую Міжнароднаму дому правоў чалавека, беларускім праваабарончым арганізацыям, украінскаму часопісу «Крытыка” за акцыі ў абарону «дробнага хулігана”.

Я быў адным з сотняў. Вялікі сьвет салідарны зь беларускімі людзьмі — я адчуў гэта на сабе.

# Праўда і свабода альбо гвалт і хлусьня

## Зварот дзеячоў культуры.

Сёньня ў нашай краіне пануюць гвалт, хлусьня і цемрашальства. Журналісты дзяржаўных СМІ вядуць “духоўную” вайну супраць усяго цывілізаванага сьвету і ўласнага народу. А нашы міліцыянты сталіся адзінай крыніцай “праўдзівых” сьведчаньняў у судах.

Як паказалі арышты сотняў людзей, нязгодных з вынікамі прэзыдэнцкіх выбараў, у краіне сапраўды дзейнічае прынцып “аднаго акна”. Празь яго зьняволеным падаюць у турмах баланду.

Хлусьня — гэта не адсутнасьць праўды. Гэта калі яе выдаюць за праўду. А каб у такую “праўду” паверылі, улада зачыняе незалежныя выданьні. Журналістаў, якія працуюць у іх, зьбіваюць і арыштоўваюць. Звычайнай практыкай зьяўляюцца звальненьні з працы і выключэньні з навучальных установаў паводле палітычных матываў.

Рэжым, відавочна, хоча ўтрымацца на брутальнай сіле і запалохваньні людзей. Але пасьля 19 сакавіка 2006 году ў грамадзтве адбыўся зрух: беларусы прадэманстравалі волю да Свабоды.

Мы, беларускія інтэлектуалы, людзі мастацтва і культуры, журналісты, зьвяртаемся да сваіх калег, усіх сумленных грамадзянаў Беларусі з заклікам не падтрымліваць дзеяньняў рэжыму, скіраваных супраць уласных грамадзянаў, дэмакратычных каштоўнасьцяў, нашай культуры і мовы.

Ня бойцеся! Перамога Свабоды непазьбежная.

Жыве Беларусь!

**Валянцін Акудовіч,** філёзаф; **Алесь Анціпенка,** філёзаф; **Уладзімер Арлоў,** пісьменьнік; **Зінаіда Бандарэнка,** народная артыстка Беларусі; **Рыгор Барадулін,** народны паэт Беларусі; **Лявон Баршчэўскі,** перакладчык; **Лявон Вольскі,** рок–музыка; **Радзім Гарэцкі,** акадэмік; **Сяргей Дубавец,** журналіст; **Максім Жбанкоў,** кінакрытык; **Кася Камоцкая,** сьпявачка; **Аляксандар Кульлінковіч,** рок–музыка; **Аляксей Марачкін,** мастак; **Генадзь Сагановіч,** гісторык; **Віталь Сіліцкі,** палітоляг; **Аляксандар Старыкевіч,** журналіст; **Валянцін Тарас,** пісьменьнік; **Валянціна Трыгубовіч,** мастацтвазнаўца; **Андрэй Хадановіч,** паэт


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Пратэсты працягваюцца: сталічная моладзь штодня ладзіць флэшмобы салідарнасьці. На фота: 31 сакавіка дзьвесьце юнакоў і дзяўчат прынесьлі на плошчу Якуба Коласа сьвечкі і папяровых журавоў — сымбалі памяці і свабоды.**

# Што гэта было?

Ня людзі пайшлі за палітыкамі, а палітыкі вымушаныя былі саступіць чаканьням датуль нікому не вядомых юнакоў і дзяўчат. У выніку нешта зрушылася ў Беларусі. Што? Піша **Віталь Тарас**.

У мінулым нумары «Нашай Нівы» была крытычна згаданая назва артыкулу «Першы дзень рэвалюцыі», надрукаванага ў нумары за 23 сакавіка. Маўляў, трэба было казаць не аб рэвалюцыі, але аб пратэстах. Між іншым, назву далі ў Рэдакцыі — артыкул пачаткова называўся інакш. Але зьместу артыкулу гэтая назва моцна не сказіла. Проста аўтар гэтых радкоў лічыць, што трэба асьцярожна ўжываць гучныя словы кшталту «рэвалюцыя» ці яшчэ больш прэтэнцыёзнае — «рэвалюцыя духу». Дык што адбывалася цягам тыдня паміж днём выбараў і Днём Волі?

## Іспыт Плошчай

Падзеі апошніх тыдняў сакавіка не ўкладаюцца і ў рамкі акцыяў пратэсту, да якіх усе — і ўлады, і апазыцыя — прызвычаіліся цягам апошніх гадоў. Рэч у тым, што падзеі 19—25 сакавіка нібы выйшлі па-за рамкі палітычнага поля, пашырылі яго. Распачаўшыся як мітынг супраць фальшаваньня вынікаў выбараў, пратэст хутка ператварыўся ў нешта больш сур'ёзнае, чым меркаваны выступ апазыцыі.

Адна знаёмая дзяўчына прызналася, што 19-га яна зь сяброўкамі ішла на Кастрычніцкую плошчу як на расстрэл — у літаральным сэнсе слова, — з заміраньнем сэрца. Адолеўшы страх, наступным днём многія маладыя людзі выйшлі на плошчу ўжо ня дзеля таго, каб проста падтрымаць Мілінкевіча ці Казуліна, якія ня здолелі нічога канкрэтнага прапанаваць. Яны выйшлі бараніць не свае галасы, а сябе, сваю годнасьць і самапавагу. Не яны пайшлі за палітыкамі, але палітыкі, уражаныя мужнасьцю і бескампраміснасьцю маладых людзей, вымушаныя былі неяк рэагаваць і ўрэшце саступіць маральнаму аўтарытэту нікому не вядомых датуль юнакоў і дзяўчат.

Ніхто з апазыцыі, выглядае на тое, ня верыў у магчымасьць абвяржэньня вынікаў прэзыдэнцкіх выбараў, а тым больш — у паўторныя выбары, ніхто ня верыў у масавасьць пратэстаў ці ў іхную эфэктыўнасьць. Максымум, на што спадзяваліся лідэры апазыцыі, — гэта на рэакцыю Захаду і Расеі. Гэтыя спадзяваньні спраўдзіліся толькі напалову. Дый дапамога Захаду была абмежаванай, нават дэкларацыйнай.

Але не міжнародная рэакцыя і не прадказальная рэакцыя ўладаў на дзеяньні апазыцыі сталіся галоўным чыньнікам. Галоўнымі сталіся дзеяньні перадавой часткі менскай моладзі. Моладзі палітычна незаангажаванай альбо прынамсі далёкай ад якіх-кольвечы партыйных і грамадзкіх структураў.

Тыя, хто з упартасьцю папугаяў паўтараў словы пра «Менскі Майдан», нічога не зразумелі. Яны ня здолелі разгледзець за сьпінамі амапаўцаў і рэпарцёраў беларускае Плошчы (дарэчы, у польскіх газэтах зьявілася і атрымала распаўсюд у слэнгу гэтае беларускае слова — толькі з польскім вымаўленьнем). Беларускай Плошчы, канечне, не хапала маштабу й арганізацыі ўкраінскага Майдану, бо тым, хто стаяў у Менску, было ў мільён разоў цяжэй, чым тым, хто выйшаў на плошчу ў Кіеве ўвосень 2004-га. Бо ў менчукоў не было спадзяваньняў на перамогу, не было спадзяваньняў, што сілавікі раптам пяройдуць на бок апазыцыі, не было спадзяваньняў на незалежную прэсу, не было спадзяваньняў на лідэраў апазыцыі, урэшце. Ня кажучы ўжо пра недахоп цёплых рэчаў і прыбіральняў.

## Жалезны сьмех

Але гэта й не было актам адчаю, прынясеньнем сябе ў ахвяру рэвалюцыі. Кожны з тых, хто прыйшоў на плошчу, паводзіў сябе так, як лічыў для сябе адзіна магчымым і правільным. Інакш кажучы, кожны зь іх зрабіў выбар, які не называўся «Мілінкевіч», або «Казулін», або «супраць Лукашэнкі». Гэты выбар называўся «я сам». А калі выявілася, што такіх «саміх» у Менску ды іншых месцах Беларусі не адзін дзясятак і нават ня сто, сіла кожнага зь іх узрасла шматкроць.

Яе не змаглі адужаць ні спэцслужбы, ні суды, ні турмы. Пачалося тое, што называецца «ланцуговай рэакцыяй».

Называць дзеяньні купкі — сапраўды, усяго толькі купкі — юнакоў і дзяўчат камічнымі могуць толькі людзі, пазбаўленыя ня тое што маралі, але пачуцьця рэальнасьці. І ня мае асаблівага значэньня, хто выстаўляе пратэст моладзі ды карныя апэрацыі супраць яе ў камічным сьвятле — БТ, «Советская Белоруссия» альбо «БелГазета». У кожным разе, гэта рэакцыя страху. Бо калі нехта перастае баяцца, нягледзячы на ўсе застрашваньні, калі парушаецца «звыклы» парадак рэчаў, тады пачынаюць баяцца тыя, хто страшыць, хто лічыць сябе гаспадарамі жыцьця й чужых душаў. Тады супраць мірнай акцыі «стаяньня» на плошчы кідаюць



Ня мае асаблівага значэньня, хто выстаўляе пратэст моладзі ды карныя апэрацыі супраць яе ў камічным сьвятле. У кожным разе, гэта рэакцыя страху.

спэцназ. Гэта ўсё адно, што кідаць супраць кветак у полі танкі ды авіяцыю. У Пэкіне, на плошчы Цяньаньмэнь, танкі ехалі па людзях. У Менску пакуль што абышліся СОБРам і тэлебачаньнем.

Але звыклая «карцінка» сьвету аднойчы пачынае разбурацца. І вось ужо над БТ пачынаюць сьмяяцца нават тыя, хто яшчэ нядаўна нічога, акрамя 1-га нацыянальнага, не глядзеў і верыў усяму, што гавораць з тэлеэкранаў. Усьмешка на вуснах кіраўніка, які даводзіць, быццам забарона трансьляцыі беларускіх дзяржаўных тэлеканалаў прыватнымі кампаніямі ў Літве ёсьць лепшым доказам эфэктыўнасьці дзяржаўнае прапаганды, нагадвае ашчэр пацука, які раптам апынуўся ў яркім сьвятле. У оруэлаўскім сьвеце, як вядома, «чорнае» ёсьць «белым» і наадварот. Але ж сьвет вампіраў і кадаўраў не вытрымлівае сьвятла дня. Ад яго промняў скура нячысьцікаў пакрываецца пухірамі й гнойнымі ранамі.

Асобнай ацэнкі заслугоўвае пазыцыя расейскіх інфармацыйных праграмаў. Зусім сьцісла яе можна характарызаваць так: мы прызвычаіліся жыць у страху й брудзе, дык і вы, беларусы, бярыце тое, што вам даюць, і не рабіце выгляду, быццам вам трэба болей за іншых.

## Хістаньні лідэраў

Зразумела, нельга прымяншаць тое, што ўдалося зрабіць апазыцыі за няпоўныя тры месяцы да выбараў. Ёй удалося разварушыць грамадзкую думку ў Беларусі, ёй удалося навязаць чаканьне вулічных пратэстаў. І ў той момант, калі апазыцыя спынілася ў сваім руху, палічыўшы сваю задачу ў цэлым выкананай, купка маладых людзей зрабіла яшчэ адзін крок наперад. Яны засталіся на плошчы. Лідэры апазыцыі не змаглі адразу ацаніць усёй важнасьці гэтага кроку, бо яны працягвалі думаць чыста палітычнымі катэгорыямі. Яны разгубіліся ў першы момант гэтаксама, як і ўлада, сталі разважаць над тым, ці карысна ім гэта, ці не. А калі карысна — дык у якой ступені і якія палітычныя дывідэнды можна выціснуць з новай сытуацыі? Адсюль хістаньні Казуліна, які то падтрымліваў моладзь на плошчы, то ўмаўляў іх разысьціся, то сыходзіў сам, то вяртаўся ў самы недарэчны момант — праз дзьвацаць хвілінаў пасьля «зачысткі», — то крытыкаваў Мілінкевіча за тое, што той, нібыта, правакуе ўлады на рэпрэсіі супраць дэманстрантаў, то сам адчайна кідаўся на міліцэйскія дубінкі на чале маршу на Акрэсьціна.

Прыхільнікі Мілінкевіча, як вядома, ў сваю чаргу абвінавацілі Казуліна ў правакацыйных дзеяньнях. Адпаведны адказ казулінцаў таксама быў хуткі. І ніхто зь іх, відаць, не разумеў у момант «дыскусіі», што гэтыя разборкі менеј за ўсё цікавяць грамадзкасьць. Разыходжаньні паміж экс-кандыдатамі, іхныя выпады й контравыпады цікавілі, хіба, беларускія дзяржаўныя мэдыі ды расейскія СМІ, перад якімі была пастаўленая задача прынізіць і высьмеяць акцыі пратэсту ў Беларусі, выставіць дзеячаў апазыцыі ў выглядзе блазнаў, якія ня могуць падзяліць паміж сабой славу ды грошы. Але яны, гэтыя прыўладныя мэдыі, памыліліся ў сваіх разьліках. Адразу пасьля арышту Казуліна Мілінкевіч пачаў актыўна дамагацца ад уладаў зьвестак пра ягоны лёс і стан здароўя.

Ды ня лідэры апазыцыі на той момант ужо зрабіліся галоўнымі героямі падзеяў. Імі сталі сотні невядомых юнакоў і дзяўчат, мужчынаў і жанчын, якіх пачкамі дастаўлялі на Акрэсьціна, у Жодзіна ды ў іншыя «выхаваўчыя» інстытуты.

## Нешта зьмянілася

Ці можна назваць акцыі пратэсту і масавыя арышты рэвалюцыйнымі падзеямі? У клясычным сэнсе, безумоўна, не. Вядома, што рэвалюцыю, якая не адбылася, называюць спробай бунту. Але ж і звычайным бунтам тое, што адбылося ў Менску, не назавеш. Бунт азначае, як правіла, выхад стыхійных пачуцьцяў і інстынктаў натоўпу з-пад кантролю розуму. Таму расейскі паэт назваў некалі бунт бессэнсоўным і бязьлітасным. У таго, што зрабілі менскія хлопцы і дзяўчаты, быў свой глыбокі сэнс. Бязьлітаснымі былі тыя, каму яны процістаялі. Гэта быў вынік усьвядомленага выбару, зробленага пад уплывам нармальных, высакародных чалавечых пачуцьцяў. Калі не ў жыцьці краіны, дык у жыцьці гэтых людзей адбылося нешта надзвычай важнае, чаго не перакрэсьліць тысячам прапагандыстаў ні за якую зарплату.

Калісьці, у 1968-м, на Красную плошчу ў Маскве выйшлі некалькі чалавек, каб выказацца супраць савецкага ўварваньня ў Чэхаславаччыну. Усіх — у тым ліку паэтку Натальлю Гарбанеўскую, у якой было малое дзіця, — імгненна арыштавалі пераапранутыя агенты КГБ. Удзельнікаў пратэсту хутка схавалі ў лягерах на даўгі тэрмін. Іхны ўчынак, з гледзішча прагматыкаў, нічога не зьмяніў і ня мог зьмяніць у тагачасным СССР. Ды ня толькі ў СССР. Манеры спэцслужбаў, як бачым, ня надта зьмяніліся й праз пятнаццаць гадоў па ягоным распадзе.

Але ў сакавіку 2006 г., пасьля падзеяў на Кастрычніцкай плошчы, у беларускім грамадзтве — прынамсі ў частцы яго — нешта скранулася зь мёртвай кропкі. Гэтым амаль няўлоўным, неўсьвядомленым да канца адчуваньнем таго, што нешта зьмянілася, мабыць, адрозьніваецца палітычная кампанія вясны 2006 г. ад 11-ці папярэдніх вёснаў.

Ці зробяць зь сёлетняй раньняй вясны свае высновы палітыкі? Ці зьменяцца яны самі, іх мэтады? Чакаць хуткіх і адназначных зьменаў да лепшага было б, напэўна, недарэчна. Ды ўвогуле, калі гаварыць пра палітычныя зьмены, то яны самі па сабе не гарантуюць паляпшэньня жыцьця й росту дабрабыту, справядлівасьці й грамадзкага спакою. Жыцьцё кожнага канкрэтнага чалавека ўвогуле мала залежыць ад грамадзкага ладу ці формы кіраваньня дзяржавай. У кожным разе, можна зрабіць у сваім жыцьці нешта такое, чым будуць ганарыцца дзеці і ўнукі.

Але варта ўсьведамляць: тое, аб чым ідзе гаворка, пакуль што застаецца фактам біяграфіі некалькіх дзясяткаў асобаў. У крайнім выпадку, гэта можа стаць фактам біяграфіі пакаленьня. Называць тыя або іншыя падзеі гістарычнымі (у чым павінен пакаяцца аўтар гэтых радкоў) сьпяшацца ня трэба. Раздачай ацэнак хай зоймуцца нашыя нашчадкі. Сёньня ёсьць больш пільныя справы.

# Сярэдненькія карты апазыцыі

Апазыцыя рабіла памылкі. Але гэта мала што мяняла, мяркуе швэдзкі палітоляг-беларусіст Нярыюс Пракявічус.

Перш чым абмяркоўваць вынікі беларускіх падзеяў, трэба ўдакладніць паняткі. І падчас выбарчай кампаніі, і пасьля абвяшчэньня вынікаў у паветры лунала слова «рэвалюцыя». Я асабіста вызначыў бы дзьве рысы, што адрозьніваюць рэвалюцыю ад іншых тыпаў зьмены ўлады: кардынальную зьмену палітычнай структуры і шырокую народную падтрымку пераменаў. Зыходная колькасьць апазыцыі не настолькі істотная — лістападаўскія падзеі 1917 г. у Расеі распачала адносна нешматлікая партыя, але ў выніку адбыліся ўсёахопныя грамадзкія пераўтварэньні… З гэтага гледзішча ўсе антыкамуністычныя трансфармацыі пры канцы 1980-х ва Ўсходняй Эўропе падпадаюць пад азначэньне рэвалюцыі. За выняткам Румыніі, яны былі пераважна мірныя, бо ўлады залежалі ад падтрымкі Савецкага Саюзу, які і стварыў гэтыя рэжымы. Ня дзіва, што ў Румыніі, якая за часам Нікалаэ Чаўшэску неаднойчы дэманстравала сваю незалежнасьць ад савецкага хаўрусьніка, падзеі пайшлі па самым крывавым сцэнары.

## Схемы рэвалюцый

Галоўных актораў у антыкамуністычных рэвалюцыях шэсьць: уладная групоўка (палітычныя кансэрватары), ніжэйшае рангам чынавенства (пераважна памяркоўнае), войска і сілы бясьпекі, дысыдэнты (найчасьцей інтэлектуальныя і рэлігійныя), шырокая грамадзкасьць (найперш працоўныя) і вонкавыя гульцы (Савецкі Саюз і заходнія дзяржавы).

Схематычна антыкамуністычныя рэвалюцыі адбываюцца паводле наступнага сцэнару: рэпрэсіі супраць дысыдэнтаў выклікаюць незадаволенасьць шырокай грамадзкасьці, палітычныя пратэсты перарастаюць у масавыя дэманстрацыі і страйкі, сілы бясьпекі ня ў стане стрымаць пратэстаў (замала патронаў ці бессаромнасьці), на зьмену здыскрэдытаванай уладнай групоўцы прыходзіць ніжэйшае рангам чынавенства, яно пачынае перамовы зь лідэрамі дысыдэнтаў. Канчатковы зыход залежыць ад маштабаў народнай незадаволенасьці і моцы дысыдэнцкага руху. Там, дзе ён быў слабейшы, новая чыноўніцкая эліта даўжэй пратрымалася ўва ўладзе. Вядома, гэта проста схема, якая ня цалкам падыходзіць пад кожны асобны выпадак.

Аднак яна дазваляе зьвярнуць увагу на некаторыя істотныя пытаньні. Посьпех і пераважна негвалтоўны характар антыкамуністычных рэвалюцыяў палягаў у адчужанасьці ўлады ад пераважнай большасьці насельніцтва, наяўнасьці шчырых дысыдэнцкіх груповак і разгалінаванасьці (вэртыкальнай і гарызантальнай) камуністычнай уладнай сыстэмы. Трэба ўлічваць і ролю вонкавых гульцоў: Савецкі Саюз, апошні хаўрусьнік камуністычных рэжымаў, ад іх адмовіўся, а патрэба ў эканамічнай дапамозе з Захаду адыграла істотную ролю ў тым, каб не дапусьціць рэпрэсіяў і захаваць вынікі рэвалюцыяў у доўгатэрміновай пэрспэктыве.

## Недарэвалюцыі

СМІ назвалі нядаўнія выступленьні ў посткамуністычных Грузіі (2003 г.), Украіне (2004 г.) і Кыргызстане (2005 г.) «каляровымі рэвалюцыямі». На маю думку, яны наўрад ці покуль што падпадаюць пад азначэньне рэвалюцыі, бо не прынесьлі трывалых структурных зьменаў. Коўдру дысыдэнцкага руху там перацягнулі на сябе былыя ўрадоўцы, не абавязкова адданыя ідэалам дэмакратыі. Да таго ж, усе «каляровыя рэвалюцыі» адбыліся пры паўаўтарытарных рэжымах з простай структурай, арганізаванай вакол палітычнага лідэра, але пры некаторай наяўнасьці плюралізму па-за сыстэмай улады. Нарэшце, «каляровыя рэвалюцыі» плянаваліся, а ня ўспыхвалі раптоўна. І для ўлады, і для дысыдэнтаў антыкамуністычныя рэвалюцыі пачаліся зьнянацку, а перавароты ў камуністычных краінах былі рэакцыяй на загадзя вызначаныя падзеі — парлямэнцкія ці прэзыдэнцкія выбары.

## Што адбылося ў Беларусі?

З увагі на вышэйсказанае Беларусь патэнцыйна больш падпадае пад катэгорыю «каляровай», а не антыкамуністычнай рэвалюцыі.

Апазыцыя не карыстаецца ўсеагульнай падтрымкай насельніцтва. Яна здолела вывесьці на вуліцы, паводле ейных жа падлікаў, да 30 тысячаў сваіх прыхільнікаў. Гэта значна менш, чым у камуністычных краінах у 80-я. Трэба зважаць і на тое, што апазыцыя засяродзіла ўсю ўвагу на сталіцы і пераважна ня думала пра акцыі пратэсту ў рэгіянальных цэнтрах (у некаторых зь іх удзельнічала да сотні маніфэстантаў). Можна казаць пра пагрозу з боку сілаў бясьпекі, але пры канцы 80-х у колішніх камуністычных краінах яна была ня меншай. Стыль кіраваньня А.Лукашэнкі, які вымагае ад намэнклятуры асабістай адданасьці, не дазваляе ўзьнікнуць у яе шэрагах апазыцыйным асяродкам — яны маглі б зрабіць пераходны працэс больш гладкім. А ў такой сытуацыі дысыдэнтам няма з кім дамаўляцца. Вонкавы ўплыў зыходзіць, галоўным чынам, ад Расеі, якая падтрымлівае Лукашэнку. Заходнія краіны абмежавалі кантакты з уладай, таму ў іх мала мэханізмаў узьдзеяньня і мала інфармацыі.

Улада амаль не дапушчае праяваў плюралізму ў грамадзтве. Альтэрнатыўныя каналы інфармацыі абмежаваныя, таму апазыцыі складаней мабілізоўваць і накіроўваць сваіх прыхільнікаў. Беларуская апазыцыя актывізуе сваю дзейнасьць толькі падчас выбараў, бо яны даюць адзіную магчымасьць доступу да дзяржаўных СМІ. Сілы апазыцыі сканцэнтраваныя ў сталіцы — там адбываецца большасьць значных падзеяў. Нарэшце, адзінства намэнклятуры выступае перашкодай да цалкам негвалтоўнай зьмены ўлады. Усё гэта ўскладняе задачу тым, хто дамагаецца пераменаў.

## Апазыцыя заблыталася ў мэтах

Аднак і беларуская апазыцыя таксама зрабіла шэраг арганізацыйных памылак, асабліва ў тыдзень пасьля выбараў. Хоць зыход выбараў быў прадказальны, па абвяшчэньні афіцыйных вынікаў лідэры апазыцыі заблыталіся ў сваіх мэтах. А.Казулін і А.Мілінкевіч называлі прынамсі чатыры розныя мэты адначасова: пералік бюлетэ-



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Пасьля выбараў лідэры апазыцыі імкнуліся адпавядаць чаканьням людзей на плошчы. На фота: Мілінкевіч правёў дзьве ночы з дэманстрантамі ў намётавым мястэчку.**

няў, другі тур, новыя выбары і стварэньне альтэрнатыўнага ўраду. Дзіўна арганізоўваліся і масавыя акцыі: тая, што адбылася 19 сакавіка (верагодна, найбольш шматлікая), скончылася прапановай правесьці гэткую ж дэманстрацыю 20 сакавіка, потым «дзень Х» быў адкладзены да 25 сакавіка. Двойчы адкладаючы «дзень Х», лідэры апазыцыі выявілі няўпэўненасьць наконт мэты акцыяў пратэсту. Ня дзіва, што апошняя дэманстрацыя — 25 сакавіка — сабрала менш удзельнікаў, чым папярэдняя, хоць улада і пазьбягала адкрыта ўжываць гвалт (маленькі «намётавы гарадок» зьліквідавалі ўначы).

## Улада ведала, што ёй пагражае...

Апроч таго, улада добра падрыхтавалася як з гледзішча кантролю над каналамі інфармацыі, гэтак і разгортваньня сілаў бясьпекі. Некаторыя назіральнікі адзначалі, што апазыцыя падчас выбарчай кампаніі выявіла значны творчы патэнцыял. Я ўдакладніў бы — *у параўнаньні з ранейшай дзейнасьцю апазыцыі, але не ў абсалютным вымярэньні*. А значыць, улада добра ведала, чаго чакаць. Дзяржаўныя СМІ прывязалі апазыцыю да кантэксту «каляровых рэвалюцыяў», асабліва да расколаў паміж іх лідэрамі і неэфэктыўнай палітыкі, і досыць пасьпяхова высьмеялі яе сымбалі — сіні колер і джынс.

У СМІ прайшла кампанія па абвінавачаньні апазыцыі ў падрыхтоўцы да тэрактаў, лідэры апазыцыі мусілі апраўдвацца, так што здавалася — яны ўвогуле нічога не зьбіраюцца рабіць. Улада, ведаючы, што папярэднія «каляровыя рэвалюцыі» адбываліся ў сталіцах, перадысьлякавала ў Менск сілы бясьпекі. Улада была падрыхтаваная не дапусьціць масавага збору людзей на Кастрычніцкай плошчы, якую абрала апазыцыя, і адрэзала «намётавы гарадок» ад падтрымкі звонку.

## ...І не праяўляла слабасьці

Улада прывяла ў гатоўнасьць шматлікія сілы бясьпекі, але паўстрымалася іх задзейнічаць, верагодна, таму, што чакала «каляровай рэвалюцыі». Адзін зь яе галоўных элемэнтаў — блякада ці захоп урадавых будынкаў, бо гэта выяўляе бездапаможнасьць улады, паказвае сілам бясьпекі, што ўлада больш не кантралюе сытуацыю, а ўладзе — што яна ня можа разьлічваць на сілы бясьпекі. Апроч таго, пасіўныя прыхільнікі апазыцыі тады больш не баяцца далучыцца да актыўнага пратэсту. Беларуская ўлада не праяўляла слабасьці. Таму спробу А.Казуліна трапіць на Ўсебеларускі народны сход і ачоленае ім шэсьце да сьпецпрымальніка на Акрэсьціна спынілі гэткімі гвалтоўнымі захадамі.

Ліквідацыя «намётавага гарадка» найхутчэй абумоўленая тым, што ўлада ня здолела б не дапусьціць яго ўмацаваньня, калі б дэманстрантам дазволілі зноў сабрацца на Кастрычніцкай плошчы.

## А ці быў шанец?

Становішча апазыцыі ў параўнаньні з уладай неяк нагадвала гульца, які трымае карты адкрытымі. Вядома, калі карты сапраўды добрыя, ён усё роўна выйграе. Але мне здаецца, што апазыцыя мела на руках у лепшым выпадку сярэдненькія карты. Калі б за беларускай апазыцыяй стаяла выразная большасьць насельніцтва, усе гэтыя памылкі ня мелі б надта вялікага значэньня.

**Поўны тэкст аналізу Нярыюса Пракявічуса і іншыя аналітычныя матэрыялы на тэму сакавіцкіх выбараў і пратэстаў 19—25 сакавіка чытайце ў красавіцкім нумары часопісу «ARCHE», што мае зьявіцца ў продажы ад 12 красавіка.**

# Перайсьці Рубікон

Вёсны–1996 і 2006 — узаемазьвязаныя крокі грамадзтва па адваяваньні для сябе прасторы свабоды. Наступным крокам можа стаць новая грамадзянская супольнасьць, якая церазь віртуалізацыю пяройдзе да партызаншчыны альбо цераз салідарнасьць — да рэвалюцыі. Піша **Алесь Коцюбаў.**

Чарнобыльскі Шлях — 1996. Пляцоўка перад Акадэміяй навук разрастаецца людзьмі. Доўга чакаць да шэсьця, а ўжо натоўпы па абодва бакі праспэкту. Гэта першае, чым Вясна-1996 адрозьнівалася ад Вясны-2006. На апошнюю люд зьбіраўся са спазьненьнем на паўгадзіны — калі толькі бачыў, што першых, хто прыйшоў, не разагналі.

У 1996 г. было па-іншаму. Украінцы падымаюць сьцягі над парэнчамі, за імі б'е ў вочы прасякнутая чырвоным бель. «Выходзім на праспэкт!» — разносіцца па людзкой хвалі, і два языкі з абодвух бакоў дарогі кранаюць адно аднаго. Крочыць на праезджую частку з той вясны — своеасаблівы Рубікон менскіх масавых шэсьцяў на астатнія дзесяць гадоў. Пакуль мы на ходніку, мы яшчэ нібыта шпацыруем. Тады, у 1996-м, натоўп заглынуў увесь праспэкт — людзі ішлі зусім не на пагулянку.

Рух людзкой хвалі. Пачалося. І — выбух у сьвядомасьці, калі бачыш акіян галоў, расьцягнуты на кілямэтар, калі адчуваеш плечы, локці людзей адной з табой думкі. Дзесяць гадоў адсутнасьці такой энэргетычнай падпіткі — як тая, калі адчуваеш сябе сілай, — істотна зьніжалі дагэтуль самаўпэўненасьць пратэставых масаў.

Бойка з ланцугом міліцыі. Навіны потым круцілі адзін яе фрагмэнт — як украінцы прабівалі ланцуг і варочалі машыны. Я бачыў толькі, як паміж шэрагамі дэманстрантаў сноўдаў чалавек, які клікаў «Дружына БНФ, наперад!», і яшчэ як па зямлі каталіся хлопцы, дзеручы вочы ад «Чаромхі». Потым уставалі і ішлі далей.

Калі першая хваля шэсьця прабіла першую заслону, над галовамі паплылі дубінкі. Натоўп ужо мінуў агароджу, і раптам па камандзе рэшткі таго ланцуга міліцыянтаў кінуліся на людзей. Замільгацела гума, у пастцы паміж дамамі забіліся людзі, удары — хвосткія, шчыльныя, блізкія — накрылі натоўп. Зноў каманда — яны спыніліся. Сталі паўколамі пры дамох. Рукі за рукі, мы счапіліся з хлопцамі і дзядзькамі перад імі, каб сваім ланцугом абараніць шэсьце ад новай атакі. Праз хвілін пяць спэцназаўцы без энтузіязму кінуліся на нас, мы без энтузіязму сталі ўцякаць. Тады максымум рызыкі факусаваўся яшчэ толькі ва ўдары дубінкай па плячы. Ідучы побач са мной, пара хлопцаў выхвалялася: мяне два разы сьцебанулі, а мяне адзін, затое і на 2 красавіка я адзін раз атрымаў па сьпіне, і на Дзень Волі.

А ўсё толькі пачыналася!

Далей былі тралейбусы, пастаўленыя ў два шэрагі ўпоперак праспэкту, ваенныя грузавікі. Пераадолець іх аказалася лёгка — тралейбусы стаялі няшчыльна, а ў грузавіках былі адкрытыя дзьверцы кабін. Памятаю, адзін дзядзька вылез сьледам за мной, мацюкнуўся, павярнуў назад і разьбіў локцем бакавое шкло. «Вось вам, гады».

Язык шэсьця расьцягнуўся ўжо на кілямэтар. Міма праплыла Траецкае, аблепленае фатографамі, Сьвіслач. Вось як трэба зьведваць Менск — падумаў тады я. З горкі на шэсьце зноў сыпанулі міліцыянты. Не хапаць, проста пабіць. Тут жа дрэўкі сьцягоў, як на гравюры Грунвальдзкай бітвы, уткнуліся ў шчыты. Паляцела каменьне. Саступаць людзі не зьбіраліся, нарэшце саступілі міліцыянты.

Каля Палацу спорту шэсьце згарнулі, правялі мітынг каля Палацу спорту. Патрэсьлі кулакамі і разышліся. Мэтай шэсьця было паказацца, і далей гэтай мэты шэсьце ня крочыла.

Азіраючыся на той час, міжволі ўражваесься, наколькі рэальна было тым натоўпам бясстрашных людзей, калі б ён быў тады ўзброены сучаснай стратэгіяй аранжавага супраціву, зьмяніць шлях дзяржавы. Калі б гісторыя ведала ўмоўны лад.

Вясна-2006 дыямэтральна супрацьлеглая пратэсту дзесяцігадовай даўніны. Людзі ўжо ведаюць страх, і менавіта гэта мацней, чым прага правесьці шэсьце мірна, трымае іх ад агрэсіі. Цяпер Рубіконы расьсякаюць прастору па ўсім пэрымэтры тваёй пратэстнай асобы: кранеш міліцэйскі шчыт, уздымеш над галавою сьцяг, станеш перад аўтобусам з затрыманымі ці проста прыйдзеш на мітынг — і ты ўрываесься ў сакралізаваную прастору супраціву, пазыцыянуеш сябе ў ёй. І тут нібы толькі Бог альбо чорт лысы дадуць табе рады.

Аднак, у адрозьненьне ад зухаватай Вясны-1996, новы супраціў нараджае новую прастору свабоды. Пратэсты і вынікі пратэстаў тых часоў як нішто паспрыялі нагнятаньню страху на грамадзтва, ударыўшы, як палка, у два канцы. Яны паказалі ўладзе сілу і значнасьць вуліцы, і з таго моманту яна вуліцу ператварыла ў пастку для пратэстоўца. Як ты не паявіся цяпер на ёй, ходзіш пад арыштам ды штрафам. Відэа разьбітых машын, пабітых спэцназаўцаў ператварыліся ў маркер, якім БТ пачало адзначаць апазыцыю наагул.

І зусім процілеглы вынік Вясны-2006. Пратэстоўцы кідаюць сьнежкі. Голас за кадрам на БТ няўпэўнена выводзіць скорагаворку пра штыры і заточкі ў кішэнях мітынгоўцаў. Мама радавога Лосева выціскае скупую сьлязу на старонку «СБ». Па *Euronews* чацьвёра амонаўцаў месяць рукамі й нагамі ды валяць на зямлю дзядулю. На БТ ці ня тыя ж амонаўцы зь перабінтаванымі насамі румзаюць ад болю. Лажа. Толькі бабулькі ў глухіх вёсках хіба ўсхліпнулі ва ўнісон.

У гэтую вясну ўлада прайграла на самым хісткім полі бою — на тым полі, дзе ўсталёўваецца адэкватнасьць дзеяньняў, афіцыйных камэнтароў да

гэтых дзеяньняў і грамадзкай думкі. Падвяла сама сыстэма, унутры якой адсутнічаюць мэханізмы для самаўдасканаленьня. Паласуючы «вуліцу» Рубіконамі, яна не ўсьведамляе мяжы, за якой забарона ўжо перастае выконваць функцыі забароны, ператвараючыся ці то ў абсурд, ці то ў раздражняльнік. Грамадзкая думка, маючы цяпер шырэйшыя крыніцы інфармацыі, рухаючыся рэчышчам калектыўнага падсьвядомага, пачынае адрозьніваць хлусьню ад праўды паводле ўнівэрсальнай лёгікі: праўда за слабейшым, калі ён ідзе на пратэст.

Але, ня маючы тармазоў, спыніць машыну хлусьні рэжым ня ў сілах, што толькі пашырае кола людзей, для якіх самі дзяржаўныя СМІ становяцца крыніцай праўды — паводле прынцыпу «ад адваротнага». Заежджаная карцінка з заежджаным афіцыёзным камэнтаром прайграе ў моцы свайго ўзьдзеяньня чутцы, пушчанай на рабоце, што ў дэманстрантаў кідалі гранаты і што ёсьць ахвяры. Маштабы рэпрэсій уражваюць, і гэта каталізуе пратэставыя настроі. Працуючы па звыклай схеме супраць звыклага праціўніка, але ў нязвыклых умовах больш адкрытага грамадзтва, сыстэма сама кладзе балы ў капілку гэтага праціўніка. Праўда, і праціўнік перастае быць звыклым — тактыка мірнага супраціву засталася незразумелая для дзяржаўных стратэгаў. Яны не пасьпелі перарасьці Вясну-1996, як гэта зрабіла апазыцыя.

Ці здолее Вясна-2006 разьвіць посьпех першых пратэстаў? Грамадзтва кіпіць, адвалока на месяц рызыкуе ахаладзіць яго. Хоць наўрад ці яно сапраўды стане чакаць. Праца па інфармаваньні насельніцтва, дэкляраваная штабам Мілінкевіча, патрабуе добрай арганізацыі, што ва ўмовах татальных затрыманьняў будзе складанай справай. Аднак тэорыя самаарганізацыі сыстэмаў падказвае, што хаатычнае разьвіцьцё падзей зь бязмэтавым выпусканьнем пары ў гудок малаімавернае. Пры адсутнасьці рэальнай стратэгіі перамогі ў апазыцыі і малой масавасьці наступнага шэсьця можна чакаць пачатку стварэньня новай формы грамадзянскай супольнасьці. Магчыма, яна будзе складацца зь вялікай колькасьці невялікіх нелегальных арганізацый, часткова каардынаваных праз Інтэрнэт, структурна не зьвязаных міжсобку і зь існымі палітычнымі партыямі. Іх радыкальнасьць будзе вызначацца ўжо выключна памкненьнямі ўдзельнікаў, а не дэкляцыямі палітычных лідэраў апазыцыі. Гэтая грамадзянская супольнасьць будзе істотна розьніцца ад той, што сфармавалася ў выніку Вясны-1996. Апошняя канчатковай мэтай сваіх ініцыятываў бачыла найчасьцей вывад людзей на вуліцы. Зараз гэта будзе ня мэтай, а сродкам. А ў такім выпадку і колькасьць ужо не істотная.

«Рэвалюцыя», якая да гэтай вясны нярэдка сублімавалася ў пратэст на інтэрнэт-старонках, у выпадку неэфэктыўнасьці масавых акцый можа зрабіць чарговы пасьля віртуалізацыі крок: стаць бескантрольнай негвалтоўнай партызаншчынай, і гэта й будзе той магчымай прасторай свабоды, першы крок да якой быў першым крокам таго Чарнобыльскага Шляху — 1996.

Варыянт, пры якім грамадзянская супольнасьць будзе каардынаваць свае дзеяньні з стратэгіяй барацьбы «сыстэмнай» апазыцыі, імаверна, будзе таксама рэалізаваны, аднак яго эфэктыўнасьць будзе залежаць ужо ад таго, наколькі эфэктыўная абярэцца стратэгія.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Беларусь і Расея: пагрозы і пэрспэктывы

За выбарча-рэвалюцыйным процістаяньнем у Беларусі неяк прайшло паўз увагу: праграма-мінімум нацыянальнага руху пачатку 1990-х нарэшце выканана. Што далей? Піша **Васіль Аўраменка**.

За выбарча-рэвалюцыйным процістаяньнем у Беларусі неяк незаўважна прайшлі больш ціхія, але значныя падзеі ў нашых суседзяў. Сярод іх — прэзэнтацыя новай дактрыны Крамля, агучаная ў вузкіх колах маскоўскіх ідэолягаў Уладзіславам Сурковым. Напрацоўкі крамлёўскіх стратэгаў сьведчаць: па-першае, пасьпяшаліся футуролягі пахаваць Расею. «Дзьвюхгалова-чырванасьцяжная» яшчэ памахае сваімі эўразійскімі крыламі. Па-другое, маскоўскія ідэолягі (у адрозьненьне ад беларускіх) ядуць свой хлеб не дарма, а інтэлектуальны патэнцыял расейскай эліты застаецца досыць высокі. Для беларусаў у крамлёўскай дактрыне ёсьць нямала цікавага і павучальнага.

## Старая песьня пра новае

Маскоўскія рэалісты — сярод іх Суркоў — зьмірыліся з тым, што Расея, у адрозьненьне ад СССР, не сусьветная супэрдзяржава. Але ўспамін пра «імпэрыю» разам з гістарычным шлейфам моцна сядзіць у сьвядомасьці сучасных крамлёўцаў. Не ўдалася «лібэральная імпэрыя» — хай будзе энэргетычная або ядзерна-энэргетычная. Паводле меркаваньня маскоўскіх стратэгаў, гэта новае «званьне» і новая роля Расеі. Мо Масква і марыць зрабіць з Эўропай тое ж, што зь Беларусьсю, — падсадзіць на сваю энэргетычную голку, — але пакуль тон у сьвеце задаюць не сыравінныя, а «спажывецкія» краіны. А вось дзяржавы, што стаяць толькі на «энэргетычнай» назе, будуць заўсёды хісткія і ненадзейныя. Крэмль гэта разумее і мае вялікі спадзеў яшчэ на адну падпору —ядрава-вайсковую. Аднак галоўная навіна крамлёўскай дактрыны не замежнапалітычная (тут Расея прэтэндуе хіба на ролю рэгіянальнага лідэра), а ўнутраная, скіраваная на стабілізацыю грамадзкіх парадкаў, кансэрвацыю палітычнай сыстэмы і мяккую эканамічную мадэрнізацыю.

## Асаблівасьці нацыянальнай дэмакратыі

Расея прызнае, што распад СССР быў адзіна магчымым выхадам з наяўнай сытуацыі. У.Суркоў адзначае, што савецкае грамадзтва наўрад ці можна прызнаць свабодным, справядлівым і эканамічна эфэктыўным, а непазьбежная дэградацыя яго ўладнай эліты стала апошняй кропляй, якая прывяла да фатальнага зыходу.

Сёньняшняя Беларусь ідзе савецкай каляінай, і калі нашы ідэолягі надумаюць пісаць свае праграмы з канспэктаў Суркова, то шмат чаго ім давядзецца выкінуць. Напрыклад, заявы пра агульнаэўрапейскі шлях і дэмакратыю, ад якіх Крэмль, нягледзячы на ўсе расейскія асаблівасьці, на словах не адмаўляецца. Паводле меркаваньня Суркова, дэмакратыя неабходная, бо, па-першае, толькі супольнасьць і супрацоўніцтва свабодных людзей могуць быць эфэктыўныя і канкурэнтныя; па-другое, толькі адкрытае грамадзтва можа інтэгравацца ў сусьветную эканоміку і сыстэму ведаў, мець доступ да сучасных тэхналёгіяў; па-трэцяе, пры дэмакратыі жыць больш камфортна, чым безь яе, а яна немагчымая без існаваньня партый, мясцовага самакіраваньня і няўрадавых арганізацый. Нягледзячы на дэкляратыўнасьць і нават «экспартную» скіраванасьць падобных заяваў Крамля, на іх фоне беларуская мадэль выглядае як тыповая азіяцкая дэспатыя.

Хоць ніхто з высокіх маскоўскіх трыбун даўно ня кажа «дзермакратыя», праблем з народаўладзьдзем у Расеі нямала. На думку Суркова, расейская дэмакратыя не абавязкова павінна капіяваць заходнюю. У кожнай краіны свой шлях, тут ня можа быць адзінага эталёну — лічаць у Крамлі. Расея выбірае шлях даволі ўрэзанай («кіраванай»), але — усё ж дэмакратыі. Галоўнымі ворагамі расейскага народаўладзьдзя абвешчаныя карупцыя і беднасьць. Эфэктыўных сродкаў пераадоленьня гэтых заганаў пакуль не прапанавана.

## Нашы, нянашы і жыцьцё пасьля сьмерці

І ўсё ж, нягледзячы на спробы нашых усходніх суседзяў захаваць дэмакратычныя дэкарацыі (партыйны парлямэнт, рэшткі сыстэмнай апазыцыі і незалежных СМІ, падзел улад), падабенствы беларускага і расейскага шляхоў відавочныя. Дзяржздума пад пятой пуцінскіх «адзінаросаў», асобныя апазыцыянэры, зь ліку былых правых ці левых, у лепшым выпадку могуць зьявіцца на якім-небудзь тэлешоў, а ўсе галіны ўлады фактычна «пастроеныя» пад прэзыдэнта і глядзяць яму ў рот. Для поўнага падабенства зь Беларусьсю не хапае толькі адной дэталі — балятаваньня прэзыдэнта на трэці тэрмін. Нават палітычныя ворагі там і тут вельмі падобныя: «нацыянал-ізаляцыяністы» ды «правыя лібэралы». У Расеі, праўда, ёсьць яшчэ адна катэгорыя ворагаў — алігархі-рэваншысты (Беразоўскі, Хадаркоўскі, Гусінскі, Касьянаў). Тыя, што спрабуюць вярнуць эпоху 1990-х, час росквіту алігархічных кланаў, моцы рэгіянальных «князькоў» і катастрафічнай слабасьці цэнтральнай улады. Сёньняшнія насельнікі Крамля з жахам узгадваюць тыя часы, калі «дзяржава адступала па ўсіх франтах, а краіна была фактычна на мяжы распаду». У нас ніякіх расколаў быць ня можа, бо няма «алігархаў», а ёсьць толькі «манарх». І калі расейцы толькі спрабуюць




**Пэрформанс зуброўцаў ля расейскай амбасады ў Менску: пасьля «мыцьця» расейскі сьцяг ператварыўся ў савецкі.**

завабіць на радзіму сваю пужлівую «афшорную арыстакратыю», далучыўшы яе да дзяржаўна-патрыятычнай буржуазіі, то ў нас гэта даўно здарылася, бо ўвесь колькі-небудзь сур'ёзны бізнэс надзейна «прышпілены» да «апоры дзяржавы». «Антыпатрыятычнага» (сынонім — антыпрэзыдэнцкага) капіталу ў нас няма ў прынцыпе. Беларускія «хадаркоўскія» пакінулі краіну яшчэ дзесяць гадоў таму. Тое, што Крамлём інсьпіраваны рух «Нашы» сьведчыць пра дзяржаўную манапалізацыю і патрыятызму, і моладзевага руху ды іншых праяваў грамадзкага жыцьця. Спачатку падзяліць усіх на «нашых» і «нянашых», а потым замачыць апошніх, і лепш не на вуліцах, а ў офісах ці сарцірах — менш крыку, гвалту і тэлекамэр. Вось такія асаблівасьці нацыянальнай дэмакратыі. Фактычна, палітычная сыстэма, што ствараецца ў Расеі, ёсьць аўтарытарызмам зь «человеческим лицом», а беларуская мадэль — гэта ўжо жыцьцё пасьля сьмерці.

Сучаснай мэдыцыне вядомы такія выпадкі, званыя тэрмінальнай комай, калі жыцьцёвыя функцыі загінулага падтрымліваюцца рэанімацыйнай тэхнікай. Для нас такім «рэанімацыйным рэсурсам» ёсьць Расея, але «апарат» хутка адключаць, пра што «лекары» ня раз папярэджвалі. Так што нашу «насільна працьвітаюшчую» радзіму чакаюць не зусім радасныя часы. Ёсьць, праўда, некалькі аптымістычных нотак у гэтай змрочнай увэрцюры. Па-першае, у гісторыі Беларусі ўпершыню адбылася не расейская ці якаясь петраградзкая, а свая ўласная рэвалюцыя. Хай сакавіцкія падзеі не прывялі адразу да жаданага выніку, але гэта ня значыць, што сьвет і грамадзтва пасьля іх не мяняюцца. Нічога ў гісторыі не праходзіць дарма, не прападуць марна і нашы ахвяры. Па-другое, ніхто сёньня ў нашай краіне ня ставіць пад сумнеў каштоўнасьць беларускай дзяржаўнасьці. Нават афіцыйныя лёзунгі «За Беларусь» — яскравае сьведчаньне таго, што праграма-мінімум нацыянальнага руху пачатку 1990-х нарэшце выканана. Засталося толькі ўдакладніць: якую Беларусь мы хочам бачыць — свабодную, дэмакратычную, сувэрэнную або паралізаваную страхам, падвешаную на маскоўскіх палітычных матузках і газавых трубках. Галоўнае пытаньне ў тым, хто будзе даваць адказ: адзін знэрваваны чалавек, што сутаргава чапляецца за сваё службовае крэсла, або ўсе свабодныя і сьвядомыя людзі краіны, якія не баяцца паглядзець праўдзе ў вочы і сказаць тое, што думаюць: «Далей так існаваць нельга, жыцьцё патрабуе пераменаў. Будучыня — за намі!»

**Васіль Аўраменка**

**ВОДГУК**

# Хай пасьміхаюцца!

У заключных пасажах артыкулу Віталя Тараса «Па кім плача Акрэсьціна» («НН», № 13) засмуцілі словы: «*пасьміхацца над апазыцыяй і яе прыхільнікамі расейскія журналісты навучыліся цудоўна… яны ня хочуць разумець, што сеюць зубы дракона*».

Ці трэба даводзіць, што жарт і іронія — далёка не сынонімы зьдзеку і паклёпу? Жывым людзям сьмех ідзе на карысьць; вось жа, сярод апанэнтаў рэжыму пераважаюць чалавечыя істоты, а не анёлы з крыльцамі. Асабіста мяне абнадзейвае, што маладафронтаўцы ўмеюць пасьміхацца зь сябе і іншых…

Міжволі паважаны аўтар выступіў за цэнзуру і нудную паліткарэктнасьць, так дасьціпна разгромленую ім у «НН» колькі тыдняў таму. Але ж прадаўжальнікаў справы «Навінак», «Мультклюбу» etc. наўрад ці напалохаюць яго перасьцярогі. А на расейцаў наракаць увогуле бессэнсоўна: мы ж зь імі ў розных краінах жывём.

**Вольф Рубінчык**

# Разьбітыя люстэркі

Ці можна верыць нейкім апытаньням на палітычныя тэмы ў Беларусі? Піша **Аляксей Знаткевіч.**

Нават ад тых, хто ня верыць апошнім «аглушальным» лічбам Цэнтравыбаркаму, можна пачуць: «Лукашэнка мог бы абысьціся 55 працэнтамі, але ж яму карцела паказаць, што апазыцыю ўжо ніхто не падтрымлівае, што ён гара сярод мышэй».

Пра Лукашэнкава жаданьне няма чаго й спрачацца. Хапае і людзей, якім падабаецца ягоная палітыка. Вось толькі ці ёсьць тыя 55 працэнтаў?

У часе прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году можна было спасылацца на больш-менш незалежныя і верагодныя апытаньні грамадзкай думкі. Яны паказвалі, што Лукашэнка сапраўды набраў у першым туры крыху больш за палову галасоў. Цяпер спасылацца няма на што.

Тут не вядзецца пра тое, які быў бы рэйтынг Лукашэнкі, калі б ягоным супернікам дазвалялі ладзіць нармальныя сустрэчы з выбарцамі, калі б іх не затрымлівалі і не зьбівалі, калі б апазыцыя мела рэгулярны доступ да тэлевізара, а ня дзьве парэзаныя гадзіны на пяць гадоў. Рэч нават і ня ў тым, што сёлета дазвол на апытаньні каля выбарчых участкаў атрымалі толькі дзьве «праверанія» арганізацыі. Галоўная праблема — ці можна ўвогуле верыць нейкім апытаньням на палітычныя тэмы ў Беларусі, калі людзей штодня арыштоўваюць дзясяткамі, а старшыня КДБ праз дзяржаўную тэлевізію пагражае ўсім удзельнікам дэманстрацыі пратэсту сьмяротным пакараньнем.

Расейскі сацыялягічны цэнтар Лявады паспрабаваў правесьці апытаньне ў дзень выбараў, але не каля выбарчых участкаў. Прадстаўнікі цэнтру ўвогуле адмовіліся агучваць вынікі — яны тлумачаць, што трацiна апытаных не хацела адказваць, а гэта ставіць пад сумнеў любыя лічбы. «Комсомольская правда» падае эпізод з працы цэнтру *Ecoom* каля аднаго з выбарчых участкаў у Менску — з 19 апытаных адзін за Лукашэнку, адзін за Мілінкевіча, адзін супраць усіх, а 16 адмовіліся адказваць. Нагадаю, ужо зраніцы 19 сакавіка *Ecoom*, як заўжды, агучыў вялізарныя лічбы падтрымкі ўлады.

Мне самому цяпер давялося паўдзельнічаць у апытаньні, якое ладзілі у беларускія студэнты каля амбасады Беларусі ў Празе. За дзень выбараў апыталі 157 чалавек. Зь іх 30 адмовіліся адказваць, адзін прагаласаваў за Гайдукевіча, шэсьць супраць усіх, восем за Казуліна, дзевяць за Лукашэнку і 103 за Мілінкевіча.

Аднаму з арганізатараў апытаньня супрацоўнікі амбасады потым паказалі копію пратаколу выбарчай камісіі. Паволе афіцыйнай вэрсіі, агулам прагаласавала 259 чалавек, за Лукашэнку — 156, за Мілінкевіча — 92, за Казуліна — 4, за Гайдукевіча — 2, адзін бюлетэнь прызнаны несапраўдным. Варта падкрэсьліць, што мы апытвалі менавіта тых, хто выходзіў з выбарчага ўчастку ў амбасадзе і казаў, што браў удзел у выбарах. Беларускія палітуцекачы, якія некалькі гадзінаў ладзілі каля пасольства пікет, у апытаньні ня ўдзельнічалі.

Простая матэматыка не сыходзіцца, нават калі зрабіць фантастычнае дапушчэньне, што ***ўсе***, хто галасаваў датэрмінова, хто адмовіўся ўдзельнічаць у апытаньні і каго мы папросту не заўважылі, прагаласавалі за Лукашэнку.

Нехта можа запярэчыць, што галасаваньне ў амбасадзе не адлюстроўвае настроі выбарцаў у Беларусі. Магчыма, хаця рэакцыі апытаных часам нагадвалі, грамадзянамі якой краіны мы ўсе ёсьць. Мне запомнілася пара сярэдняга веку, якая адмовілася агучыць свой выбар. Мужчына адразу схаваўся ў машыну, буркнуўшы: «Не магу». Жанчына чысьцюткай беларускай мовай папрасіла хвілінку пачакаць, пераклала ў багажнік нейкі пакет, а потым сама спыталася: «Гэта ж я магу адказваць, а магу і не адказваць?» «Ну так, натуральна», — крыху разгубіўся я. «Тады я лепей ня буду адказваць». Я амаль адразу ж пашкадаваў, што не правёў экспэрымэнту — як бы яна рэагавала на заяву, што адказваць абавязкова?

Калі бяз жартаў, дык гэтаксама можна пярэчыць і любым вынікам апытаньняў на палітычныя тэмы ў Беларусі. Толькі калі сацыёлягі давядуць, што яны праканталявалі фактар страху, што яны маюць надзейныя мэтодыкі, каб гэты страх замерыць і зрабіць на яго папраўкі — толькі тады можна казаць, што іх лічбы сапраўды нешта адлюстроўваюць. Бо ўлада паразьбівала люстэркі, і цяпер ёй няма куды глядзецца, каб убачыць уласны твар. А гэтае відовішча нашмат страшнейшае, чым «завэдзганыя францужанкі» на менскіх рэклямах, што некалі так расхвалялі Лукашэнку.



# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир
Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | 3015 212 000 012 | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

**КВИТАНЦИЯ**

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир М.П.
Плательщик

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

## Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьнена. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. Квіток ахвяраваньня трапляе да нас праз 5—10, а часам і болей дзён.

# Шукаем чытачоў!!!

Калі хто ведае наступных чытачоў «НН», просьба падказаць ім скантактавацца з газэтай.

**Чытач з Зарніцы Спасава,** дашліце свой дакладны адрас і прозьвішча.
**Леанід Мікалаевіч Н.** з вул.Калініна, удакладніце свой адрас.
**Сп. Міхайлаў** з вул. Багдановіча, скантактуйцеся з Рэдакцыяй.

**Калі вы не атрымалі газэты**

да панядзелка, а ў Менску — да суботы, абавязкова тэлефануйце ў Рэдакцыю. Пытацца Аляксандру.

Тэлефоны:

(017) 284–73–29,
(029) 618–54–84,
(029) 260–78–32 (МТС)

dastauka@tut.by

## Правілы падачы адрасоў:

Абавязкова падавайце індэкс, бо зь індэксам газэта дойдзе хутчэй.

Калі вы жывяце ў вёсцы ці ў мястэчку, пазначайце раён і вобласьць.

Ня трэба дасылаць квіток, пакіньце яго ў сябе, гэта вашае пацьверджаньне таго, што вы зрабілі ахвяраваньне.

Разборліва падавайце свае зьвесткі.

Атрымліваць газэту можна зь любога нумару, толькі паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас.

## Шчыры дзякуй за шчодрасьць

За апошні тыдзень Рэдакцыя атрымала надзвычай шмат ахвяраваньняў на выхад газэты.

Дзякуй **Аляксею З.**, які цяпер у Празе, за шчодрую падтрымку.
Дзякуем **Уладзімеру П., Тацяне М., Д.Д.**, якія цяпер у Расеі, за падтрымку.
**Зьмітру П.** з Барысаўскага раёну.
**З.М.** з Валожынскага раёну.
**А.Р., Алегу К., Валянціне С., Веры А., Тамары К., Ірыне З.** з Жодзіна.
**Людміле Р.** з Капыльскага раёну.
**Сяргею Ж.** з Клецкага раёну.
**Аляксандру К., Анатолю Б., В.М., Л.Ц., Лізавеце К., С.М., Тадэвушу Ш.** з Маладэчна.
**А.Х.** з Маладачанскага раёну.
**Валеру У., Р.М., Уладзімеру Ц.** з Салігорску.
**Віталю А., Міхаілу Т.** са Слуцку.
**Ігару Л., Юр'ю М.** з Стоўпцаў.
**І.Р.** з Мар'інай Горкі.
**Леаніду Е., Натальлі І.** з Пухавіцкага раёну.
**Анатолю І.** з Чэрвенскага раёну.
**А.П., Антонію Д., Валянціну К., Г.К., Вікторыі В., Вользе С., Пятру П., Пятру Ш., Рэгіне Г., Уладзімеру В., Эдуарду М., Юр'ю Г., Яўгену С.** з Горадні.
**Яну Г.** з Гарадзенскага раёну.
**Сьвятлане Б.** з Астравецкага раёну.
**Вользе К.** зь Бераставіцкага раёну.
**Віктару С., Вользе Ш.** з Ваўкавыску.
**Баляславу У.** зь Івейскага раёну.
**Сьвятлане К.** зь Ліды.
**Кацярыне Ф., Сяргею П., Сяргею Т.** зь Лідзкага раёну.
**Юліі Е.** з Наваградзкага раёну.
**Д.Л.** са Смургонскага раёну.
**С.М.** са Шчучынанскага раёну.
**Валер'ю Ш., Веры К., Галіне Л., Галіне Н., Любові Ш., Тамары М., Уладзімеру П., Уладзіславу І.** зь Віцебску.
**Зьмітру К.** зь Віцебскага раёну.
**А.К., Інэсе В., Пятру А.** з Аршанскага раёну.
**К.Ш.** з Браслава.
**Андрэю Х., Антону Б., Валеру С., Галіне Ю., Уладзіславу Х.** зь Верхнядзьвінскага р–ну.
**Аляксандру П., Ірыне Б.** з Глыбоцкага раёну.
**Сяргею Ц.** з Докшыцкага р–ну.
**Валянціне М.** зь Лепелю.
**Стэфану Н.** з Наваполацку.
**А.Х., Алегу Р., Алесю П., Андрэю Г., Руслану К., Мікалаю Ч.** з Наваполацку.
**Ларысе Л.** з Пастаўскага раёну.
**Язэпу К.** з Шаркаўшчынскага раёну.
**Юр'ю П.** з Магілёва.
**А.Г., Зьмітру Д.** з Бабруйску.
**Паўлюку С.** з Горацкага раёну.
**М.Ш.** з Клімавіцкага раёну.
**Арсеню Д.** зь Берасьцейскага раёну.
**Мікалаю В., Ніне М.** зь Бярозаўскага раёну.
**Алесю Б., Віктару Ж., Вячаславу С., Руслану Г., Ф.Ж., Ю.Ц.** з Баранавічаў.
**А.М., В.Ч., Віктару А., Ігару Б., Уладзімеру Л., С.Д.** зь Берасьця.
**Сяргею Х.** з Столінскага раёну.
**А.С., Алене Б., Андрэю С., Барысу Ф., Віктару А., Генадзю Л., Канстанціну К., Кірылу Р., Л., М.Р., Марыі Б., Міхаілу Б., Ул. С., Уладзімеру М.** з Гомелю.
**Андрэю Л., Валеру С., Мікалаю К.** са Жлобіна.
**Аўгіньні С., Ларысе Р.** з Калінкавічаў.
**Віктару Л.** з Калінкавіцкага раёну.
**Фёдару Г., Юр'ю К.** з Мазыра.
**Галіне Ч., Міхаілу К.** з Рэчыцы.

Сьпіс ахвяраваньняў, якія надышлі зь Менску і Менскага раёну, будзе выдрукаваны ў наступным нумары.

запрашаем прыватных прадпрымальнікаў

браць газэту на распаўсюд у Менску і рэгіёнах.

**Вельмі просім чытачоў, якія ад Новага году чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

# Як жыць у нязгодзе з рэжымам

На што трэба кінуць усе сілы — гэта на ўтрыманьне веры. Піша **Сяргей Будкін.**

Шмат знаёмых чакалі прэзыдэнцкія выбары. Хай у размовах вялікага аптымізму не выказвалася, але жартачкі кшталту «Калі ўсё зьменіцца, набуду новую мабілу» адпускаліся часта. Прагнасьць зьменаў была куды большая, чым рацыянальнасьць развагаў. Унутры нешта тахкала, і нават розум заклікаў зрабіць стаўкі: усё альбо нічога. Але прайшлі самыя гарачыя дні вясны-2006. Зьніклі ўсьмешкі з твараў самых вясёлых дзяўчат, ніхто ўжо ня кпіць з афіцыёзных лёзунгаў. Шмат каго з маладых апанавала дэпрэсія, нехта са сьлязьмі на вачох шукае сваіх знаёмых. Кожны кожнаму тэлефануе штохвіліны: «А вы хоць ацалелі там?» Калі адказ станоўчы, другое пытаньне — «Як жыць далей?».

## Зь верою

Можна, канечне, шукаць адукацыйныя праграмы, каб уладкавацца за мяжой (напрыклад, http://edu.euro26.by). Можна працягваць суіснаваць у адной студэнцкай аўдыторыі з бээрэсэмаўцам ці наракаць на былую аднакурсьніцу, якая зрабіла ганебны рэпартаж на БТ. Выбар кожнага. Адзінае, на што трэба кінуць усе сілы, — гэта на ўтрыманьне веры. Той веры, якая кіпела-віравала зусім нядаўна і змушала ісьці на гераічныя ўчынкі кшталту таго, калі студэнты-першакурсьнікі ўладкавалі налепку «Марш свабоды» на дзьверы дэкану.

Неяк Сяргей Дубавец апавядаў, што ў часы маладосьці ён ведаў пайменна ўсіх беларускамоўных у сталіцы. Цяпер сытуацыя іншая. Абсалютная рэальнасьць: палова пасажыраў аўтобуса ў гадзіну пік размаўляе па-беларуску. А як гудзе музычны Белнэт ад сьвежых песень маладых і вядомых рок-гуртоў: «Уздымайце запальніцы!», «Беларусь будзе вольнай!», «Усё роўна мы пераможам!» (патрыятычныя і лірычныя песьні знайсьці можна тут: www.music.fromby.net). Не губляйце пачуцьця гумару — варта працягваць піць зь сябрукамі на сьвятах за «стабільную, самабытную, алімпійскую…» Беларусь пад фанэрны канцэрт з АНТ, пераказваць анэкдоты ды маляваць «жабы» кшталту ашалелых амапаўцаў з крыламі анёлаў. І — ня бойцеся: «Калі вы скарыцеся страху — вы прайгралі. Калі не — прайгралі яны, з усімі сваімі дубінкамі, вінтоўкамі і гранатамі, турмамі ды аўтазакамі», — пішуць стваральнікі новага інтэрнэт-рэсурсу za-svabodu.org.

## З прагаю

Давялося на днях пачуць такое: «Пастаялі мы ноч на Кастрычніцкай. А сэнсу?» Скептыкам варта пачытаць віртуальныя дзёньнікі сёньняшніх змагароў (самы папулярны — http://bullochka.livejournal.com), паслухаць аповеды тых, хто адбыў тэрмін пакараньня. Зноў-такі напрасіцца сама сабой — гэтая частка людзей перамагла. Найперш свой страх. Гэтая частка людзей загартавалася ды скансалідавалася міжсобку. І парушыць гэты жывы ланцуг аніякія дручкі ня ў стане. Прага можа выяўляцца ў чым заўгодна. Уласна жаданьне размаўляць па-беларуску — ужо прыкмета нескаронасьці. Давёўшы хоць бы кельнэрцы-цемрашалцы, што гэта такое — «гарбата з цытрынай бяз цукру», — можна сьвяткаваць міні-перамогу.

## З учынкамі

Яшчэ адна перавага ў параўнаньні з часамі маладосьці Дубаўца — вялікія тэхнічныя магчымасьці. Прынтэр дазваляе раздрукоўваць незалежныя газэты, якія цяжка цяпер дастаць. Фота- і тэлекамэра — паказаць знаёмцам-лукашыстам, што ня ўсё так адбывалася, як дэманструюць па белТВ. Пра магчымасьці Інтэрнэту лішне казаць: шараговы пэрформанс/флэшмоб, на падрыхтоўку якога раней ішлі тыдні, зараз арганізуецца за некалькі хвілінаў — дастаткова распаўсюдзіць праз ICQ, электронную пошту, жывы журнал, форумы — і гатова. Менавіта такім шляхам людзі сабраліся на флэшмоб з чытаньнем «Саўбеліі» і правялі акцыю Салідарнасьці з палітвязьнямі на гэтым тыдні.

Вартая справа, нават пры максымуме перашкодаў, знойдзе сваё ўвасабленьне. Задушаны, падавалася б, часопіс «Студэнцкая думка» нядаўна выйшаў у новым фармаце — на кампакт-дыску. Новы музычны лэйбл «Volia Music», які, здавалася на першы погляд, ня меў аніякіх шанцаў на раскрутку такога радыкальнага праекту, як «Песьні Свабоды», зладзіў распаўсюд дыскаў не праз гандлёвыя кропкі, а па прыватнай падпісцы. Ня кажучы ўжо пра тое, што на забароненых для доступу ў беларускіх інтэрнэт-каварнях сайт музычна-праваабарончага «Ўльтравожыка» можна зайсьці праз дзясяткі іншых адрэсаў. На днях у Белнэце зьявіўся праект BZZ! (www.studenty.by/bzz.html). «BZZ! папраўляе здароўе ўсім ахвотным. Прыкаліся з тупізны — тут ёй і капец!» — тлумачаць змагары зь нездаровымі бZZікамі сваіх суайчыньнікаў і заклікаюць далучацца ўсіх, для каго словы «Скарына» і «Піцер», напрыклад, ёсьць тэмай для натхненьня.

А чаго вам каштуе запісаць сапраўдны рок-гіт, пры наяўнасьці на тое здольнасьцяў? Якасны запіс сёньня зрабіць куды лягчэй і таньней, чым нават 10 год таму. Дастаткова толькі мець кампутар з пэўнымі праграмамі. Ды інструмэнты, натуральна. А вершы пісаць дык наагул выдаткаў не вымагае. І ў самай бліжэйшай будучыні акамянелы, старамодны рэжым сканае сам.



**СЯРГЕЙ ПРЫЛУЦКІ**

# Запомні гэтую ноч...

*я з табою!* — крычаў ён у слухаўку
але ейны голас губляўся ў шматтысячным галасе
яна была нібы маленькая птушка ў эпіцэнтры стыхіі
невядомая дагэтуль сіла кіравала ўсім
але ў навакольных кварталах жыцьцё плыло бязь зьменаў
нібыта нічога і не адбылося
*я з табою* — каб апынуцца побач ён мусіў
прарвацца празь дзевяць жывых непраходных колаў
няспынна бліскалі фатакамэры й сонца
люстравалася аранжавым сафітам
у міліцэйскіх шаломах і ў вокнах суседніх дамоў
*я з табою* — пульсавала адзіная думка
нібы дзеці шчырыя і адкрытыя сноўдалі іншаземцы
і невядома было калі гэта ўсё скончыцца
адзінай пэўнай рэччу ў гэтым трывожным хаосе
была немагчымасьць вяртаньня
*я з табою* — той сьціплы кавалачак шчасьця
пеставаны гадамі гвалтоўна канфіскаваны
толькі агенты кранальнага клопату і спагады
па віхлястым маршруце крама—дворыкі—лягер
моўчкі рабілі сваю будзённую справу
*я з табою* — усхваляванае сэрца поўнае сьлёз
ён амаль што дабраўся апошнія дзесяць мэтраў
там наводдаль чуўся ўжо гул калёны грузавікоў
падобнай на рой трутняў над ліпеньскім полем
чакаць нечага іншага было б канечне наіўным
яна была *там* між пары соцень адчайных
пацалункі абдымкі яны яшчэ гэта пасьпелі
ночны штурм усе ведалі быў ужо непазьбежным
ён шаптаў ёй на вуха пад зычны ляскат мэталу
*запомні гэтую ноч яе сумнае ватэрлёо*
*я з табою чаго б нам гэта ні каштавала*
*трымаймася разам трымаймася родная разам*
*пакуль не адмовяць сілы а нават калі й адмовяць*

*24 сакавіка 2006*

# Underground

АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ



1
«На станцыі «Кастрычніцкая»
цягнік не спыняецца», —
паведамляе дынамік у вагоне.
Пасажыры ціхенька перагаворваюцца:
што адбываецца?
Можа, нейкія непаладкі на станцыі?
Ці ня здарылася чаго сур’ёзнага?
«Не, гэта апазыцыя!» —
супакойвае ўсіх п’яны пралетар.
Купка моладзі хутка ўстае
і выходзіць на станцыі
«Плошча Перамогі».
2
Званю з мэтро сябру.
«Ты вольны?» — пытаецца ён.
«Так, — кажу, —
маю паўтары гадзіны да лекцыі».
«Ды не, — кажа, — ты вольны?»
І тут да мяне даходзіць.
«Так, дзякуй!
Покуль што вольны».
За чатыры дні звыклыя словы
зьмянілі свой сэнс.
3
Вяртаючыся пасьля выкладу
на пляц,
я магу проста
перайсьці праспэкт —
і вось ён, пляц!
Але я сядаю ў мэтро,
праяжджаю станцыю,
выходжу
і вяртаюся назад ужо аўтобусам.
Найкарацейшая дарога, —
казаў адзін сталкер, —
не заўсёды наўпрост.
4
На ўваходзе ў мэтро
дзядуля прадае
цёплыя шкарпэткі.
Лаўлю яго позірк
і як мага прыязьней
усьміхаюся.
Ён усьміхаецца ў адказ.
Спускаюся ў мэтро,
потым спыняюся й паварочваюся.
Дзядуля ўсё яшчэ глядзіць
мне наўздагон.
*19—22 сакавіка 2006*

ПЯЦЬ ДЗЁН
пяць дзён ад рана да рана
твой горад дыхаў з апаскаю
твой горад горад тырана
вучыў альбанскую
ля ГУМу ўжываюць гуму
будуюць жывы рэдут
а горад
　　　　твой горад
　　　　　падумаў
«ученья идут»
мільёны дуль у кішэні
зь мільёнаў вуснаў ні гуку
так гэта былі вучэньні
падзякуй ім за навуку
навуку вымавіць «годзе!»
навуку выгукнуць «хопіць!»
твой горад горад у горадзе
якога ніхто не захопіць

АЧЫСТКІ СУМЛЕНЬНЯ
Чаго толькі ні зробіш для
ачысткі сумленьня!
Штодня сядаеш на кухні
перад тэлевізарам,
падсоўваеш плястыкавую сьметніцу
і — чысьціш, чысьціш яго,
абіраеш, як маладую бульбіну.
Ня дзіва, што яно
выглядае ўсё такім жа
сьвежым, апэтытным
і зноў гатовым да ўжываньня,
а калі ўважліва прыгледзецца —
усё меншае ў дыямэтры.
Але хто стане вымяраць
чужы дыямэтар?
Галоўнае — своечасова
выцягнуць са сьметніцы
пакет з ачысткамі
і выкінуць у сьмецьцеправод.
*26 сакавіка 2006*

## АЛЕСЬ АРКУШ

***
ня раз задаваў сабе пытаньне
чаму праўда такая слабая
а хлусьня такая моцная
а сёньня падумалася
праўда заўсёды слабая
на гвалт і прымус
і заўсёды моцная
на веру і справядлівасьць
*
хлусьня — гэта драўляныя салдаты
Урфіна Джуса
бяз сэрца без спагады
не працягвай руку хлусьні
не спрабуй зь ёй паразумецца
бараніся праўдай
*
хлусьня як атрутная жамяра
якая мусіць уджаліць
каб упырснуць сьліну няверы
найлепшая прышчэпка — трымацца свайго
*
у хлусьні кароткія рукі
каб схаваць Каліноўскага
каб прымусіць маўчаць Купалу
каб забраць грамадзянства БНР
у Ларысы Геніюш





## СЛАВАМІР АДАМОВІЧ

# Беларускай Моладзі

Стойце мужна на нашых пляцах!
Стойце сьмела: ні кроку назад!
За нашу свабоду! За вольную працу,
За свой, за новы свабодны ўрад!
Стойце дарэшты і гаварыце
Мовай вуліцы з народам сваім.
Нам нельга, нельга здацца, скарыцца,
Як некалі барбарам здаўся Рым!
Нясіце веру, што мы пераможам.
Нясіце горда наш чысты сьцяг
За нашых матуль і жанок прыгожых,
За нашу волю, за наш абсяг!
А калі раптам стане так горка,
А калі раптам «рукі назад»,
Іншыя прыйдуць і дапамогуць
Шыхтом яднаньня і песьняй у лад.
Вы наша сёньня, вы наша заўтра,
І хоць балюча, але, але
І па той бок мэталічных кратаў
Вясна цьвіце на турэмным шкле.

*Осла, 19—25 сакавіка 2006 году*

# Парады лекара былым вязьням

Найбольш тыповая праблема, што напаткала вызваленых, — парушэньне сну. Піша лекар **Андрэй Вітушка.**

3, 7, 10, 15 сутак зьняволеньня — вусны судзьдзяў агучвалі тэрміны проста і абыякава. Саракагадовыя кабеты ў мантыях з аднолькавай лёгкасьцю адпраўлялі ў перапоўненыя камэры на Акрэсьціна маладзенькіх дзяўчат і сталага веку мужчынаў.

«Правапарушальнікі» адбылі прызначанае з годнасьцю і выйшлі на свабоду героямі. Але ад турэмных сцэнаў у іх засталіся ня толькі ўспаміны. На жаль, многія з былых вязьняў цяпер маюць праблемы са здароўем. Большасьць юнакоў сутыкнулася з гэтым упершыню, і яны ня схільныя ўспрымаць гэта сур'ёзна, чакаюць, што ўсё само пройдзе. Іншыя ж зьвяртаюцца ў паліклінікі, але часта не тлумачаць паходжаньня сымптомаў, а гэта замінае спэцыялістам даваць адэкватныя парады.

## Парушэньне сну

Найбольш тыповая праблема, што напаткала вызваленых, — парушэньне сну. Праяўляецца яно цяжкасьцямі ў засынаньні, адчуваньнем стомленасьці, нявыспанасьці ўдзень і ўночы, але доўгія гадзіны ў цёплым утульным ложку эфэкту не даюць, заснуць удаецца хіба на паўтары-дзьве гадзіны ў суткі. Рэкамэндацыі ў гэтай сытуацыі могуць быць наступныя: прысьвяціце трохі часу сабе і свайму здароўю.

Пашпацыруйце па парку ўвечары, прыміце цёплую ванну з расслабляльнай пенай ці настоем мяты, выпіце мятнай гарбаты, праветрыце пакой, уключыце ціхую інструмэнтальную музыку і — дабранач!

Народнымі мэтадамі кшталту падліку авечак і куфля цёплага піва карыстайцеся крытычна — першы з прыведзеных малаэфэктыўны, а другі можа падняць вас па хуткім часе праз фізіялягічны мэханізм невялічкай, але настойлівай патрэбы (піва ўсе ж такі).

Калі простыя сродкі не спрацоўваюць, трэба зьвяртацца да мэдыкамэнтаў. Без рэцэптаў у аптэках даступныя зёлкавыя прэпараты кшталту ўлюбёнай бабулькамі «Настойкі валерыяны» і «Новапасыту». Прымаюць іх звычайна 2—3 разы на дзень курсам да месяца-двух. Але калі праблема не зьнікае цягам 4—5 дзён, неабходна ісьці на прыём да лекара. Да якога? Аптымальна да псыхатэрапэўта, але прыдасца і нэўрапатоляг ці, на скрайні выпадак, звычайны ўчастковы тэрапэўт. Кожны зь іх зможа вам выпісаць рэцэпт на больш сур'ёзныя прэпараты, а псыхатэрапэўт (і, часам, нэўрапатоляг) дапамогуць сэнсоўнай парадай.

## Галаўны боль

Наступная распаўсюджаная скарга — галаўны боль. Звычайна спадарожнічае разладам сну і праходзіць разам з нармалізацыяй рытмаў апошняга. У спалучэньні з падвышаным ціскам можа быць праявай абвастрэньня гіпэртаніі (пра хранічныя хваробы ніжэй).

## Праблемы са страваваньнем

Многія адчуваюць праблемы са страваваньнем. Гэта тлумачыцца тым, што дастаткова доўгі час вы ўжывалі нязвыклую і ня надта здаровую ежу, мала рухаліся. З-за гэтага мог парушыцца баланс мікрафлёры кішэчніка, пра што сьведчаць частыя і безвыніковыя спробы схадзіць у прыбіральню. У такім разе рэкамэндуецца перайсьці на дыету: на сьнеданак есьці кашу, у абед — лёгкі суп, паравыя катлеты з варанай гароднінай, на вячэру — кісламалочныя прадукты. Непажадана піць газаваныя напоі, моцную каву ці гарбату. Варта ўжываць дыетычныя хлябцы, валоскія арэхі, чарнасьліў, курагу. Калі ж вам давялося пагаладаваць больш за трое сутак запар, то зварот да нармалёвага рацыёну мусіць быць паступовым як па складзе, так і па аб'ёме ежы, і адбываецца ён не праз смажанае сала з бульбай, а праз рысавую кашку з варанай цяляцінай ці курай.

**Працяг на старонцы 29.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Тыдзень мінуў пад знакам вызваленьня. На фота: некалькі сотняў людзей сабраліся ля жодзінскага СІЗА ў ноч з 2 на 3 красавіка сустракаць сваіх родных, арыштаваных на Плошчы.**

# Відавочца пра 25 Сакавіка: «Хлопцы падсаджвалі дзяўчат цераз плот, дзе іх прымаў гаспадар аднаго з прыватных дамкоў»

Я відавочца падзеяў 25 Сакавіка ў сталіцы.

На падыходзе да моста ў раёне Музкамэдыі мірнае шэсьце дэманстрантаў, што скіроўваліся з кветкамі да Акрэсьціна, сустрэў вайсковы кардон, які пачаў адціскаць людзей назад. Пачуліся выбухі шумавых гранат, утварыліся дымавыя заслоны. Народ, караскаючыся па брудным схіле, ратаваўся ля плота. Салдаты пагналі людзей па вузенькім праходзіку ля плота: некаторыя пачалі падаць, хтосьці сам мусіў зьбягаць уніз. Усіх, хто апынаўся ўнізе, жорстка зьбівалі дручкамі й нагамі. Пры гэтым спэцназаўцы брутальна лаяліся. Кідаючыся на ахвяру альбо цягнучы яе за сабой, мацюкаліся: «К ноге, я сказал! Животное, …!»

Некаторым з тых, хто змог утрымацца ля плота, пашчасьціла ўцячы: хлопцы падсаджвалі дзяўчат цераз плот, дзе іх прымаў гаспадар аднаго з прыватных дамкоў. Людзі на хаду дзячылі яму за дапамогу. Дай Бог, каб гэтага сумленнага чалавека не пасадзілі. За плотам людзі дробнымі купкамі ўцякалі праз двары, у якіх сутыкаліся з паўлічэнкаўскімі зачысткамі. Некаторых наганялі, а хтосьці здолеў уцячы. Дадому вярталіся хто як мог. Сярод адступоўцаў было чуваць: «Ну, цяпер ня сорамна глядзець сыну ў вочы. Наступным разам нас будзе болей!»

Так, гэта было страшна, жахліва страшна. Толькі ня там, а ў хаце, калі прыйшло ўсьведамленьне адноснае бясьпекі. Ад сьмяротнага жаху дух займае й сёньня. Безумоўна, убачанае не забудзецца ніколі. Але толькі знаходзячыся на піку гэтага страху, чалавек пераадольвае яго. Так спараджаецца нязломная вера, нескароная мужнасьць і неадольная прага Свабоды.

**Н.С., Менск**



# «Я не змагла б даравацць сабе, калі б сышла з плошчы»

У ноч на 4 красавіка ў Менску й Жодзіне на свабоду выйшлі 200 чалавек. Каля тысячы чалавек сустракалі іх ля турэмных брамаў. Рэпартаж **Сямёна Печанка.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Палітвязьні жодзінскай турмы выходзяць на волю.**

Ля прымальніка-размеркавальніка а 2-й ночы на Акрэсьціна сабралася некалькі соцень чалавек. Вуліца была застаўленая аўтамабілямі. На сьнезе гарэлі сьвечкі, выстаўленыя ў форме сэрца. Моладзь фатаграфавалася, грэлася гарбатай. Размовы, сьмех маладзёнаў і насьцярожаныя чаканьнем твары бацькоў, выхапленыя зь цемры ўспышкамі фотаапаратаў, — так праходзіў час у чаканьні выхаду вязьняў.

Каля 3-й ночы людзей сабралася гэтулькі, што стала немагчыма пад'ехаць на аўтамабілі.

Перад уваходам людзі стварылі жывы калідор. Зьявілася вялікая расьцяжка з надпісам «Разам!».

Першага вызваленага натоўп сустрэў моўчкі, але наступных вызваленых вітаў авацыямі і крыкамі «Слава героям!». А вось родныя віншуюць маладзёна, які за кратамі адзначыў свой дзень народзінаў. Натоўп скандуе «З днём народзінаў!», сябры наліваюць шампанскае. Падносяць яшчэ шампанскага — ім частуюць кожнага вызваленага. У кагосьці зьяўляюцца пакункі CD зь беларускай музыкай. Іх таксама дораць кожнаму. Не, ня ўсім. Аднаго маладзёна адразу падхапілі бацькі, адвялі ўбок і пачалі ўшчуваць.

Выходзіць польская журналістка Вераніка Самалінская. Першыя словы Веранікі на волі ўпэўніваюць — яна зусім не шкадуе аб тым, што зь ёй здарылася: «Тут я пазнаёмілася з найлепшымі дзяўчатамі Беларусі».

Атака на намётавы гарадок засьпела Вераніку ў чарзе па гарбату. Падчас загрузкі ў МАЗы яе не чапалі, але яна стала сьведкай зьбіцьця як хлопцаў, так і дзяўчат. На Акрэсьціна польку доўгі час не маглі афармiць. Потым стала вядома, што пры спробе патрапіць да яе ў будынак размеркавальніка быў зьбіты польскі консул. «Каб вашыя міліцыянты раптам атрымалі такую колькасьць ня стомленай стаяньнем на плошчы моладзі, а сапраўдных злачынцаў, то анічога б не зрабілі — дзейнічалі крайне непрафэсійна», — мяркуе яна.

Дзяўчына наракае на ўмовы: адсутнасьць гігіенічных сродкаў, холад і няякасную ежу.

Суд польская журналістка называе фарсам. «Мне адмовілі ў перакладніку, і зразумець тое, што было ад рукі неахайна напісана ў пратаколе, я не змагла». Ёй адно патлумачылі, што свае 10 сутак яна будзе адбываць за ўдзел у несанкцыяваным мерапрыемстве, выкрыкваньні антыдзяржаўных лёзунгаў «Жыве Беларусь!» і «Далоў Лукашэнку!».

У часе адседкі Вераніку выклікалі на допыт. Зь ёй гутарыў «бардзо мілы» гэбіст. Яго цікавіла («не для пратаколу») яе стаўленьне да крымінальнага перасьледу актывістаў незарэгістраванага «Маладога фронту». Вераніка, якая абараніла магістарскую працу на тэму рэпрэсіяў у сацыялістычны час, паводзілася на допыце асьцярожна.

У камэры Вераніка пазнаёмілася з тэлежурналісткай Грамадзкага тэлебачаньня Грузіі Ніно Гіёргабіяні, якую затрымалі разам з апэратарам Георгіем Лагідзэ падчас здымак рэпартажу ля Акрэсьціна, абвінаваціўшы ў тым, што здымачная група працуе без акрэдытацыі. Ужо потым журналістка атрымала 5 сутак арышту за «дробнае хуліганства». На сёньня яна ўжо адбыла свой тэрмін і зьехала ў Кіеў асьвятляць сустрэчу прэзыдэнтаў Украіны і Грузіі (што праўда, візыт адкладзены).

Найбольш польскую журналістку ўразілі нашыя дзяўчаты, якія цягам усяго тэрміну вельмі мужна трымаліся. «Яны ўслых чыталі «Quo vadis» па-беларуску, і я адчувала, наколькі гэты твор пасуе да сытуацыі».

Толькі апошнюю ноч перад вызваленьнем дзяўчына правяла ў кампаніі непалітычнага кантынгенту — дзьвюх бамжых, нелегалкі-ўзбэчкі і дзяўчыны, якую затрымалі за крадзеж.

Вераніка зусім ня каецца, што ўначы з 23 на 24 сакавіка выбрала сабе лёс не журналісткі, а ўдзельніцы падзеяў. «Потым я астатак жыцьця не змагла б даравацць сабе, калі б сышла з плошчы», — кажа люблінская карэспандэнтка «Газэты выборчай».

**Сямён Печанко**

# На Акрэсьціна сьпяваюць і гуляюць у шашкі

Пра ўмовы ўтрыманьня зьняволеных у ізалятары УУС Менгарвыканкаму на завулку Акрэсьціна нам распавёў **Аляксей Шэін**, вызвалены 24 сакавіка пасьля пяці сутак арышту.



Самая вялікая патрэба арыштантаў — інфармацыя. Вельмі важна перадаваць газэты. У камэры, куды патрапіў Аляксей, газэты былі: іх перадавалі сп.Антончыку. Аднак зь нядзелі 19 сакавіка па чацьвер перадачы забаранілі. Кажуць, у якасьці пакараньня за мабільнік, знойдзены ў кагосьці з арыштантаў. Яшчэ адзін мабільнік застаецца ў турме. Міліцыя шукала яго па камэрах, але так і не знайшла. У камэры Аляксея тры разы чыніліператрус.

Зьняволеныя здагадваліся аб падзеях падчас вывазаў на суд: у калідорах турмы сустракалі ўсё новых людзей. Па колькасьці затрыманых можна было здагадвацца, што акцыя ўсё яшчэ працягваецца. Ад Вольгі Кузьміч і Анатоля Лябедзькі даведаліся пра намётавы гарадок, хоць міліцыянты не дазвалялі размаўляць.

Зьняволеныя таксама перамаўляюцца праз вэнтыляцыю: складаюць варонкай газэту, прыкладаюць да вэнтыляцыйнай адтуліны і кажуць: «Гаворыць камэра нумар...»

Пра захоп і разгон намётавага гарадка а 3-й раніцы 24 сакавіка зьняволеныя здагадаліся адразу ж: усю ноч езьдзілі аўтобусы, турма гула, чулася й шмат дзявочых галасоў.

## Умовы ўтрыманьня

Новы белы будынак на Акрэсьціна — гэта ізалятар часовага ўтрыманьня — прымальнік-разьмеркавальнік (ІЧУ ПР). Як кажуць міліцыянты, ён яшчэ ня ўведзены ў эксплюатацыю, але заселены. Аляксей быў адным зь першых жыхароў. У адрозьненьне ад старога будынку АСПР (аб’яднанага спэцпрымальніка-разьмеркавальніка), там у камэрах ёсьць нары (1- і 2-павярховыя), тумбачкі, у кожнай камэры — радыёкропка, рукамыйніца з гарачай вадой, прыбіральня адгароджана дзьвярыма. Патрапіўшы ў камэру, Аляксей адчуў сябе шчасьлівым: раней ён сядзеў у АСПР і таму змог ацаніць розьніцу ва ўмовах утрыманьня.

Зараз, пасьля акцыі, заселеныя абодва будынкі: ІЧУ ПР і АСПР.

У будынку АСПР самыя халодныя камэры — на першым паверсе. На падлозе стаяць лужыны, а сьцены пакрыты тоўстым налётам жоўтай цьвілі. У некаторых камэрах не зачыняюцца вокны. Аляксею ўдалося прыляпіць шкло да рамы хлебным мякішам — стала трошкі цяплей.

Кормяць на Акрэсьціна двойчы на суткі. А 7—8 раніцы зьняволеныя атрымліваюць кашу («сечку») і нешта накшталт гарбаты, увечары (час не фіксаваны, а 21—23) — зноў кашу, баланду, хлебную катлету і гарбату.

Пасьля зьняволеньня арыштант атрымлівае рахунак, які мусіць аплаціць: 15% ад базавай велічыні за кожны дзень арышту. У выпадку Аляксея — 13900 рублёў. Заплаціць гэтыя грошы трэба цягам 15 дзён, інакш яны будуць спагнаныя прымусова.

## Побыт

Галоўная праблема для зьняволенага — чым заняць час. Камэра Аляксея ўсім складам гулялася ў шашкі, зробленыя з хлеба — белага і чорнага. Дошка для гульні была выразана на нарах. Урокі шашак даваў Анатоль Яцэнка, віцэ-прэзыдэнт сусьветнай фэдэрацыі шашак, грамадзянін Украіны і супрацоўнік Украінскага міністэрства спорту. У асобе Сяргея Антончыка ён знайшоў моцнага партнэра па гульні: Антончык некалі быў чэмпіёнам прамысловага аб’яднаньня. Анатоль Яцэнка прыехаў 12 сакавіка на адзін дзень заключыць дамову зь Беларускай фэдэрацыяй шашак, а ўвечары на 15 хвілінаў завітаў да Лядовага палацу паглядзець на кандыдата Мілінкевіча. Будынак беларускай Фэдэрацыі (вул. Маркса, 10), які знаходзіцца ў адным будынку з Нацыянальным алімпійскім камітэтам, быў адзначаны на мапе сп.Яцэнкі кружочкам. Гэта і выклікала падазрэньні ў міліцыянтаў.

## Салідарнасьць

У турме ёсьць свае рытуалы праявы салідарнасьці. Напрыклад, калі зьняволеныя чуюць, што некага вядуць па калідоры, з камэраў крычаць: «Жыве Беларусь!» Уся турма адказвае: «Жыве!» Увечары нехта (мяркуючы па голасе, спадар Юхо) сьпяваў песьні. Праз сыстэму вэнтыляцыі іх можна было чуць па ўсіх камэрах, зь іншых камэр людзі яму падпявалі. Пры жаданьні можна было нават вывучыць рэпэртуар.

Вялікая дапамога кожнаму зьняволенаму — Біблія. Сваю Біблію Аляксей аддаў сукамэрнікам, калі пакідаў турму. Гэта вялікая падтрымка ў моманты адчаю. Цытата «няма выпрабаваньняў па-над сілу» паўтаралася ў камэры вельмі часта, кажа Аляксей. І яшчэ вельмі вялікая падтрымка для асуджаных — гэта прысутнасьць на судзе блізкіх і сяброў.

**Вераніка Дзядок**




**Тыдзень прайшоў пад знакам вызваленьня палітзьняволеных. На фота: сустрэча ля Акрэсьціна.**

# Газтромб



Беларускае кіраўніцтва вымушанае выбіраць між кепскімі ды вельмі кепскімі для сябе сцэнарамі. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

«Газпром» падвёў вынікі прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі», — жартуе маскоўскі «КоммерсантЪ». У Менску не да жартаў. Нібыта й разумелі, што дурніцы ня будзе. Але ж каб так крута...

І калі кіраўнік «Газпрому» Мілер эўфэмістычна сказаў пра цэны «эўрапейскага ўзроўню», то ягоны намесьнік Разанаў праз пару дзён як цьвік убіў: з наступнага году — уздымем утрая! То бок — пад 140 даляраў.

Нават дысцыплінаваныя менскія чыноўнікі забурчэлі пра шантаж.

Тым часам палітычныя дылетанты і з расейскага, і зь беларускага боку загарэліся надзеямі.

Тамтэйшыя вялікадзяржаўнікі пускаюць сьлінкі, што нарэшце зьдзейсьніцца доўгачаканы аншлюс — а іначай куды «бацьку» падзецца?

Паціраюць рукі і асобныя нашы барацьбіты: ну, усё, капец, Пуцін нарэшце зваліць дыктатара!

Асабліва няслушнай падаецца вэрсія, што беларускага кіраўніка хочуць змусіць да пасады віцэ-прэзыдэнта саюзнае дзяржавы. «Тады расейская эліта атрымае праблему, у якой ёсьць імя і прозьвішча — Аляксандар Лукашэнка, — кажа палітоляг Валер Карбалевіч. — Калі ён з пасады старшыні антыкарупцыйнай камісіі раскруціўся, то ўжо з другой пазыцыі ў саюзнай дзяржаве...»

Насамрэч, пакуль што ідзе гульня мускуламі. Прэлюдыя да чарговага гандлю вакол ласых кавалкаў уласнасьці.

Адно што гэтым разам Масква будзе даціскаць. Колькі можна заставацца з носам заміж пакету акцыяў «Белтрансгазу»? Разанаў дэкляраваў адкрытым тэкстам, што ягоная карпарацыя хоча пачувацца сапраўднай гаспадыняй беларускай трубы — улучна з газаразьмеркаваньнем і рэалізацыяй прадукту спажыўцам.

Лукашэнка ж, здаецца, спаліў масты публічнымі заявамі, што за бясцэнак «Белтрансгаз» не аддасьць. Дый нават у выпадку нейкага кампрамісу такога шалёна таннага газу ўжо ня будзе — хаця б таму, што ён даражэе і ў самой Расеі.

Эканаміст Леанід Заіка мяркуе, што $80 ёсьць крытычнай цаною для нашых прадпрыемстваў. Экспэрт Валер Дашкевіч зазначае, што пры $100 рэнтабэльнасьць беларускай эканомікі становіцца практычна нулявой.

Яшчэ адзін эканаміст — Яраслаў Раманчук — схільны лічыць, што суворыя імпэратывы падштурхнуць Лукашэнку да эканамічнае лібэралізацыі. Натуральна, працэс будзе фрагмэнтарны ды непасьлядоўны, але ж сыстэма такая, што толькі вытаргні адну цаглінку...

І ўсе экспэрты сыходзяцца на тым, што зараз беларускае кіраўніцтва павінна выбіраць між кепскімі ды

вельм
Яно м
ўласн
пляш
У гэт
«Газп
склад
ён тр
забяс
прым
крытэ
ступе
прэф
Зараз
як ні
Сацы
паліт
галеч
спыня
выбух
чакан




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

...і кепскімі для сябе сцэнарамі. ...усіць наступаць на горла ...ай песьні, выпускаць джына з ...кі.

...ым сэнсе прэсінг прагнага ...рому» сапраўды становіцца ...нікам ціску на рэжым. Дасюль ...ымаўся на здольнасьці ...ьпечваць абываталю ...альны паводле постсаўковых ...раў дабрабыт. У значнай ...ні — на кошт расейскіх ...рэнцыяў.

... рэсурс улады выглядае хісткім ...колі.

...яльныя ж забурэньні, кажуць ...олягі, часта здараюцца не ад ...ы, а ад таго, што рэзка ...нецца рост дабрабыту ды ...кае крызіс няспраўджаных ...ьняў.

**Вось вам білет ваш**

**Нараніцу 24 сакавіка, пасьля ліквідацыі намётавага гарадка, на плошчы зьявілася дзяўчына. Яе забралі разам зь іншымі, але выпусьцілі з Акрэсьціна, бо мела пасьведчаньне сябра БРСМ. Плачучы, яна спаліла гэты білет. «Пэнсіянэры», якія дзяжурылі на плошчы, здалі яе спэцназаўцам.**



# Што наша жыцьцё? Гульня!



Ва Ўкраіне пазнаёміўся з такой цікавай зьявай, як «палітычны таталізатар». Напрыклад, на берагах Дняпра букмэкеры ахвотна пагаджаюцца даць за кожную ўкладзеную грыўну 1 000 даляраў, калі Партыя абароны правоў сэксуальных меншасьцяў «Весілка» набярэ больш за 0,001%. Чаму б такую практыку ня ўвесьці ў Беларусі? Фэльетон Леліка Ушкіна.

Правілы гульні: заклаўшы адзін рубель, вы можаце атрымаць грашовы бонус у прапорцыі, прыведзенай ніжэй, у тым выпадку, калі споўняцца наступныя ўмовы.

**1,0000001 рубля за 1 укладзены рубель**, калі Ён так і не атрымае візы ў Гаагу.

**1,000001 за 1**, калі спадара Валера Шчукіна пасьпеюць асудзіць да 26 красавіка за лаянку матам у публічным месцы.

**1,0001 за 1**, калі цягам наступнага дня шэф КДБ ня здолее выявіць змовы спэцслужбаў Грузіі ў супрацы са шпіёнамі дзяржавы Фіджы.

**1,001 за 1**, калі у выніку перадачы Расеі 50% маёмасьці «Белтрансгазу» гэта супэрмэгаакцыя ня будзе названа ў афіцыйнай прэсе «геніяльнай праявай элястычнай палітыкі ў вобласьці энэргетычнай бясьпекі з боку беларускага кіраўніцтва».

**30 000 рублёў за 1 рубель**, калі ніводзін студэнт — удзельнік намётавага мястэчку на плошчы ня будзе адлічаны з ВНУ за вучэбную непасьпяховасьць.

**200 000 за 1**, калі лідэр гурту «Сябры» найбліжэйшым часам выпусьціць мэга-гіт «Слухай радыё «Свабода».

**3 000 000 за 1**, калі абсалютна непадкупны і незалежны Вярхоўны суд задаволіць скаргу Мілінкевіча на фальсыфікацыю выбараў.

**500 000 000 за 1**, калі ў хакейным турніры на прызы прэзыдэнта Рэспублікі Беларусі пераможа зборная ЗША.

**35 000 000 000 за 1**, калі «Саўбелка» ў наступны панядзелак выйдзе па-беларуску.

**1 000 000 000 000 000 000 000 000 000 000 рублёў за 1**, калі нехта з байцоў АМАПу, што зьбівалі людзей, будзе прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці.

Стаўкі на тое, што падчас інаўгурацыі прэзыдэнт хоць раз скажа слова «дэбіл» і «адмарозак», больш не прымаюцца.

Зацьвярджаю: Дырэктар букмэкерскай канторы

**Лёлік Ушкін**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Час Салідарнасьці

55 літаратараў уступілі ў Саюз беларускіх пісьменьнікаў 4 красавіка. Гэта сымбалічны крок напярэдадні працэсу ў Вярхоўным судзе, які 6 красавіка мае вырашыць лёс найстарэйшай грамадзкай арганізацыі.

4 красавіка ў СБП былі прынятыя як аўтары з гіганцкім стажам ды жыцьцёвым досьведам (акадэмік Радзім Гарэцкі), так і маладыя творцы (Рагнед Малахоўскі). Сярод новых «набыткаў» Саюзу пісьменьнікаў апынуліся творцы пакаленьня, што прыйшло ў літаратуру ў 1980-я, але тады не адчувала патрэбы ў Саюзе: Сяргей Дубавец і Тацяна Сапач, сёстры Галіна й Ірына Дубянецкія. Уступіў у Саюз дагэтуль прынцыпова пазасаюзны гісторык Анатоль Сідарэвіч і кіраўнік інфармагенцтва БелаПАН Алесь Ліпай, для якога паэзія — гэта хобі. Далучыўся да Саюзу бадай увесь сутнасна апалітычны «Бум-Бам-Літ».

Сярод новапрынятых літаратараў апынуліся і людзі, якія нямала высілкаў паклалі на змаганьне з створанай за сталінскімі часамі пісьменьніцкай арганізацыяй. Чаму цяпер яны вырашылі зьмяніць сваё стаўленьне да Саюзу пісьменьнікаў?

С.Дубавец адказаў сьцісла: «Таму што час прысьпеў».

А.Сідарэвіч выказаўся больш разгорнута: «Годзе ў 1985 ці 1986 Ніл Сымонавіч мне з трыбуны пісьменьніцкага зьезду прапаноўваў уступаць у Саюз. А нябожчык Аляксей Гардзіцкі казаў: рыхтуй паперы. Я яму адказаў: я не ўступаю ў арганізацыі, створаныя Язэпам Вісарыёнавічам, — у калгасы і ў Саюз пісьменьнікаў. У калгас я так і не ўступіў, калгасьнікам ня стаў. А Саюз пісьменьнікаў ужо перастаў быць арганізацыяй сталінскай. У нас ужо ёсьць арганізацыя паралельная, якая працягвае традыцыі Язэпа Вісарыёнавіча. Цяпер той самы час, калі ўжо трэба ўступаць».

Падтрымала гэтае меркаваньне і Т.Сапач: «Час зьмяніўся. У савецкія часы пісьменьнікам патрэбная была нейкая абарона, нейкія гарантыі. А мы людзі, якія не хацелі ні ад кога ніякіх гарантыяў. Цяпер я разумею, што прыйшоў той час, калі чым болей месцаў, дзе ты можаш паказаць, што ты не нэўтральны, — тым лепш. Цяпер гэта — адно з тых месцаў, дзе можна сказаць, што ты не нэўтральны. У час, калі Саюз патрабуе абароны, я хачу быць ягоным сябрам, бо як сябар я магу яго абараняць».

**Адам Воршыч**

**Віншуем нашаніўцаў Сяргея Дубаўца (на фота), Тацяну Сапач, Алега Аблажэя, Анатоля Сідарэвіча і інш. з уступленьнем у Саюз пісьменьнікаў.**

# Колькі затрыманых? 1200 ці 550?

Колькі чалавек было затрымана падчас Тыдня Волі ў Менску? Афіцыйныя зьвесткі й паведамленьні праваабаронцаў розьняцца.

Праваабаронцы кажуць пра больш чым тысячу затрыманых толькі ў сталіцы 19—25 сакавіка і 150 прэвэнтыўна затрыманых у рэгіёнах на працягу сакавіка. Генпракурор Беларусі Пя-тро Міклашэвіч жа паведаміў, што 19—25 сакавіка ў Менску былі затрыманыя «больш за 500 чалавек». Зь іх адміністрацыйныя арышты тэрмінам на 10 сутак атрымалі 288 чалавек, на 15 сутак — 112 чалавек. 53 непаўналетніх міліцыянты адпусьцілі.

Пракурор не прывёў статыстыкі затрыманых на 3, 4, 5, 7, 8, 9 сутак. Іх лік (няцяжка спраўдзіць па хроніцы затрыманьняў) ідзе на дзясяткі. Так, гэткі тэрмін звычайна прысуджалі дзяўчатам, сем сутак атрымлівалі і многія мужчыны. Не ўвай-шлі ў пракурорскі падлік тыя, хто адседзеў 2—3 сутак і быў потым пакараны штрафам.

Што паказваюць сьпісы прозьвішчаў затрыманых і асуджаных, складзеныя праваабаронцамі? За першыя суткі стаяньня намётавага гарадка было затрымана 108 чалавек — усе імёны вядомыя. За другія — яшчэ каля 100. Колькасьць затрыманых за трэція суткі невядомая, але наўрад ці яна была значна меншай. У ноч штурму з плошчы было вывезена каля 450 чалавек. Паводле розных зьвестак, 25 сакавіка падчас разгону мірнай дэманстрацыі было затрымана ня меней за 50 чалавек. Выходзіць, каля 800 прозьвішчаў.

Суды над затрыманымі праводзіліся сьпешна і ў многіх выпадках непублічна: імёны многіх з асуджаных становяцца вядомымі толькі цяпер. Многія нядаўнія «насельнікі Акрэсьціна» распавядаюць, што зь імі ў камэрах сядзелі людзі, чыіх імёнаў няма ні ў якіх сьпісах пацярпелых. Таму ня дзіўна, калі вядомы лік затрыманых у Менску 19—25 сакавіка можа неўзабаве яшчэ ўзрасьці.

**Аркадзь Шанскі**




**Людзі шукаюць сваіх родных у сьпісах зьняволеных ля Акрэсьціна.**

# Мілінкевіч: «Аблога рэжыму» з трох кірункаў

Мілінкевіч абвясьціў новую тактыку апазыцыі: «аблога рэжыму»

5 красавіка прэс-служба лідэра Аб'яднаных дэмакратычных сілаў распаўсюдзіла тэкст звароту Аляксандра Мілінкевіча да беларускіх грамадзянаў.

У ёй экс-кандыдат у прэзыдэнты называе перамогу Лукашэнкі «піравай», падкрэсьліваючы, што выбары выйграла апазыцыя: «[Мы] выйгралі ў розумах людзей. Прыхільнікі пераменаў аб'ядналіся, пераадолелі страх і гатовыя змагацца… Беларусь ужо іншая. Сьмялейшая, вальнейшая, больш інфармаваная».

Аднак улада зьменіцца толькі ў тым выпадку, калі на вуліцы Менску выйдуць не дзясяткі, а сотні тысячаў, засьцерагае А.Мілінкевіч: «Дыктатура ніколі не аддае ўладу на выбарах, яна прайграе толькі сіле народу». На думку Мілінкевіча, пакуль крытычнай масы няма, тактыкай апазыцыі павінна стаць «аблога рэжыму».

Варта нагадаць, што 25 сакавіка, на Дзень Волі, А.Мілінкевіч заявіў пра ўтварэньне грамадзкага руху за «Свабоду, праўду, справядлівасьць». Наступным этапам дзейнасьці адзіны кандыдат бачыць пераход «да штодзённай асьветніцкай і інфармацыйнай працы дзясяткаў тысячаў валантэраў свабоды». Кароткатэрміновымі задачамі ён называе тры асноўныя кірункі дзейнасьці.

**«Свабодныя выбары»** — стварэньне ўмоваў для правядзеньня свабодных і адкрытых выбараў са зборам подпісаў па зьменах Выбарчага кодэксу, па адкліканьні дэпутатаў палаты прадстаўнікоў і мясцовых саветаў.

**«Свабоднае слова»** — прарыў інфармацыйнай блякады вакол Беларусі. «Будуць створаныя за межамі краіны незалежныя TV і радыё, яны будуць рабіцца беларусамі, гаварыць пра беларусаў і вяшчаць на Беларусь. Мы падтрымаем недзяржаўную прэсу... Мы пашырым зону свабоднае інтэрнэт-прасторы», — сьцьвярджае А.Мілінкевіч.

**«Свабодная адукацыя».** Гэты кірунак прадугледжвае стварэньне народных унівэрсытэтаў сучасных ведаў у Беларусі, магчымасьці навучаньня ў найлепшых унівэрсытэтах Эўропы, паколькі «ў Новай Беларусі... будуць… запатрабаваныя маладыя людзі з сусьветным узроўнем адукацыі, не сапсаваныя ідэалёгіяй, якія пройдуць салідную практыку».

Зьвяртае ўвагу тое, што ў апублікаваным звароце А.Мілінкевіч часьцей зьвяртаецца ад «я», а не ад «мы», чым ён гэта рабіў падчас прэзыдэнцкай кампаніі.

Поўны тэкст звароту друкуецца на сайце А.Мілінкевіча www.milinkevich.org.

**АГ**

## 21 актывіст пад крымінальнымі справамі, 9 новых палітвязьняў

Як паведамляюць праваабаронцы зь незарэгістраванага цэнтру «Вясна», падчас выбарчай кампаніі ў Беларусі крымінальныя справы паводле палітычных матываў узбуджаныя супраць 21 грамадзкага актывіста. Адзін зь іх асуджаны на 5 месяцаў арышту, 8 знаходзяцца ў СІЗА пад вартай да разгляду справы ў судзе. Адміністрацыйным шляхам (арыштамі на суткі, штрафам і г.д.) па ўсёй краіне за сакавік было пакарана 1200 чалавек.

## Увазе студэнтаў, выключаных з ВНУ

Вядзецца збор інфармацыі пра студэнтаў ВНУ, каледжаў, тэхнікумаў, ПТВ, што зазналі перасьлед (былі арыштаваныя, зьбітыя, адлічаныя) падчас прэзыдэнцкай кампаніі і пасьля яе. Калі вы былі выключаныя са сваёй навучальнай установы, то можаце працягнуць навучаньне за мяжой. Т. для даведак: 8-029-612-57-38 (Людміла), e-mail: asipienka@yahoo.com.

Нагадаем, што 30 сакавіка Аляксандар Мілінкевіч і прэм'ер-міністар Польшчы Казімеж Марцінкевіч у прысутнасьці рэктараў шасьці найбуйнейшых польскіх унівэрсытэтаў падпісалі Дэклярацыю аб стварэньні фонду дапамогі рэпрэсаваным беларускім студэнтам імя Кастуся Каліноўскага. Беларусы могуць разьлічваць прыкладна на 300 месцаў у польскіх ВНУ — ім будуць аплачаныя кошты навучаньня і пражываньня ў Польшчы. Ад ліпеня ў польскіх ВНУ пачнуцца курсы польскай мовы для беларускіх студэнтаў. Пачатак заняткаў — 1 кастрычніка.

## Дзень Волі ў Вільні

Сьвята Дня беларускай незалежнасьці ў Вільні адначыла Таварыства беларускай культуры ў Літве. Старшыня ТБК Хведар Нюнька распавёў пра гістарычную дату абвяшчэньня БНР. Быў зачытаны зварот старшыні Рады БНР Івонкі Сурвіллы. Вядомы рыскі мастак Вячка Целеш распавёў пра сьвяткаваньне Дня Волі і справы беларушчыны ў Латвіі. З прывітальнымі словамі выступілі прапагандыст беларускай культуры ў Літве Валдас Банайціс, настаўніца Алена Забельская і мастак Станіслаў Зялёнка.

На жаль, запрошаныя госьці зь Беларусі — Уладзімер Арлоў, Зінаіда Бандарэнка, Віктар Шалкевіч — не змаглі прыехаць з прычыны гарачых падзей у Менску.

Усё ж імпрэза прайшла вельмі пасьпяхова, і людзі ўжо за кубкам кавы і прыемнай сямейнай бяседай доўга яшчэ не хацелі разыходзіцца.

**ХН, Вільня**

## У Познані ў знак салідарнасьці

У Познані ў знак салідарнасьці зь беларусамі, якія ахвярна змагаюцца за вяртаньне дэмакратыі ў Беларусь, вывешана палотнішча зь вялікім надпісам «Свабода для Беларусі». Штандар вісіць на помніку Двох Крыжоў, усталяваным у гонар загіблых палякаў, якія змагаліся за свабодную Польшчу ў часы камунізму. Першы крыж сымбалізуе 74 забітых у 1956 годзе дэманстрантаў. На другім крыжы выбітыя гады наступных паўстаньняў, задушаных уладамі: 1968, 1970, 1976, 1980, 1981. На мачце побач з крыжамі лунае бел-чырвона-белы сьцяг.

Сьцяг і палотнішча былі вывешаныя 16 сакавіка ў Дзень салідарнасьці зь Беларусьсю і вісяць там дагэтуль.

Апрача сымбалічных жэстаў Познань выказвае таксама рэальную дапамогу. На навучаньне ў гэты горад прыедзе група студэнтаў, рэпрэсаваных за грамадзкую актыўнасьць у Беларусі.

**Віталь Воранаў, Познань**

### Асудзілі непаўналетнюю за пратэст каля расейскага пасольства

29 сакавіка суд Цэнтральнага раёну Менску пакараў 16-гадовую моладзевую актывістку **Вераніку Лазоўскую** судовым папярэджаньнем. Дзяўчыну затрымалі 28 сакавіка падчас несанкцыяванай акцыі пратэсту ля расейскай амбасады, а судзілі за затрыманьне 6 сакавіка. Тады затрымалі ейную сяброўку, а калі Вераніка прыйшла ў Цэнтральны РАУС Менску пацікавіцца сяброўчыным лёсам, затрымалі і яе. Паводле словаў дзяўчат, у міліцыі яе ўдарыў маёр Шарагураў, а пры нядглядзе знайшлі афіцыйныя агітацыйныя ўлёткі Мілінкевіча.

### Шчучынскага хлопца ломяць

**Сяргея Ляшкевіча** з Шчучына 29 сакавіка перавялі з спэцпрымальніка райаддзелу міліцыі ў СІЗА гарадзенскай турмы. Хворы на астму Ляшкевіч знаходзіцца пад арыштам з 14 сакавіка. Яму дагэтуль ня выставілі ніякіх абвінавачаньняў, але абвесьцілі падазраваным у «падрыхтоўцы асобаў да ўдзелу ў масавых беспарадках» (арт.293 КК).

### Крымінальная справа маладафронтаўцаў

У справе маладафронтаўцаў працягваюцца допыты: 29 сакавіка супрацоўнікі КДБ дапыталі студэнтаў беларускай філялёгіі Гарадзенскга ўнівэрсытэту **Вольгу Палуйчык** і **Зьмітра Цесьлянка**. Дзяўчына пратаколу допыту не падпісвала.

### Штраф у Жабінкаўскім раёне — за даклад ААН

**Васіля Андрасюка** зь вёскі Старое Сяло Жабінкаўскага раёну 30 сакавіка суд Ленінскага раёну Берасьця пакараў штрафам у 100 тыс-.руб. за «распаўсюд друкаванай прадукцыі, выдадзенай з парушэньнем усталяванага парадку». Яшчэ 17 студзеня Андрасюка затрымалі ў Берасьці падчас распаўсюду брашуры «Рэспубліка Беларусь: Пытаньне аб парушэньні правоў чалавека і асноўных свабодаў у любой частцы сьвету» з дакладам адмысловага дакладчыка Камісіі па правах чалавека ААН Адрыяна Сэвэрына.

### У Салігорску фантасмагорыя

Актывіста салігорскай філіі РГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт» **Леаніда Мархотку** 30 сакавіка выклікалі ў міліцыю, дзе паказалі напісаны на яго пратакол. Згодна з дакумэнтам, 11 лютага Мархотка падарыў дырэктарцы салігорскага гатэлю брашуру «Беларусь: дарога ў будучыню», што ня мела выходных зьвестак, ды «пасьпеў перашкодзіць засяленьню дэлегацыі». Пратакол мае быць перададзены ў суд.

### Камуністка пад судом

Сьветлагорскі суд 30 сакавіка аштрафаваў **Віктара Ахрамчука** й пэнсіянэрку, актывістку ПКБ **Сьвятлану Міхальчанку** на 3 б.в. (93 тыс.) за распаўюд агітацыйных матэрыялаў за А.Мілінкевіча, што й было прызнана парушэньнем закону.

### Штраф Карняенку

Суд Жлобінскага раёну пастанавіў аштрафаваць **Віктара Карняенку**, давераную асобу А.Мілінкевіча, на 5 б.в. (155 тыс.) і зьнішчыць 28 000 буклетаў кандыдата на прэзыдэнта, выдадзеных на сродкі Цэнтравыбаркаму. Машыну палітыка спынілі 6 сакавіка, буклеты былі канфіскаваныя на падставе праверкі іх паходжаньня. Паседжаньне суду адбылося 21 сакавіка без удзелу В.Карняенкі, бо позвы ён не атрымліваў. Пра вырак суду даведаўся толькі з пастановы, якая прыйшла яму поштай 29 сакавіка.

### У стане вайны з грузінамі

Менскі гарадзкі суд 31 сакавіка пакінуў у сіле рашэньне суду ніжэйшай інстанцыі, паводле якога грузінскі журналіст **Георгі Лагідзэ** пакараны на 15 сутак арышту.

### Маркевіча не выпускаюць

Гарадзенскаму журналісту **Міколу Маркевічу** 12 дзён ня ставяць дазвольны штамп на выезд за мяжу, хаця ён заплаціў наперад за 3 гады. У АВІРы казалі, што дазволу не дае КДБ. Журналіст лічыць, што забарона зьвязаная зь ягонай працай на нядаўна аднаўленым у Беластоку радыё «Рацыя».

### Затрымалі ўлёткі ў Баршчэўскіх

Супрацоўнікі ДАІ на Віцебшчыне 31 сакавіка затрымалі аўтамабіль, які перавозіў 25 000 улётак «Народны кантроль», у якіх распавядалася пра нядаўнія падзеі на пляцы ў Менску. На кіроўцу аўтамабіля журналіста **Вадзіма Баршчэўскага** і ягонага сына **Алега** складзеныя пратаколы за распаўсюд друкаванай прадукцыі без выходных зьвестак. За адмову В.Баршчэўскага адказваць, каму прызначаліся ўлёткі, на яго склалі дадатковы пратакол — за непадпарадкаваньне супрацоўнікам міліцыі.

### Затрыманыя на Тыдні Волі

У Менску 26—27 сакавіка былі асуджаныя **Надзея Дулуп**, **Кацярына Жылінская**, **Лізавета Іванова**, **Ганна Мурадава**, **Алена Радына**, **Аксана Сергіенка** (усе 4 сутак), **Юлія Касьпер**, **Арцём Скарабагаты**, **Яўген Шадко** (5 сутак), **Ірына Завадзкая**, **Настасься Каршан**, **Вікторыя Сахарук**, **Вольга Сныткіна**, **Надзея Сычугова** (па 7 сутак), **Яўген Сівановіч** (8 сутак), **Аляксей Адамовіч**, **Дзяніс Арэшка**, **Сяргей Балай**, **Андрэй Барок**, **Зьміцер Белуш**, **Марыя Брыч**, **Братко**, **Максім Буйніцкі**, **Андрэй Бялько**, **Зьміцер Вянско**, **Алег Грубіч**, **Тацяна Грышан**, **Аляксандар Дзішчыц**, **Дзяніс Дзянісаў**, **Дзяніс Завадзкі**, **Натальля Земчанка**, **Яўген Іванюк**, **Віталь Клепча**, **Зьміцер Кулеш**, **Глеб Курцоў**, **Зьміцер Марчук**, **Музычэнка**, **Уладзімер Нікалайчук**, **Аляксандар Пажыган**, **Зьміцер Панкавец**, **Іван Паршын**, **Аляксандар Паўленка**, **Мікіта Паўроз**, **Кірыла Прадко**, **Барыс Пратасаў**, **Уладзіслаў Равуцкі**, каталіцкі ксёндз **Андрэй Сідаровіч**, які быў з народам на плошчы, **Андрэй Скуратовіч**, **Сьцяпан Сьвідзерскі**, **Максім Сяменчык**, **Ян Тамілін**, **Васіль Хадневіч**, **Ігар Хандога**, **Павал Харланчук**, **Алег Чамерка**, **Зьміцер Чапко**, **Зоя Чаропка**, **Уладзімер Шыла**, **Кацярына Янкевіч**, **Зьміцер Яфімаў** (па 10 сутак), **Іван Шаблінскі** (12 сутак), **Юры Аксяневіч**, **Зьміцер Антаневіч**, **Юры Бірукоў**, **Іван Бурыкін**, **Тацяна Дзячак**, **Ціхан Золатаў**, **Максім Казакоў**, **Анатоль Касьцючэнка**, **Аляксей Куваеў**, **Аляксандар Кугушынаў**, **Валянціна Малашыцкая**, **Аляксей Марозаў**, **Павал Мікуловіч**, **Дзяніс Мільбіт**, **Натальля Нарэль**, **Аляксей Новікаў**, **Аляксандар Сенчанка**, **Дзяніс Сінічын**, **Яўген Якіменка**, **Аляксандар Якімовіч** (па 15 сутак). Невядомыя прысуды атрымалі **Мікалай Вайніловіч**, **Зьміцер Галіноўскі**, **А.Дзегцяроў**, **Зьміцер Зьвераў**, **Натальля Казлова**, **Іна Клімутко**, **Андрэй Копел**, **Кужалева**, **Прышнеўскі**, **Рагоўскі** (?), **Гары Рудзянкоў**, **Самаль**, **Андрэй Сантаровіч**, **Січко**, **Н.Стахоўская**, **Мікалай Чыж**.

**Настасьсі Ларынай** сьпярша прысудзілі 7 сутак арышту, а потым замянілі на штраф 20 б.в. (620 тыс. руб.). На 20 б.в. аштрафавалі **Аляксандра Мацюхіна**, на 150 б.в. (4 млн 650 тыс.) — **Антаніну Шыш**. Як непаўналетніх, адпусьцілі **Веру Купчанку**, **Івана** і **Ільлю Шылаў**.

### Затрыманьні каля Акрэсьціна

Каля ізалятару на Акрэсьціна 25 сакавіка затрымалі **Аляксандра Паўленку**, **Тацяну Паўленку**, якія спрабавалі высьветліць лёс свайго, адпаведна, брата й сына **Аляксандра Паўленкі**.

### 16-гадоваму адбілі нырку

Зьбіты АМАПаўцамі ў ноч на 24 сакавіка пры зносе намётавага гарадка 16-гадовы **Андрэй Кузьмінскі** трапіў у бальніцу з гематомай ныркі.

**АШ**

# Парады лекара былым вязьням

**Працяг са старонкі 19.**

## Аслабленьне імунітэту

Знаходжаньне ў замкнёнай прасторы і блізкае суіснаваньне зь некалькімі нават самымі лепшымі людзьмі могуць падарваць сыстэму вашага імунітэту. Калі вы адчуваеце, што пачалі хутка стамляцца, цяжка аднаўляцца, вяртацца да працы, настрой мяняецца раптоўна, валасы выпадаць, пазногці ламаюцца больш, чым раней, — час ужываць полівітамінныя комплексы (лепей зь мінэраламі). Ідэальна, калі выбіраць прэпарат вы будзеце разам зь лекарам. Калі сымптомы ня зьнікнуць, варта правесьці больш дасканалае дасьледаваньне.

## Абвастрэньне хранічных хваробаў

Людзям, што мелі да зьняволеньня хранічныя хваробы (гіпэртанія, хранічны бранхіт, цукровы дыябэт і г.д.), неабходна неадкладна схадзіць да профільнага спэцыяліста на кансультацыю, бо знаходжаньне за кратамі магло істотна пагоршыць ваш стан.

Наагул, жыцьцё ў замкнёнай прасторы бязь сьвежага паветра, сьвятла, без магчымасьці падтрымліваць неабходную гігіену і ў стрэсавай сытуацыі невядомасьці — няпростае выпрабаваньне. Праявіце ўдзячнасьць да свайго арганізму і ўзнагародзьце яго максымальнай колькасьцю станоўчых эмоцыяў, доўгімі шпацырамі на прыродзе, здаровай смачнай ежай і жыцьцярадасным сэксам! Вясна ж усё-такі!

# Штаб Мілінкевіча абяцае пацярпелым ад рэпрэсій дапамогу

Рэдакцыя «НН» атрымала ад штабу А.Мілінкевіча наступны ліст:

«Паважаныя грамадзяне!

У студзені—сакавіку 2006 г. за актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі пакарана ў рознай форме больш за тысячу чалавек. Людзей штрафавалі за распаўсюд агітацыйных матэрыялаў за апазыцыйных кандыдатаў, саджалі на «суткі» за ўдзел у масавых акцыях, выганялі з працы і вучобы за арганізацыю сустрэчаў з кандыдатамі ў прэзыдэнты.

Штаб Аляксандра Мілінкевіча бярэ на сябе абавязак аказаць разнастайную дапамогу пацярпелым ад рэпрэсій у часе выбарчай кампаніі. Усім, хто ў студзені—сакавіку быў рэпрэсаваны, неабходна запоўніць анкету і даслаць на адзін з указаных адрасоў».

## Анкета

1. Прозьвішча, імя, імя па бацьку.______________________________

______________________________________________________________

2. Дата нараджэньня.______________________________

3. Паштовы адрас.______________________________

______________________________________________________________

4. Тэлефон, факс, электронны адрас.______________________________

______________________________________________________________

**5. Форма рэпрэсіі** (штраф, арышт, звальненьне з працы ці вучобы, крымінальная справа ці інш.).

**6. За што фактычна рэпрэсаваны** (збор подпісаў, вылучэньне ў склад камісіі, распаўсюд агітацыйных матэрыялаў, удзел у пікетах, сходах і мітынгах, удзел у назіраньні ці інш.).

**7. Афіцыйная фармулёўка праваparушэньня** (хуліганства, удзел у несанкцыяваным мітынгу, прагул ці інш.).

8. Спэцыяльнасьць.______________________________

9. Якой замежнай мовай валодаеце.______________________________

Штаб Аляксандра Мілінкевіча гарантуе, што ўсе, хто страціў працу ці вучобу за ўдзел у палітычнай дзейнасьці, будуць уладкаваныя на адпаведную працу ці вучобу ў Беларусі ці за яе межамі.

У той жа час штаб папярэджвае, што не займаецца пытаньнямі эміграцыі і атрыманьня статусу палітычнага ўцекача.

Інфармацыю прапануецца дасылаць альбо прыносіць на наступныя адрасы:milinkevich@gmail.com.

**Аб'яднаная грамадзянская партыя:** г.Менск, вул.В.Харужай, 22—1701, т.: 289–50–09, e-mail: ucpb@ucpb.org.
**Партыя БНФ:** г.Менск, пр. Машэрава, 8, т.: 284–50–12, 288–10–08, e-mail: upravabnf@tut.by.
**Партыя камуністаў Беларуская:** г.Менск, зав.Калініна, 12—311, т.: 281–68–13, e-mail: ck_pkb@mail.ru.
**Менскі гарадзкі штаб:** т.: 8–029–652–00–10, e-mail: vpalevikova@tut.by.
**Берасьцейскі абласны штаб:** т.: 8–029–651–29–59, e-mail: hubarevich@tut.by.
**Віцебскі абласны штаб:** т.: 8–029–651–32–53, e-mail: info@sapega.org.
**Гомельскі абласны штаб:** т.: 8–029–654–86–56, e-mail: vladimir56@tut.by.
**Гарадзенскі абласны штаб:** т.: 8–029–639–93–37, e-mail: a.veras@mail.ru.
**Менскі абласны штаб:** т.: 8–029–624–99–31, e-mail: p.petrov@list.ru.
**Магілёўскі абласны штаб:** т.: 8–029–651–77–76, e-mail: ucpb@list.ru.

**Штаб Аляксандра Мілінкевіча**

# Безбацькоўшчына

На наступны дзень пасьля зьяўленьня на тэлеэкранах Лукашэнкі зь ягоным загадам прыбраць свае партрэты бабулькі ў аўтобусе абмяркоўвалі апошнія навіны. Быццам адна дакладна ведае, што Бацьку нейкая чараўніца-апазыцыянэрка ўракла па партрэце. Цяпер прэзыдэнт хварэе, таму і загадаў прыбраць свае выявы.

Зьнікненьне Лукашэнкі з этэру далося ў знакі супрацоўнікам тэлебачаньня. Тыя апынуліся ў становішчы сіротак. Пра заяву «Газпрому» аб падвышэньні коштаў на газ нашыя каналы змаўчалі, толькі малацілі пра сяброўства і адзінства абодвух народаў. Іх можна зразумець: пакуль Лукашэнка не пракамэнтаваў дзеяньні расейскай кампаніі, самі нічога яны зрабіць ня могуць. Раптам ляпнуць ня тое… Таму нават тыднёвыя агляды пачыналіся з грузінскага турэмнага бунту. Другасныя для беларусаў падзеі выстаўляюцца на першы плян. З нашых навінаў апошнім часам зацікавіць можа толькі прагноз надвор'я.

Зрэшты, бальшыня адразу і не заўважыла зьнікненьня прэзыдэнта. Беларускія тэленавіны глядзяць толькі тады, калі няма чаго глядзець ці калі па ўсіх каналах паказваюць *аднаго*. А так наш люд па старынцы карыстаецца расейскімі крыніцамі інфармацыі.

З-за таго, што не чуваць і ня бачна зь дзяржаўных СМІ нічога патрэбнага, сярод людзей распаўсюджваюцца чуткі, якія плятуцца ды павялічваюцца ў памерах.

Цяпер чаго толькі не пачуеш у гарадзкіх аўтобусах, едучы на працу. Стары дзед паціху жаліцца свайму раўналетку: «Расейцы пра падаражаньне газу гавораць, а нашыя ўсё пра сьвяткаваньне ўгодкаў саюзнай дзяржавы. Хаця б слова сказалі, як жыць і колькі плаціць будзем у наступным годзе. Якое к чорту аб'яднаньне…»

**Руслан Равяка, Баранавічы**



ЗЬМІЦЕР Х. СЛОНІМ

# Нічога не зьмянілася

БТ паказала кадры, як у адной палаце ляжаць СОБРаўцы — «ахвяры разьятранага натоўпу». Чамусьці ўсе — хто з траўмаю галавы, хто з паламанаю (?) нагою, хто з носам (і шкло шлема не дапамагло?), і з шыяй — у адным аддзяленьні. Але тварам (пабітым) пацярпелых праваахоўнікаў стаў шараговец Лосеў. Яго фота ўпрыгожвае гнеўны артыкул на першай паласе «СБ» (28 сакавіка). Калі верыць артыкулу, азьвярэлыя малойчыкі цалялі яму ў сэрца, але на шчасьце патрапілі пад вока.

У 1999 г. я быў сьведкам, як пажылыя людзі на навагрудзкім аўтавакзале, чакаючы аўтобус, ганілі ўдзельнікаў Маршу свабоды. Маўляў, закідалі няшчасную міліцыю камянямі. «Дажа па цілівізары паказвалі — ляжаць бедненькія ў палатах, усе ў бінтах…»

Тут у размову ўмяшалася жанчына, што сядзела побач: «Працую я ў тым шпіталі». Яна распавяла, як у іхняе аддзяленьне прыйшлі здаравенныя амапаўцы, палеглі па койках у берцах і форме пад коўдры. Калі прыйшлі «кіношнікі», амапаўцы зрабілі пакутніцкія твары і пачалі стагнаць. Потым, калі «сюжэт» зьнялі, у палату прыйшло начальства з пакункамі мандарынаў і загадала падымацца. Ндаўнія хворыя падняліся і пайшлі ахоўваць палаты, дзе ляжалі пацярпелыя ўдзельнікі таго ж Маршу.

Нічога новага прапаганда ня выдумала за гэты час.

**Віталь Рыманенка, Карэлічы**

# Словы спачуваньня

Мы ведалі, што ў Генэрала надзейны тыл. Ведалі, што ў Генэрала добрая сям'я. Шырэйшая публіка з успамінаў «Генэральская зорка» і з кнігі Мечыслава Грыба «Беларускі мост», што выйшла нядаўна ў сьвет, магла даведацца, што ягоную жонку завуць Любоў Іванаўна. Магла даведацца і пра абставіны знаёмства маладога пажарнага інспэктара зь Любоўю Іванаўнай, пра яе вучобу і месца працы.

Так было, што мы ня надта цікавіліся сямейнымі справамі Генэрала, дый ён ніколі не гаварыў пра іх з намі. Захоўваўся прынцып неўмяшаньня ў прыватнае жыцьцё? Можа, і так. А можа, і іншае: калі ў чалавека ўсё нармальна, дык пра што можна гаварыць? Калі ж прыйшла вестка, што Любоў Іванаўна захварэла, што яе паклалі ў шпіталь, мы зразумелі, што здарылася нешта надзвычайнае. А потым адна за адной прыйшлі горшыя весткі...

Ведаю, што з прычыны непапраўнага гора Мечыславу Грыбу выказалі свае спачуваньні не адзін дзясятак людзей. «Простых» і знакамітых. Таварышаў па партыі і беспартыйных. І гэты нэкралёг, пэўна, народзіць пачуцьцё спагады ў шматлікіх чытачоў «Нашае Нівы».

Перамагчы сьмерць, адвесьці рукою гора мы ня можам. Мы можам быць людзьмі і ў горкую для чалавека часіну выявіць людзкую салідарнасьць.

**Анатоль Сідарэвіч**

# Даруйце, што я ня з вамі

Пятыя суткі сяджу ў Інтэрнэце. Штотрыхвіліны аднаўляю старонкі «Свабоды», «Нашай Нівы», БелаПАНу і нават нялюбай «Хартыі». І так, я ўпэўнены, робяць многія з тых, хто ў гэтыя дні апынуўся за межамі Беларусі.

Пачуваюся нямоглым. Ад таго, што ня з тымі хлопцамі і дзяўчатамі, што стаяць на плошчы. Ад таго, што не магу да 31 сакавіка прыляцець у Менск. Ад таго, што зусім нічога — на такой адлегласьці — зрабіць не магу.

Штодня размаўляю з кіеўскімі таксоўшчыкамі. Большасьць не падабае ўласную ўладу, нават «памаранчавую». Але тым, хто стаіць у Менску на Кастрычніцкай плошчы, спачуваюць усе. Яны зычаць беларусам свабоды.

19 сакавіка было расчараваньне: людзі пайшлі спаць. Так, у сьне, рэвалюцыі ня робяцца. Ужо 20 была радасьць: сьпяць ня ўсе.

Чытаю кожны радок Хадановічавых вершаў. Слушна кажа Хадановіч: выглядае на тое, што на Кастрычніцкай плошчы беларускае мэтро больш ня будзе спыняцца. Праехалі мы нэакамунізм. І Калякін як ачольнік штабу Мілінкевіча — найлепшае таму сьведчаньне.

Хлопцы і дзяўчаты! Не крыўдуйце на старых, што паліваюць вас лаянкай! Яны за пайку душу прадалі, як прадалі памяць пра Машэрава. Няшчасныя яны!

І даруйце нам — тым, хто ў гэтую хвіліну ня з вамі. З розных прычынаў. Але я згодны з тым, што аніводная зь іх ня можа быць уважлівай.

І перадайце Андрэю Дыньку. Калі такога інтэлігентнага чалавека вінавацяць у тым, што ён прылюдна мацюкаўся, дык гэта значыць, што неўзабаве беларуская міліцыя пачне цытаваць Бадлера ў перакладзе Хадановіча.

З павагай і пачуцьцём вінаватасьці

**Аляксандар Фядута**




**Карыкатура зь нямецкай газэты «Dienstag».**

# 58-мы артыкул па-беларуску

Мы пілі каву зь сябрамі ў бары ў Баранавічах. Нехта распавядаў пра свае двое сутак, што ўкацілі за «хуліганскія дзеяньні» напярэдадні Дня Волі. У гэты момант у залю зайшлі некалькі маладых хлапцоў у скуранках ды дублёнках. Дзяўчаты, што пілі гарбату побач, узьняліся ды пайшлі да выхаду. Праходзячы каля нас, прашапталі: «Гэта апэра».

Яны чулі, што мы размаўляем па-беларуску і гаворым пра затрыманьні. У той самы дзень нейкая кабета на вуліцы папярэдзіла мяне, каб не размаўляў на вуліцы па-беларуску па мабільніку — яе знаёмага за гэта затрымалі міліцыянты. Беларуская салідарнасьць перад брутальнымі дзеяньнямі ўлады…

За некалькі тыдняў большасьць беларускіх патрыётаў усёй краіны сталі дробнымі хуліганамі. Як некалі за Сталіным, калі ўсе праходзілі па 58-м артыкуле, так цяпер сярод судзьдзяў папулярным робіцца дробнае хуліганства (арт. 156). «Гучна лаяўся на вуліцы, на неаднаразовыя заўвагі міліцыянтаў не рэагаваў» — абвінавачваюць лепшых зь лепшых. Чацьвёра сутак уляпілі аднаму з найлепшых выкладчыкаў гісторыі ў горадзе Віктару Сырыцы. Яго, дарэчы, вельмі добра ўспрынялі сядзельцы.

Але і з салідарнасьцю ня ўсё так прыгожа. У той самы дзень, пасьля кавы, скончыўся «абедзенны перапынак» у сутачнікаў, і мы панесьлі перадачу сп.Сырыцы. Потым зайшлі ў іншую ўстанову папіць піва. Наведнікаў не было, мы гутарылі, пацягваючы бурштынавы напой. Пачуўшы нашую гутарку, афіцыянтка на наступную замову адказала, што піва скончылася — з-за беларускай мовы мы сталіся непажаданымі гасьцямі. Але ў той бар мы больш ні нагой.

Колькасьць зводак міліцыі па барацьбе з хуліганствам за сакавік будзе вельмі высокай, менавіта дзякуючы затрыманьню «дробных парушальнікаў парадку». Таму ў красавіку міліцыянтам давядзецца добра папрацаваць, каб прытрымлівацца дасягнутых посьпехаў. Хіба зноў «выручаць» апазыцыянэры.

**Руслан Равяка,**
**Баранавічы**

## Выхаваньне Плошчай

Дзякуй вам, шаноўная рэдакцыя, за тую ўвагу, якую вы надаяце апошнім падзеям. Усё так. Калі раніцай, пасьля першай ночы, я на прыступках Дому прафсаюзаў глядзеў на натоўп на плошчы — на мае вочы наварочваліся сьлёзы. За тую ноч я пабачыў столькі сапраўдных людзей, колькі, мабыць, за ўсё астатняе жыццё не пабачу. Калі чалавек прайшоў праз гэту Плошчу, то ён зможа прайсьці з годнасьцю праз любыя жыцьцёвыя нягоды.

І я ведаю, што калі потым хто-небудзь зь іх папросіць у мяне помачы, ён яе атрымае.

Дзякуй ім усім.

**Віктар Яўмененка, Менск**

## Бязь іх

Магу падпісацца пад кожным словам у артыкуле «Бяз вас» («НН», №12). Ня ведаю: Абрахман Узьбекаў — гэта псэўданім ці сапраўднае імя, але хачу сказаць гэтаму чалавеку шчыры дзякуй. Можаце далучыць мой голас да словаў гэтага чалавека.

Сапраўды, ніхто на іх не крыўдуе, што яны зьехалі, але ведайце — для нас, тутэйшых нацыяналістаў, яны памерлі ў палітычным пляне.

І мне слова Руслана Равякі нашмат цікавейшае, чым усе разам узятыя прамовы Пазьняка, Сурвіллы ці Адамовіча.

**Віктар Яўмененка, Менск**

## Дзень Волі ў Амстэрдаме

У самым цэнтры галяндзкай сталіцы, на Museumplein, 25 сакавіка адбылася акцыя падтрымкі дэмакратыі ў Беларусі. Яна была зладжаная галяндцамі, аднак сярод прысутных было і некалькі беларусаў. Моладзь усталявала вялізную расьцяжку *Denim revolution*, на пляцы разьмясьціліся некалькі намётаў, паўсюль луналі старыя джынсы. На мітынгу выступілі некалькі чальцоў Эўрапарлямэнту, прадстаўнікі арганізацыі *Amnesty International*. На мітынгу таксама зачытваліся SMS, якія дасылалі людзі, якія былі на той час у цэнтры Менску.

**Прысутны**

## Акцыя ў Парыжы

Каля сотні грамадзян Францыі, Беларусі і Ўкраіны, студэнтаў, інтэлектуалаў і праваабаронцаў, сабраліся 25 сакавіка на плошчы ля Цэнтру Пампіду. Гэтым самым яны выказалі пратэст супраць фальсыфікацый на выбарах ды арыштаў удзельнікаў акцыі пратэсту ў Менску. Удзельнікі мітынгу заявілі: «Тут, у Францыі, мы вітаем адвагу ўсіх тых, хто зазнаў перасьлед, хто быў зьбіты, паранены ці затрыманы перад і пасьля выбараў, которыя нельга прызнаць свабоднымі. Мы выказваем гэтым людзём сваю падтрымку, а таксама іх родным і блізкім, з каторымі мы падзяляем трывогу і боль». Падчас мітынгу было сабрана больш за сотню подпісаў пад пэтыцыяй да беларускага кіраўніцтва, дзе асуджаецца гвалт у дачыненьні да беларускіх грамадзянаў.

**Прысутны**

## Чаму маўчыць Філарэт?

Не разумею людзей, якія зьдзіўляюцца маўчаньню Філарэта. Яны забываюцца, што маскоўская царква заўсёды была другой галавой імпэрскага арла, што дасюль зазіраецца на суверэнную Беларусь. Маскоўская царква заўсёды была ворагам усяго беларускага, таму і надалей будзе падтрымліваць прамаскоўскую дыктатуру. Успомніце, хто падтрымліваў вызвольныя паўстаньні на Беларусі? Беларускія ксяндзы, уніяцкія і праваслаўныя сьвятары, а не маскоўская царква.

Сёньня маскоўская царква падтрымліваецца на дзяржаўным узроўні і маральна, і фінансава. Дык чаму ж Філарэту не прымаць зорку ад Лукашэнкі?

**Юрась Навіцкі, Менск**

## Паклёп, данос і сувязь з замежжам

**Нядаўна мне давялося вырабляць дакумэнты для ўладкаваньня на працу ў адну ўстанову. Блянкаў было колькі штук, праблемы — дзьве. «Ці падтрымлівае сам (сама) ці блізкія сваякі (бацька, маці, браты, сёстры і дзеці да 16 гадоў, а таксама муж (жонка) неслужбовыя сувязі з асобамі, што пастаянна пражываюць за мяжой; ці быў за мяжой, калі, дзе і зь якой мэтай».**

Адзіны блянк, надрукаваны па-беларуску, строга засьцераглі запаўняць на гэтай мове. Далей у адмысловым блянку прапаноўвалася напісаць «в произвольной форме» аўтабіяграфію «з асьвятленьнем наступных пытаньняў».

Пытаньні 6 і 7 (6. Ці падтрымлівае сам (сама) ці блізкія сваякі (бацька, маці, браты, сёстры і дзеці да 16 гадоў, а таксама муж (жонка) неслужбовыя сувязі з асобамі, што пастаянна пражываюць за мяжой; 7. Ці быў за мяжой, калі, дзе і зь якой мэтай) паставілі мяне перад выбарам: адразу сысьці з гэтай вар'ятні ці напісаць нешта адэкватнае. Фактычна прапануецца «стукаць» на найбліжэйшых родзічаў і апісваць прыватныя бакі свайго жыцьця, якія ня маюць дачыненьня да прафэсійнай дзейнасьці? Я напісаў, што кожны адказвае сам за сябе, і прычым тут мае родзічы. Я напісаў, дзе пахаваны бацька (п.4), хоць як можа ўплываць на маю працу не задавальняючае кагосьці месца ягонага пахаваньня? На пытаньне 7 напісаў, што ўжо 15 гадоў як езьдзім вольна і што на днях быў у Цярэспалі (першая станцыя на тэрыторыі Польшчы). «Зь якой мэтай?» — турыст. Мог бы яшчэ дадаць: як чвэрць жыхароў трохсоттысячнага Берасьця на працягу году з рознымі мэтамі езьдзяць, іншыя па два разы на дзень. Дый напісаць, што яшчэ ў Расею езьдзіў гадоў дзесяць таму.

«Ответственные товарищи» выкіпелі цераз край. «Не патрэбны нам такі работнік, раз ён так піша», — сказаў самы адказны.

Канстытуцыя краіны фармулюе гэтую сытуацыю так: «Ніхто не павінен быць змушаны да паказаньняў і тлумачэньняў супраць самога сябе, сваіх сямейнікаў і блізкіх родзічаў» (арт.27). Нават крымінальнае заканадаўства пакідае за сьведкам права ня сьведчыць супраць самога сябе, сваіх сямейнікаў і блізкіх родзічаў (арт.60 п.31 КПК РБ). Дык чаму амаль форс-мажорная норма заканадаўства ГЭТАЙ улады перасягаецца патрабаваньнямі зусім шараговага фармуляру аб найме на працу гэтай сама ўлады? Можа, у нас пад прыкрыцьцём гэтых дакумэнтаў уводзіцца явачным парадкам надзвычайнае становішча, нягледзячы на мантры пра стабільнасьць і што вайны няма?

Яшчэ больш шарму дадае тое, што ішлося пра пасаду наймізэрную дый заробак мікраскапічны. Сапраўдны тэатар абсурду.

Ці будзе пасьля такога досьведу паклёпам на дзяржаву сказаць, што такой сыстэме патрэбныя амаральныя асобы, здольныя даносіць нават на найбліжэйшых родзічаў (п.6), канцылярыя прыдуркі без асабістага жыцьця (п.п.4 і 7)? Што, ім не патрэбныя прафэсіяналы (бо сумяшчэньне амаральнасьці і добрых прафэсійных якасьцяў — гэта даволі рэдкая камбінацыя)?

Калі гаварыць пра сябе асабіста, то ў мяне ёсьць дзьве грунтоўныя падставы, каб абавязкова наладзіць кантакт з замежнікам не з Усходу. Па-першае, мне цікава, чаму яны жывуць заможна і спакойна. Па-другое, у мяне прафэсія такая, якая ёсьць.

І вось гэты замежнік можа спытаць у мяне: чаму ў гэтай краіне, якая называецца Беларусь, нават філёлягі ня ведаюць зусім альбо ня ведаюць як сьлед беларускай мовы, на якой гавораць дома 37% і якую называюць роднай блізу 80% насельніцтва? Чаму тэлебачаньне пры такой статыстыцы амаль спрэс гаворыць на іншай мове? Чаму беспрацоўны, атрымліваючы сацыялку, на якую фізычна выжыць нельга, мусіць аплачваць шматразовы цягам месяца праезд у Цэнтар занятасьці ды назад? Дзе ён возьме грошы?

Ці змогуць адказаць улады на гэтыя і яшчэ шмат якія іншыя пытаньні злавеснага замежніка, пра «пастаянную неслужбовую сувязь» зь якім мы абавязаны паведамляць *ім*?

Але хутчэй за ўсё, па сутнасьці не адкажуць. Ёсьць у іх улюбёны манэўр зводзіць усе адказы да банальнага пакету зь дзьвюх узаемазьвязаных опцыяў: а нам усё роўна ніхто нічога ня зробіць; у нас спакой і стабільнасьць.

**Яўген Бяласін, Берасьце**

* * *

Вялікі дзякуй за крыжаванку, надрукаваную ў «Газэтцы дзеткам» у №13. Маім дзеткам вельмі спадабалася.

**Улад, Менск**

**Ад Рэдакцыі.** Мы забылі пазначыць аўтарства крыжаванкі. А склала яе Вольга Малая.

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

### Шыдлоўскі: памылковая інфармацыя

Дзякуй Богу, інфармацыя аб тым, што Кастусю Шыдлоўскаму падкінулі наркотыкі, якая хадзіла за кратамі на Акрэсьціна, аказалася памылковаю. Нічога падобнага не адбылося.



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Сьвітаньне па тэлевізары

Дзіўная рэч: дзесяць дзён сядзіш бязвылазна ў інтэрнацкім пакоі пад вартай двух, а часам і трох міліцыянтаў (любы выхад на вуліцу — пад канвоем), вакол — занядбаная беларуская вёска, аточаная лесам, укрытая сьнягамі, і ў цэнтры гэтага адасобленага дрымучага сусьвету — маленькі чорна-белы тэлевізар, які ловіць БТ, АНТ і расейскае ОРТ і па якім вось ужо каторы дзень паказваюць маніфэстацыі пад бел-чырвона-белымі сьцягамі... Не пакідае ўражаньне: сярод холаду, цемры й прымусу ў гэтым цяпельцы нараджаецца нешта новае. Сьветлае-сьветлае. Цудоўнае.

Кожная раніца пачынаецца зь першым выпускам навінаў, яшчэ зацемна. Сьвітаньне прыходзіць разам зь *бела-чорна-белымі* азарэньнямі на экране. Камэнтар ня мае значэньня — кадры ясныя як дзень. Здаецца, краіна, што даўно заглыбілася ў змрок забыцьця, у цяжкі сон і нават пачала пахропваць, нечакана ачомалася.

Моліcься за тых, хто на плошчы, на сутках, пад крыміналкамі, за выключаных з унівэрсытэтаў і выкліканых у ваенкаматы, за зьбітых у лякарнях, за тых, хто на волі й рыхтуецца выйсьці зноў — і раптам удыхаеш на поўныя грудзі: упершыню за апошнія гады пахне сапраўднай вясной.

Тое, што мне давялося назіраць па тэлевізары за некалькі дзён гарачага сакавіка-2006, нагадала бачанае роўна дзесяць гадоў таму ўжывую: менскую вясну-96. Маніфэстацыі вясны-2006 неспадзявана аказаліся куды больш шматлюднымі, больш арганізаванымі, больш рашучымі за Кастрычніцкую плошчу 2001-га й пратэсты пасьля рэфэрэндуму 2004-га. Насуперак дзясяткам крымінальных справаў, сотням арыштаў, тысячам затрыманьняў, вынішчэньню незалежнай прэсы й папраўкам у кодэксы, беларускія вуліцы 19—25 сакавіка грымотнымі воклічамі канстатавалі гістарычны факт: «Жыве Беларусь!»

Такое й шумавымі гранатамі не заглушыш — рэха даходзіць аж да Малога Сітна.

«Магутны Божа» як пачатак кожнага дня для намётавага мястэчка; малітва на шматтысячнай плошчы; тысячы вернікаў розных канфэсіяў поплеч з заўсёднікамі вулічных акцыяў. Адзіны кандыдат — беларускі патрыёт, які ў дзень галасаваньня моліцца і ў праваслаўным храме, і ў касьцёле, які зьяўляецца на людзях з жонкай і якога прымаюць канцлер Нямеччыны, міністар замежных справаў Францыі, прэзыдэнты Польшчы й Літвы. Агучаная для мільёнаў праграма рэформаў, грунтаваная на прыватнай уласнасьці, інавацыях і мясцовым самакіраваньні. Пасьля ўсяго гэтага, упершыню за колькі часу, адчуваеш пад нагамі *краіну*!

І ў кампаніі, і пасьля яе муляла вока: рэжым высільваецца, каб абаперціся на гэты ж самы, добра зацьвярдзелы за 15 гадоў, падмурак незалежнасьці. Але бясконцыя заклікі «За Беларусь!», пустаслоўе пра «государственный суверенитет в союзе с Россией» і «интернациональную белорусскую нацию» сьведчаць: пераадолець мяжу, якая аддзяляе

# Акадэмік Гарэцкі Севярынцу, Сіўчыку: Гумар выратуе Беларусь

Акадэмік Радзім Гарэцкі напярэдадні Дня геоляга зьвярнуўся да сваіх калегаў–геолягаў Вячаслава Сіўчыка і Паўла Севярынца, якія сустракалі прафэсійнае сьвята ў зьняволеньні.

Дарагія Слава і Павал, віншую вас з нашым прафэсійным сьвятам — Днём геоляга! На жаль, так ужо выходзіць у нашым «стабільным» жыцьці, што віншаваньні я не магу перадаць вам непасрэдна, бо амаль склалася традыцыя, паводле якой вы ў гэтыя дні затрыманыя і сядзіце ў турме ці адбываеце «хімію».

Наша сьвята геолягаў прыпадае на вясну, калі мы пачынаем адчуваць, што хутка будзе вандраваньне (геалягічнае поле) і мы зможам спаткацца з прыродай, вырвацца зь цеснага душнага гораду на шырокі прастор, успрыняць свабодны ўзьлёт і пазнаць новыя існыя іс... пра будову і разьвіцьцё Зямлі, а гэта дасьць магчымасьць адкрыць і адшукаць розныя карысныя выкапні, так неабходныя для існаваньня і разьвіцьця чалавецтва. Як сапраўдныя вандроўнікі, мы ў гэтыя дні адчуваем, што «душу тамада даль заве». Я думаю, што Дзень геоляга заканамерна амаль супаў зь Вясной, са сьвятам 25 Сакавіка і з Днём гумару. Вясна — адзін з самых цудоўных часоў году, калі сьветлыя, радасныя прамяні сонейка пачынаюць так прыемна саграваць цела і душу пасьля зімніх халадоў, ажывае прырода, сэрца пачынае біцца больш моцна, пачуцьцё любові і дабра ахоплівае ўсё больш людзей, хочацца жыць далей і жыць лепей... Вясна адкрывае браму да лета, да цяпла, да жыцьця. Як нядаўна, у самыя халодныя дні марознай зімы гэтага году, калі настрой і ўспрыманьні былі таксама марознымі, наш славуты паэт Ніл Гілевіч сказаў мне: «Дажывём да Вясны...» Нездарма вялікае сьвята беларусаў 25 Сакавіка прыпадае на Вясну і

*самобытную Беларусь* ад адроджанай Беларусі, Лукашэнка ня можа. І, згодна зь непазьбежнай лёгікай гісторыі, гэта зробіць ужо іншы. Не аддадзеная ані Крамлю, ані алігархам маёмасьць, пераключаныя тэлеканалы, апрацаваная па пэрымэтры ўсіх дзяржаўных межаў масавая сьвядомасьць — усё чакае, каб стаць апірышчам сапраўднае Беларусі. І галоўная задача беларускага руху пасьля вясны-2006 — дабрацца да кожнага зь дзесяці мільёнаў беларускіх сэрцаў, каб на грубых і шэрых камянях апошніх дванаццаці гадоў збудаваць нацыянальны дом, напоўніць яго нацыянальнай сьвядомасьцю і нарэшце ўзьняць па-над ім нацыянальны бел-чырвона-белы сьцяг.

Калі 24 гадзіны ў суткі сядзіш у чатырох сьценах зь міліцыянтамі (а яны жартуюць — «гэта ня вас пад варту ўзялі, а нам суткі далі»), бясконца спрачаесься, даводзіш, выкладаеш — пачынаеш разумець, што і тыя ж хлопцы ў форме — ужо не саўковыя жаўнерыкі імпэрыі. Так, яны абараняюць Лукашэнку, бо «трэба парадак», яны супраць Захаду, бо «Штаты хочуць усім кіраваць», а «з Эўропы сюды ідзе бардак, нарката й вычварэньні» — але раз-пораз спрабуюць размаўляць з табою па-беларуску, не супярэчаць, што Пётар І і Сувораў у гісторыі Беларусі — героі адмоўныя, з задавальненьнем слухаюць «Песьні Свабоды» ды згаджаюцца, што трэба адраджаць традыцыі полацкага праваслаўя, а не капіяваць заснаваную на 300 гадоў пазьней Маскву.

У сакавіку 2006-га Беларусь усё-такі адштурхнулася ад дна. Калі пасьля 2001 г. становішча няўхільна пагаршалася, рэпрэсіі былі ўсё больш балючымі, а дэпрэсіі ўсё больш глыбокімі — пачынаючы зь вясны 2006-га сьціснутая спружына нацыянальнага руху пачала імкліва выпроствацца. І відавочным доказам гэтаму стала проста д’ябальская гістэрыя рэжыму, бачная кожнаму, у чыёй хаце ідуць БТ і АНТ. Апшалелае галёканьне, сьвіст, ванітоўная хлусьня й рагаты рогат тэлевядучых, «сілавікоў» ды задураных абываталяў, прыпадкі палітычнае эпілепсіі з кожным кадрам, дзе палымнее бел-чырвона-белае, раптоўна агалілі панічны страх апошняе дыктатуры Эўропы перад крыжам на плошчы, перад сьцягам Хрыста, перад нечаканым нацыянальным абуджэньнем. Кругласуткавая вахта нават некалькіх соцень чалавек зь бел-чырвона-белымі сьцягамі ў самым цэнтры сталіцы выклікала эфэкт асінавага кала, з размаху загнанага ў сэрца нячыстага.

Магчыма, сакавіку-2006 не хапіла духу, руху, зуху, каб перамяніць Беларусь адным рыўком. Але пераможны прарыў — праз ператрусы й арышты, праз крывыя люстэркі тэлеэкранаў, праз здушаныя страхам душы — ужо зроблены. Дзясяткі сіцэнцаў, што галасавалі за Мілінкевіча, заўважалі вусьціш мясцовага начальства й жах сталічнага афіцыёзу, назіралі за камічным міліцэйскім канваяваньнем да прыбіральні небясьпечнага «хіміка» й бачылі бел-чырвона-белыя ўспышкі на паўсьвету, ужо прачулі сваю еднасьць зь дзясяткамі тысячаў менчукоў. Адчулі сябе нацыяй!

Сьвітанак, які мужная моладзь на Кастрычніцкай плошчы штодня сустракала сьпевам «Магутны Божа», зрабіўся сыгналам для ўсёй краіны. Званком будзільніка. Пара ўставаць! Ад самага пачатку дарог у Беларусі рушыла Нацыянальнае Абуджэньне.

*в.Малое Сітна*

> У сакавіку 2006-га Беларусь адштурхнулася ад дна.

сымбалізуе Волю, Дзяржаўнасьць, Незалежнасьць, Дэмакратыю, Нацыянальнае адраджэньне Беларусі, калі кожнаму грамадзяніну нашай краіны хочацца сказаць усьлед за Янкам Купалам салодкія словы свабоды: «Жыве Беларусь!» Праўда, я зусім не разумею, чаму за гэтыя цудоўныя словы цяпер у нас можна трапіць за краты, што і здараецца ўжо ня першы раз і з вамі, маімі дарагімі. Лёгіка ўладаў згубілася: за блізкія па сутнасьці словы «За Беларусь!», якія таксама ўпершыню прапанавалі і якімі карысталіся змагары за беларушчыну, можна атрымаць ня краты, а наадварот, падтрымку і ўзнагароду.

Сьмех і гумар — здаровыя пачуцьці добрых і аптымістычных людзей, да якіх, безумоўна, належыць большасьць геолягаў. Трэба з прыемнасьцю адзначыць, што гэтыя пачуцьці ўласьцівы беларускаму народу. Які б цяжкі, горкі, безвыходны стан ні быў бы ў беларуса, ён заўсёды знойдзе нешта гумарыстычнае і па-добраму пасьмяецца і з гэтага стану, і з суседа, і зь сябе. Наш славуты выхадзец зь Беларусі, вялікі расейскі пісьменьнік Фёдар Дастаеўскі казаў: «Хараство выратуе сьвет», а другі выдатны беларус, акадэмік Валянцін Купцюх лічыў, што «сьвет выратуе навука». Мы можам сказаць, што Беларусь выратуе ня толькі прыгажосьць і навука, але



гумар і аптымізм. Трэба яшчэ дадаць, што Беларусь стане па-сапраўднаму вольнай, дэмакратычнай эўрапейскай дзяржавай дзякуючы нацыянальна сьвядомаму маладому пакаленьню, да яго належыце і вы, таму мне асабліва прыемна ў гэтыя дні павіншаваць вас і пажадаць здароўя, непахіснага духу, мужнасьці, веры ў адроджаную Беларусь, посьпехаў ва ўсіх вашых справах. Жыве Беларусь!

# Паказуха і рэальнасьць сяла

«Вечерний Брест»: Чаму работнікі СПК «Агарэвічы» адмаўляюцца засяляцца ў прэзыдэнцкія дамкі.

Паляпшэньне жыльлёвых умоваў не заўжды на радасьць. Два тыдні таму ў Адміністрацыю прэзыдэнта прыйшоў ліст ад жыхароў вёскі Агарэвічы, работнікаў аднайменнага СПК, што месьціцца за 6 км ад Ганцавічаў. Зь ім — відэаматэрыялы, што пацьвярджаюць: жыць у атрыманых імі прэзыдэнцкіх дамкох немагчыма...

## Ня бачна весялосьці

Вуліцу Моладзевую, дзе збудавана 15 дамоў, можна падзяліць на тры ўмоўныя групы. Першыя пяць узьніклі, як толькі прэзыдэнт кінуў кліч пра будаўніцтва на вёсцы; гэта салідныя і ўпарадкаваныя маёнткі. Іншыя пяць (№№ 11, 13, 15, 17, 19) — таксама прэзыдэнцкія, але тут ні плоту, ні хлявоў вялікіх. Панура выглядаюць. Заходжу ў дом №11.

Паводле спадарства Агейкаў, усё патрабавала рамонту: танюткія нутраныя сьцены давялося ўзмацняць, падлогу перацягваць (была выслана сырымі дошкамі), столь выглядала жудасна. На фарбы, шпатлёўкі, шпалеры, цэмэнт пайшло безьліч грошай. Гаспадары дому дзівуюць: будаўнікі патрацілі каля 20 тыс. даляраў, а хлява няма. І аўтар дзівуе: на што жывяцё, калі кармілец Леанід за студзень атрымаў 80 тысячаў?

«Каб не было сьвіньняў ды кароваў, цяжка давялося б! У хаце цёпла, але аднаго брыкету за зіму пайшло 6 тонаў (тона — 42 тыс.). Самастойна вырашалі пытаньне з хлявом...

Зьдзівіла тое, што зводдаль дому №13, у каторым жывуць Пакумейкі, збудавана «шпакоўня». Аказваецца, перамерзла каналізацыя ў студзеньскія маразы, па-другое, выкачка за кошт жыхароў. А «шпакоўня» — мажлівасьць зэканоміць.

Гаспадарам дому №15 самім давялося купляць блёкі і будаваць хлеў. Уладзімер Шацкі, мэханізатар, за сьнежань атрымаў 39 тыс., за студзень — 54 тыс. Як выжыць з такім камічным заробкам? Таксама згадвае пра хлеў: свая гаспадарка ратуе.

## Дзяржава не жадае эканоміць?

— Я рыдала, калі атрымалі гэты дом №19, — кажа Ганна Далматава. — Колькі ўклалі сюды працы, грошай — у гэтыя голыя сьцены, столі, падлогу! Як хацелася, каб нам проста купілі дом у Агарэвічах. Прадаваўся на вёсцы за $3,5 тыс.: цёплы, ёсьць гараж, вялізны хлеў, участак, сад, летняя кухня. На гэтым жа можна было зэканоміць! Дык не: уручылі гэты, амаль за 20 тыс. даляраў, дзе мы самі рабілі дзень і ноч, каб больш-менш упарадкаваць. Мелі трох кароў, малако давала неблагі прыбытак, які ўклалі ўва ўпарадкаваньне. Самастойна вырашылі пытаньне з хлявом: набылі ў вёсцы хату за 300 даляраў, нанялі хлопцаў — і за 500 даляраў яны яго тут і збудавалі. На гэтых трох буронках падарвала здароўе, праца ж бо ручная. Зрабілі мне апэрацыю і папярэдзілі: нічога цяжкога не рабіць.

— Увогуле, гэта частка вуліцы будавалася на тым месцы, дзе калісь багна была, тут летась нават трактар гусенічны патануў, — далучаецца да гутаркі муж Сяргей. — Мне давялося прывезьці ля 100 прычэпаў пяску, каб падвысіць участак. Дзякуем кіраўніку гаспадаркі: уваходзіць у наша становішча... Але дом — лухта. Мы паднялі падлогу ў адным з пакояў, а там керамзіту... паўтара вядра. Ды на гэтыя 20 000 даляраў я б сам адбудаваў шыкоўны маёнтак з усім неабходным і машыну набыў бы.

## «Если вы в своей квартире, лягте на пол: три-четыре...»

Словы зь песьні Высоцкага ўзгадаліся, як мы наведалі трэцюю «пяцёрку» дамоў (тыповы праект падрыхтаваны ДУП «Берасьцекамунпраект»). Іх здалі ўлетку. Кацельную збудавалі ў кухні, катлы, кажуць жыхары, маламоцныя. У добры мароз нельга пакінуць дом на гадзіну-дзьве, могуць быць незваротныя наступствы. Вось і давялося Тацяне Шуляк (гаспадыні адзінага заселенага дому з гэтай сэрыі) у маразы браць адгулы і не адыходзіць ад катла, чуйнаваць начыма (цяпер яна ў больніцы, дзеці — у бабулі, якая пастаянна прыходзіць пратапліваць). Кацёл знаходзіцца ў «шафцы» і «прытоплены» (усталяваны ніжэй роўні падлогі). Канструкцыйная асаблівасьць: топка, куды кідаюць дровы ці брыкет, знаходзіцца нізка, ячэйка для попелу — яшчэ ніжэй. Каб падкінуць дроўцаў, трэба стаць на калені (топка памеру невялікага, падкладваць паліва трэба часта), каб выграсьці попел — зусім легчы на падлогу.

— Я стары чалавек, але такой бязглуздзіцы ў жыцьці ня бачыла, — кажа «прыкаваная» да гэтага дому пэнсіянэрка Мар’я Крывіцкая. — Марна палім брыкет, грошы палім! А хаты не нагрэць — шэрань у кутох, на сьценах. Дачка па хаце хадзіла, укутаная ў коўдру, покі ў больніцу ня трапіла. У кутох адваліліся шпалеры, а яна ж брала крэдыт, каб зрабіць рамонт! І дзе перахоўваць паліва? Няўжо дровам, вугалю, брыкету месца пад сталом на кухні? Давялося на старасьці стаць гімнасткай: то на калені стаць трэба, то легчы. Па 20 разоў на дзень. Няўжо гэта кара маёй дачцэ на ўсё жыцьцё?

## Качагарка ў кухні ці кухня ў качагарцы?

З прычыны таго, што маламоцны кацёл знаходзіцца на кухні, попел непазьбежна разьлятаецца па памяшканьні: кацёл хоць і «ў шафцы», але падкінуць паліва, выграсьці попел можна толькі з адчыненай дзьверцай. Паліва ідзе шмат нават цяпер, калі маразы адступаюць. У добры мароз даводзілася да дзесяці вёдраў попелу выносіць з кухні. Нявідныя часьцінкі падымаюцца ў паветра — і вось, калі ласка, на лядоўні, на шафах, нават на люстры за пару дзён зьбіраецца слой попелу (пэнсіянэрка Мар'я Крыцкая вывела на газавай пліце слова «брыдота»). А ў кухні ж — прадукты (у дамох другой «пяцёркі» катлы ў два разы мацнейшыя і знаходзяцца ў асобным памяшканьні, пытаньняў пра цяпло ці попел там папросту няма).

З такім праектам попел і дым непазьбежна трапляюць і ў іншыя пакоі. Так, у доме №29 яго гаспадар Сяргей Паніч (ён таксама прыходзіць пратапліваць дом) у адным з пакояў зьняў пажарны апавяшчальнік: як толькі пачынае выносіць попел, апавяшчальнік спрацоўвае, «адчуваючы» экстрэмальную сытуацыю.

## Спадзяёмся на станоўчую адповедзь

Без энтузіязму агарэвічане чакаюць вясну: дамы пабудаваныя ў нізіне. Засмучваюць расколіны, што зьявіліся ў сьцянох і на столях (праблема дамоў і ў другой «пяцёрцы»), пад шыфэр не падкладзены рубэроid, і на гарышчы цяпер багата сьнегу. Канструкцыйная адметнасьць катла такая, што гарачай вады ён выдае толькі два вядры — відавочна мала, каб нармальна памыцца (у дамох другой «пяцёркі» можна нагрэць шмат болей вады).

Цікаўлюся (сабраліся амаль усе гаспадары «пяцёркі»): на што спадзяецёся, даслаўшы ліст у Адміністрацыю прэзыдэнта?

— Каб забралі гэтыя дамкі ў нас і кампэнсавалі выдаткі на рамонт. Мы ад іх папросту адмаўляемся. Дом у чыстым полі, халодны, без надштукаваньня і прымітыўна спраектаваны, ды хлеў, дзе толькі граблі паставіць, — гэта насьмех над селянінам.

Праблему агарэвіцкіх навасёлаў камэнтуе заступнік старшыні Ганцавіцкага райвыканкаму Ўладзімер Давыдчык:

— Дамы, пра якія тут вядзецца, збудаваныя паводле праекту, што не прадугледжвае нутранога надштукаваньня. Сам праект па многіх характарыстыках няўдалы. Але ж трэба было ўкласьціся ў 18 000 даляраў! Наступныя дамы, што ўжо будуюцца на вёсцы (і ў Агарэвічах, вядома ж), будуць больш добраўпарадкаваныя (з мансардай, іншай страхой, з бэтоннымі ходнічкамі) і парадуюць навасёлаў. Мы ўцяплім тыя пяць дамоў пры вул.Маладзевай у Агарэвічах, пра якія вядзецца, пераробім пашыральныя бакі, каб на мыцьцё выходзіла болей ад двух вёдраў. Што датычыць нізкага разьмяшчэньня катла на кухні, дык магу толькі паўтарыцца: такі праект, ня намі ён распрацаваны, наша справа — будаваць паводле зададзенай праграмы... У 2009 г., плянуецца, сюды прыйдзе газ.

**Паводле «Вечэрнего Бреста»**



# У Польшчы асудзілі былых міліцыянтаў за зьдзекі з апазыцыянэраў у 1983

Былыя міліцыянты Эдвард Мішталь і Януш Смуга, якія зьбівалі ў 1983 г. супрацоўнікаў Камітэту самапомачы пры прымасе Польшчы, асуджаныя на пяць і чатыры гады турмы. Прысуд стаў вядомы ў аўторак. Дзякуючы амністыі, Мішталь будзе сядзець два з паловай гады, Смуга — два.

3 траўня 1983 году людзі Мішталя з антытэрарыстычнага аддзелу міліцыі ўварваліся на тэрыторыю кляштару сясьцёр-францішканак у варшаўскім Старым Месьце. Там у гэты час сабраліся супрацоўнікі Прымасаўскага камітэту. Міліцыя мела інфармацыю, што яны займаюцца «апазыцыйнай дзейнасьцю».

Затрыманых павезьлі ў лес, па дарозе пагражаючы расстрэлам, зьбіваючы і абражаючы. У лесе людзей выпусьцілі, сканфіскаваўшы грошы і забраўшы дакумэнты.

Тая міліцэйская антытэрарыстычная брыгада на чале зь Мішталем была створаная ў 1981 годзе. Яе байцы ўдзельнічалі ў разгоне страйку ў варшаўскай пажарнай школе ўвосень 1981 г. Падчас ваеннага становішча яны затрымлівалі дзеячаў падпольля, ахоўвалі аэрапорт Акенце і несьлі службу падчас візыту папы Яна Паўла II у Польшчу.

Пасьля 1990 г. Мішталь пакінуў паліцыю і як пэнсіянэр заклаў ахоўную фірму.

Дзеі польскіх міліцыянтаў таго часу да болю нагадваюць цяперашнія подзьвігі беларускіх спэцназаўцаў. Многія іх дзеяньні парушаюць заканадаўства. Задакумэнтаваныя выпадкі даюць надзею на перамогу законнасьці і справядлівасьці ў будучыні — хай нават праз 23 гады, як у Польшчы.

**АГ**

# Свой пісьменьнік

У сакавіку ў беластоцкага пісьменьніка Міхася Андрасюка выйшла кніга «Белы конь». Яна складаецца зь дзевяці лірычных навэляў пра лёс вялікай сям'і Іванюкоў, што па Другой сусьветнай вайне апынулася ў Польшчы, — дзяржаўная мяжа прайшла па сярэдзіне сядзібы Ўладзімера Іванюка.

Яшчэ нядаўна ня верылася, што пасьля Сакрата Яновіча Беласточчына бліжэйшым часам народзіць новага празаіка. Але вось ён. Піша, выдаў тры кнігі. Са сваім адметным стылем — акварэльным, навэлістычным, іранічным, з адметным гумарам. У Беларусі яго няма з кім параўнаць.

Уяўляю, як цяжка пісаць пра невялічкае мястэчка Гайнаўка, якое фактычна паўстала 50 гадоў таму, пасьля таго, як у Белавескай пушчы змайстравалі тартак. Бо ў Гайнаўку пазьяжджалі сяляне, якія апынуліся пры мяжы, як у тупіку.

Але Андрасюк не стамляецца, не вычэрпваецца.

30 сакавіка ў Гайнаўцы адбылася прэзэнтацыя кнігі. На ёй прысутнічалі ня толькі жыхары мястэчка, але і госьці зь Менску (група ліцэістаў на чале зь Леанардай Мухінай) і гарадзенскі бард Віктар Шалкевіч.

**Алесь Аркуш**

# Польскі фонд прапануе адпачынак затрыманым і іх сем'ям

Фонд «Вольная Беларусь» пачаў праграму дапамогі ахвярам палітычных рэпрэсіяў у Беларусі і іх сем'ям.

Фонд распаўсюдзіў у Інтэрнэце запрашэньне скарыстацца ягонай падтрымкай як ахвярам рэпрэсіяў (асобам, якія адбылі зьняволеньне па палітычных матывах), так і сем'ям асобаў, якія на гэты момант адбываюць пакараньне альбо знаходзяцца пад арыштам па палітычных матывах.

У якасьці формаў падтрымкі фонд прапануе перабываньне ў Польшчы цягам 2—4 тыдняў з навуковай стажыроўкай (практыкай) у дзяржаўных, прыватных інстытутах і навуковых установах, няўрадавых арганізацыях, атрыманьне мэдычнай дапамогі і матэрыяльнай падтрымкі.

У якасьці доказу досыць падаць інфармацыю з прэсы і копіі судовых пастановаў, якія сьведчаць пра атрыманае пакараньне, а таксама пра дзейнасьць пацярпелай асобы.

Фонд падае для даведак электронны адрас: fundusz@eedc.org.pl.

# Зварот беларусаў Беласточчыны: «Ахвярнасьцю напярэдадні 25 Сакавіка вы ўлілі надзею...»

Мы, удзельнікі сьвяткаваньняў 88-х угодкаў Акту 25 сакавіка 1918 г., выказваем салідарнасьць з усімі тымі беларускамі і беларусамі на нашай духоўнай Бацькаўшчыне, якія так мужна адстойваюць сёньня ідэі незалежнай і свабоднай Беларусі.

Беларускае грамадзтва, нягледзячы на рэпрэсіі, даказала, што хоча пераменаў, і сваімі дзеяньнямі набліжае той момант, калі адчуе сябе сапраўдным гаспадаром у сваім беларускім доме. Сваёй ахвярнасьцю напярэдадні Дня 25 сакавіка вы таксама ўлілі надзею ў сэрцы і душы беларусаў па-за межамі Бацькаўшчыны. Дзякуй вам за гэта.

Мы поўнасьцю ўсьведамляем, што безь беларускай паводле зьместу дзяржавы далейшы лёс нашай нацыянальнай меншасьці ў Польшчы значна ўскладняецца.

Сёньня з гэтага месца мы выказваем спадзяваньне, што Беларусь хутка паверне на шлях дэмакратычнай дзяржавы, дзе толькі канстытуцыйны парадак вызначае палітычна-грамадзкае жыцьцё краіны. Краіны, у якой няма палітычных вязьняў і рэпрэсіяў супраць свайго народу.

Беларуская незалежная ідэя, нягледзячы на ўсе складанасьці і рэпрэсіі, — заўсёды выжыве. Сьвяткуючы і ўшаноўваючы памяць змагароў за Беларускую Народную Рэспубліку, мы можам толькі паўтарыць і быць вернымі іх запавету. Калі ёсьць ідэя, тады і будзе перамога. Жыве Беларусь!

**Старшыня Беларускага саюзу ў Польшчы**
**Яўген Вапа, Беласток**

# НАВІНЫ ЭЎРАЗЬВЯЗУ

## ЭЗ вітае беларускую апазыцыю

Беларускія ўлады выявіліся нядольнымі правесьці дэмакратычныя выбары й выканаць свае абавязкі перад АБСЭ — сьцьвярджаецца ў заяве Эўразьвязу, зробленай з нагоды выбараў у Беларусі. У зьвязку з дапушчанымі грубымі парушэньнямі правоў чалавека й арыштамі дэманстрантаў, ЭЗ вырашыў прыняць «жорсткія захады супраць А.Лукашэнкі й іншых асобаў, адказных за ігнараваньне міжнародных стандартаў правядзеньня выбараў». Разам з тым ЭЗ «вітае слова свабоды ад дэмакратычный апазыцыі й грамадзянскай супольнасьці Беларусі» й пацьвярджае сваё жаданьне пашыраць падтрымку грамадзянскай супольнасьці, умацоўваць доступ да незалежных сродкаў масавай інфармацыі.

## 2,78 млн эўра для ЭГУ

Эўракамісія й Рада міністраў Паўночных краінаў падтрымалі Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт, што дзейнічае ў Вільні, сумай у 2,78 млн эўра. Гэта дазволіць 350 студэнтам вучыцца ў ЭГУ цягам трох гадоў. Эўракамісія ахвяруе 2,2 млн эўра.

Эўракамісар па вонкавых сувязях і эўрапейскай палітыцы суседзтва Бэніта Фэрэра-Вальднэр адзначыла: «Дзякуючы нашай падтрымцы каля 350 беларускіх студэнтаў будуць мець доступ да вышэйшай адукацыі ва ўмовах свабоды слова й думкі. Яны вернуцца дадому з досьведам жыцьця ў дэмакратычнай краіне й разуменьнем правоў, якімі карыстаюцца эўрапейскія грамадзяне. Гэта вельмі істотна для тых, хто імкнецца да ўсталяваньня дэмакратыі ў Беларусі».

Пагадненьне падпісана сакратаром Рады міністраў Паўночных краінаў сп.Пэрам Ункелем і сп.Анатолем Міхайлавым, рэктарам ЭГУ.

## Саляна аб Прыднястроўі

Камісар ЭЗ па пытаньнях замежнай палітыкі й палітыкі бясьпекі Хаўер Саляна прыняў заяву ў зьвязку з прыняцьцем Украінай і Малдовай дэкляраццыі па мытным кантролі, у адпаведнасьці зь якой Украіна прызнае толькі малдаўскія мытныя пячаткі, а Малдова спрыяе рэгістрацыі прыднястроўскіх прадпрыемстваў у Кішынёве. Саляна заклікаў самаўтвораныя органы ўлады Прыднястроўя не блякаваць гэтую рэгістрацыю й пацьвердзіў цьвёрдую прыхільнасьць Эўразьвязу тэрытарыяльнай цэласнасьці Малдовы.

## Шматмоўе як галоўная каштоўнасьць

Сябра Эўракамісіі па пытаньнях адукацыі, мовы й культуры Ян Фігель нядаўна выказаў пазыцыю Эўракамісіі наконт фэномэну эўрапейскага шматмоўя: «Гэта — адна з нашых каштоўнасьцяў. Мова ня толькі вызначае кожнага з нас, але й зьвязвае нас з нашай культурай. З 500 млн насельніцтва і 80 мовамі ЭЗ валодае калясальным капіталам, фантастычнай разнастайнасьцю — і гэта трэба ўсяляк абараняць». Дзеля гэтага Эўракамісія, словамі Фігеля, зьбіраецца заахвочваць грамадзянаў вывучаць некалькі моваў, папулярызаваць і пашыраць значэньне моваў у эканоміцы ЭЗ, бо валоданьне мовамі ёсьць чыньнікам большай мабільнасьці работнікаў і лепшых пэрспэктываў у пошуку працы. Дарэчы, зараз у сярэднім у Эўразьвязе 44% насельніцтва не валодаюць ніякай іншай мовай, апроч роднай.

## Новы эўрапейскі альянс

Эўракамісія ўтварыла новае аб'яднаньне — Эўрапейскі альянс карпаратыўнай сацыяльнай адказнасьці, у які можа ўвайсьці якое заўгодна эўрапейскае прадпрыемства ці кампанія. Гэты альянс мусіць стацца свайго кшталту «палітычным парасонам» для новых сацыяльных ініцыятываў буйных карпарацыяў і прадпрыемстваў малога й сярэдняга бізнэсу. Галоўныя задачы аб'яднаньня: стварэньне новых працоўных месцаў для г.зв. «асобных сацыяльных групаў» (у прыватнасьці, для інвалідаў), паляпшэньне аховы здароўя, рацыянальнае выкарыстаньне прыродных рэсурсаў.

## Малы бізнэс расьце на Балканах

Летась лідэрамі ў разьвіцьці малога бізнэсу сталі Сэрбія й Харватыя. Тыдзень таму віцэ-прэзыдэнт Эўракамісіі Гюнтэр Фэрхойген адзначыў, што галоўнымі чыньнікамі гэтага посьпеху сталі ўмовы для таннага й хуткага пачатку ўласнай справы, стварэньне сыстэмаў адукацыі для бізнэсоўцаў-пачаткоўцаў, а таксама заканадаўчыя палёгкі, у першую чаргу — у падатковай сфэры.

## 200 тысячаў — за цуды тэхнікі

У Вене днямі былі ўручаныя прэміі за ўнёсак у галіну эўрапейскіх тэхналёгіяў. Сёлета іх атрымалі тры кампаніі: галяндзкая, якая прэзэнтавала кампутарную памяць, што можа вытрымліваць уплыў радыяцыі й тэмпэратур да 200 градусаў Цэльсія; дацкая, што распрацавала сыстэму бясьпекі, якая распазнае твар, а таксама француская — з сыстэмай адбіткаў пальцаў, што абараняе ад мультымэдыйных піратаў. Кожная з кампаніяў атрымала па 200 тысячаў эўра.

Больш падрабязную інфармацыю вы знойдзеце на афіцыйным партале Эўразьвязу (europa.eu.int), сайтах старшынёўства Аўстрыі ў ЭЗ (www.eu2006.at/en/index.html?null) і прадстаўніцтва Эўракамісіі ва Ўкраіне й Беларусі (www.delukr.cec.eu.int і www.delblr.cec.eu.int).

**Падрыхтаваў Зьміцер Дрыгайла**



**Маладачанскі гардкор-гурт «Усплёск» сыграў канцэрт у Познані, на пляцы Адама Міцкевіча. Агнявым шоў выступ аздаблялі дзяўчаты з клюбу «Fire ball».**

# Фільм пра палескую сьвятасьць

Адбылася прэм'ера новай карціны Галіны Адамовіч.

23 сакавіка ў менскім кінатэатры «Цэнтральны» была рэпрэзэнтаваная новая дакумэнтальная стужка Галіны Адамовіч «Завядзёнка».

Кароткі фільм зь дзвюх частак здымаўся на Палесьсі, героі — сям'я Івана і Тацяны Слуцкіх зь вёскі Старына. У іх 12 дзяцей, 9 унукаў — і гаспадарка з чатырма каровамі й цяжкавіком.

Але фільм далёкі ад афіцыёзнага кічу ці этнаграфічнае замалёўкі. Ён — пра сьвятасьць штодзённасьці і клапатлівую прысутнасьць сакральнага. Побытавыя справы, гаспадарка, кухня асьвечаныя цяплом і любоўю; турботы дня засьпяваюць гаспадыню ў царкве, а твары дзяцей зьзяюць, як жывыя абразы.

У фільме няма «прыгодніцкага» сюжэту (з галоўных падзей — вясельле), адсутнічае тлумачальны дыктарскі тэкст і амаль няма словаў. Стужка ёсьць самім жыцьцём, працятым спагадаю і любоўю.

Пекныя кадры ад Тацяны Логінавай, музыка Івана Кірчука і шумавая партытура Сяргея Сіняўскага даводзяць маленькі шэдэўр да бляску.

З карцінаю «Божа мой» «Завядзёнка» складае дылёгію. Старая зь фільму «Божа мой» — скульптарка з каталіцкае вёсачкі. Сваімі творамі яна вырываецца са штодзённасьці — для нябёсаў. А Тацяна Слуцкіх з праваслаўнага Старына раскрывае нам сьвятасьць штодзённае завядзёнкі. «Штодзённыя» фільмы творцы таксама ёсьць «завядзёнкаю», якая струменіць жывой вадой і праўдай, якой нам так не хапае.

**Андрэй Расінскі**

# Красавік

**7** — Дабравешчаньне ў праваслаўных.

**9** — Пальмавая нядзеля ў каталікоў.

**9** — 75 гадоў з дня нараджэньня акадэміка АН БССР, хіміка Вадзіма Сьвірыдава (1931—2002), чыёй навуковай дзялянкай сталі дасьледаваньні ў галіне фатахіміі, неарганічнай хіміі й інш.

**10** — 75 гадоў з дня нараджэньня літаратуразнаўцы Івана Чыгрына (1931), які дасьледаваў прозу «Маладняка» і «Ўзвышша», уклаў у 1976 г. зборнік «Выбраныя творы» Ядвігіна Ш.

**11**— Дзень народзінаў прарока Мухамада ў мусульманаў.

**13** — Пэсах.

**16** — Вялікдзень у каталікоў і пратэстантаў.

**16** — Вербная нядзеля ў праваслаўных.

**19** — 125 гадоў з дня нараджэньня гісторыка Ўсевалада Ігнатоўскага (1881—1931), эсэра, старшыні Інбелкульту і I прэзыдэнта Акадэміі навук.

**19** — 125 гадоў з дня нараджэньня народнага мастака БССР Валянціна Волкава (1881—1964), аўтара карціны «Менск. 3 ліпеня 1944 г.».

**25** — 75 гадоў Беларускаму аб'яднаньню пралетарска-калгасных пісьменьнікаў (1931). У аб'яднаньне, якое хацела «стварыць пралетарска-калгасную літаратуру» й праіснавала толькі год, уваходзілі Іларыён Барашка, Платон Галавач, Сымон Баранавых.

**23** — Вялікдзень у праваслаўных

**29** — 75 гадоў з дня сьмерці акадэміка Яўхіма Карскага (1861—1931), аўтара фундамэнтальнай працы «Беларусы».

**30** — 125 гадоў з дня нараджэньня паэта-нашаніўца Янкі Журбы (сапраўднае імя Іван Івашын, 1881—1964).

# Мужчыны ня плачуць




«Ляпіс Трубяцкой». «Глория Медиа», 2006.

Пакуль жонка Міхалка здымаецца аголенай для ўкраінскіх часопісаў, ён піша музыку да расейскіх сэрыялаў.

Пакуль жонка Сяргея Міхалка Алеся Берулава здымаецца аголенай для ўкраінскіх мужчынскіх часопісаў, сам ён піша музыку да расейскіх тэлесэрыялаў. Новы дыск «Ляпісаў» — не нумарны альбом, хоць большасьць песень раней не выдавалася. Самі ўдзельнікі называюць гэтую праграму сайд-праектам, у якім узяў удзел «Ляпіс» у поўным складзе. Акрамя ўласна «ляпісаўскіх» музыкаў, у запісе ўзялі ўдзел акардэаніст «Лепрыконсаў» Фёдар Федарук, заслужаны артыст Беларусі бас-гітарыст Аляксандар Каліноўскі і этна-трыё «Тройца» ў поўным складзе. Дыск паказвае іншага «Ляпіса» — з блатной афарбоўкай, без радыйных гітоў. Паказальна, што дыск падтрымала «Радыё Шансон». Такія песьні па настроі, як «Прабачце, Маша», можна было знайсьці адну-дзьве на кожным альбоме, тут жа іх большасьць. Песьні сталіся саўндтрэкам да аднайменнага сэрыялу, некаторыя прагучаць у фільме «Апошні забой», які вось-вось выйдзе ў пракат. Знайшлося месца тут і Міхалку-лірыку — пасумаваць можна пад баляду «Золатам агні» ды наноў запісаныя «Русалкі». Цікава, што 80% песень былі запісаныя без падкладак — музыкі проста зьбіраліся ў студыі, сядалі і гралі, як на канцэрце. Ад гэтага і гучаньне дыска выйшла трохі «кухонным», але вельмі натуральным.

Сёлета чакаем новы нумарны дыск «Ляпісаў» пасьля двухгадовага зацішша. З кожнай праграмай самы папулярны беларускі гурт у Расеі становіцца ўсё цікавейшым у музычным пляне.

# Заенька




«Indiga». БМА Group, 2006.

На ўсе закіды пра беларускае «Тату» Руся адказвае: наш тэкст больш інтэлектуальны.

Доўгачаканы самотнік ад гурту, які за нейкія два гады рвануў з катэгорыі «таленавітыя дэбютанты» ў першы эшалён беларускага року. На дыску ўсяго два арыгінальныя трэкі (і яшчэ колькі рэміксаў), аднак яго варта паслухаць. Каб пачуць кранальны дуэт Русі ды Ігара Варашкевіча ў загалоўнай песьні. Каб пабачыць, у які бок рухаюцца колішнія пераможцы «Басовішча». «Indiga» адказна падышлі да запісу, выклаўшы амаль дзьве тысячы даляраў, таму заганаў тут не адшукаеш. У ангельскамоўнай «Honey goes down» пяецца пра каханьне між дзьвюма дзяўчынамі — тэма, якая ў беларускім року дагэтуль не ўздымалася. На ўсе закіды пра беларускае «Тату» вакалістка Руся толькі адказвае: той, хто ведае ангельскую мову, зразумее, што наш тэкст куды больш інтэлектуальны. Новы дыск «Indiga» выйшаў добрым пацьверджаньнем статусу Русі як новай рок-князёўны.

Песьня «Honey goes down», як і «Заенька», сустракаецца на дыску ў некалькіх клюбных апрацоўках. Трэкі ў стылістыцы «smooth passion» і «spaceman» былі зробленыя дыджэямі з Аўстрыі, дзе гурт па хуткім часе будзе канцэртаваць.

У якасьці рэклямнай фішкі «індыганы» скарысталі... Азаронка: на карэньчыку дыска надпіс па-ангельску: «Ухвалена стваральнікамі фільму «Духоўная вайна».

Рэкамэндуецца ўсім прыхільнікам электроннай музыкі і сучаснага беларускага року.

# Я знаю




«КлЁндайк». West Records, 2006.

Разьлік «КлЁндайку» — на рамантыкаў без абмежаваньняў узросту.

Яшчэ адзін сынгл ад каманды з жаночым вакалам, якая выконвае прыемны поп-рок па-расейску. Шукаць паралеляў і падабенстваў «КлЁндайку» да кагосьці ня мае сэнсу: іх музыка і тэксты падобныя да сотні камандаў фармату расейскага «Нашага радыё», і адначасова беларуская каманда — унікальная. Гэткі парадокс можна патлумачыць наяўнасьцю харызматычнай вакалісткі Каці Пытлевай — тэлевядоўцы «Першага музычнага каналу». Цікава, што бацькам групы стаў клявішнік Макс Івашын «Neuro Dubel» — тры гады таму ён шукаў голас для свайго новага музычнага праекту і запрасіў на праслухоўваньне Кацю, а потым да музыкаў далучыўся гітарыст «PostScriptum» Вадзім Марголін, так што і навічкамі на музычнай сцэне «КлЁндайк» не назавеш. Хоць дыск «Я знаю» для іх першы.

Разьлік «КлЁндайку» — на рамантыкаў без абмежаваньняў узросту; на тых, хто можа ісьці па вуліцы, задумацца і забыць схавацца ад дажджу; на тых, хто сваё першае каханьне перажывае ўсё жыцьцё...

**Сяргей Будкін**

# Ліст у Ганконг

эпістalярнае эсэ

**СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ**

Дарагі сябра Лі!

Так даўно табе не пісаў, так даўно. Цэлае жыцьцё, здаецца, праминула. Зь няёмкасьцю ўзгадваю прыблізную дату апошняга майго ліста да цябе. Прыкра было потым пісаць. Адна карысьць, калі ўспамінаю мінулы час: перад вачыма паўстае храналягічны ланцужок — даты з малюначкамі са школьнага атлясу. Хацелася б, каб гэта былі ўсё тыя ж Мэсапатамія, Бабілён, старажытныя дзяржавы. Пункцір паходаў і бітваў Пампэя, Аляксандра Македонскага. Вялізная мапа Кітаю. Даты: няўдачы, паразы, страты. Паўстаньне чырвоных паскаў. Але на справе я бачу іншыя падзеі, зусім нядаўнія: турмы, сьмерці, гвалт.

Апошні мой ліст да цябе — сьведчаньне іншай эпохі. Тады я рэдагаваў газэту, якая мела аднолькавую назву з нашым слаўным старадаўнім гербам. Як напісаў калісьці летапісец: «Рыцар збройны на кані зь мячом, ежэ ныне нарычут Пагоня». У пэўным сэнсе слаўныя часы. Ат, двойчы ўжыў слова, якога не ўжываю. Раблюся, браце, сэнтымэнтальным. Было цяжка пачынаць рабіць на пустым месцы зусім новую газэту, толькі з думкай пра тое, што з такой назвай калісьці існавала, але зьнікла. Цяжка, але прыемна.

Усё было далёка ад ідэалу. Мне ледзьве хапала на каву апоўдні, мы марылі пра кампутары, маючы адну толькі гаргару-друкарку. Але пайшлапайшла пакрысе ў шырокі сьвет газэта з рыцарам у шыльдзе. Няма. Хуткі суд — забіта газэта. Другі — пакараны тыя, хто яе рабіў. А ўперад, цяжка ўзгадваць, наш слаўны (ат!) герб, наш збройны рыцар паляцеў кумільгом з урадавага гмаху… А сьцяг падзерлі на шматкі ворагі беларушчыны, пра якіх калісьці трапна напісаў наш пясьняр. Вось такія сумныя гісторыі. Песьні жальбы, як у нас кажуць сёньня тыя, хто яшчэ здольны да самаіроніі.

Знаеш, яны потым накінуліся на бронзавую конную статую. Ну, ня з голымі рукамі, вядома. Хтосьці сказаў, што ня можа сапраўдная эўрапейская краіна ня мець коннага помніка. Зразумела, што свайму слаўнаму (халера!) рыцару, а не цьмутараканскаму герою. Яны ламалі яму рукі, адпілавалі голаў, меч, нявечылі каня, трушчылі яму чыгуннай куляй ногі. Трафэі дзесь у іхніх кабінэтах — як сьцягі пераможаных войскаў. Мне чамусьці тады прыгадалася хрэстаматыйная статуя Лаакоана. Ты ня памятаеш, яго тады конча задушыла тая гідра? Ці ён ачуняў? Рытарычнае, зрэшты, пытаньне.

А дарэчы, той апошні мой ліст да цябе, выбачай, я надрукаваў у сваёй кніжцы. Назва да цябе ня мае дачыненьня — «Лісты да хома саветыкуса». Я ведаў, што ў нас любяць пісаць «гома». Але ў гэтым разе «хома» гучала, так бы сказаць, цяплей і болей у лацінскім духу, ці што. Бо з «гома» у нас пачынаецца іншае, вельмі пашыранае сёньня слоўка, якое захоўвае ў мове зусім не нэўтральнае адценьне. Дык вось, большасьць нашых людзей — гэтыя «хомы». Але трэба пазьбягаць пагарды, бо, як сказаў адзін хітры палітык, — народ не выбіраюць. Праўда, для адных такі народ — шчасьце, для іншых — згрызоты сумленьня.

Дык вось той ліст. На жаль, і тады было прынамсі кепскавата, пра гэта я табе і пісаў. Увесь час чорныя набрыняныя хмары, увесь час нібы на вулкане. Увесь час у прадчуваньні землятрусу, закалоту палкоўнікаў. Сыходзячы, чужое войска закапала ў нас сваю бочку з порахам. Кожнага дня адчуваньне сябе ва ўнутранай эміграцыі. Памятаю, наракаючы гэтак, я цікавіўся ў цябе тады: калі ты будзеш пачувацца больш эмігрантам — напярэдадні далучэньня да Кітаю ці тады, калі гэтая няўмольнасьць зьдзейсьніцца?

Тое лета, калі вас далучылі да Кітаю, я правёў у Златай Празе, быў там па сваіх рэпарцёрскіх справах. Самае шчасьлівае лета ў маім жыцьці. І самае плённае: я напісаў аповесьць, але гэта іншая тэма. Я сачыў па паведамленьнях інфармацыйных агенцтваў за набліжэньнем да кляйнотаў Ганконгу чэпкіх рук камуністычных кітайцаў. Я хваляваўся за цябе. І спачуваў нават. Хаця мы былі ў такім жа злавесным становішчы. Прага стала для мяне глытком свабоды.

Свабода пачалася ў Празе. Потым прыйшлі танкі. Задушылі свабоду (Лаакоан?!). Але яна дзівам апрытомнела, вымкнулася з жалезных абдоймаў. Хваля дакацілася да нас. Але мы былі нават не каменюкаватым пляжам, а шэрым няўтульным скалістым берагам. А яны там у сябе ў Празе абралі прэзыдэнтам пісьменьніка, які паміж радкоў гаварыў пра свабоду. Дакладна месяц таму ў нас у ПЭНе галасавалі, каб вылучыць яго на Нобэлеўскую прэмію. А я галасаваць не паехаў, я сядзеў у судзе, дзе людзей судзілі за вершы. І пасадзілі за краты.

Дружа Лі! Мяне заўжды ўражвала, што яны там, у Празе, маюць прозьвішча Свобада. Толькі яны. Іншая рэч, што менавіта генэрал Свобада ўпусьціў тады танкі ў Злату Прагу. Але яго можна зразумець у адным: ад танкавых абцугоў немагчыма было ўратавацца. Кроў адно магла замацаваць прагу да свабоды. Альбо, наадварот, спарадзіць паняверку. Зрэшты, бараніць свабоду ніколі не было зусім безнадзейнай, пагатоў шкоднай справай.

«Свабода». Так называлася падпольная газэта, якой ніхто ня бачыў, але якую пачаў шукаць я, калі яшчэ быў студэнтам. Шукаць, каб абудзіць у сэрцы і сэрцах думкі аб свабодзе. І мы дачакаліся яе. Сама яна была пекнай. Акалічнасьці прыгадваць неабавязкова. Але яна трапіла ў рукі, якія прызвычаіліся душыць кожныя праявы той свабоды. Вынік — сумнавядомы. Газэта «Свабода», празь якую мы імкнуліся дастукацца да сэрцаў, стала ахвяра́й. І нават мой сябра, які аддаў ёй сваё сэрца, таксама не жыве, памёр. Мне яго вельмі не хапае.

А сёньня… сёньня нас рыхтуюць да пажыцьцёвага праўленьня, слова «свабода» лічыцца замахам на дзяржаўны лад. Нас натхняюць прыкладам камуністычна-кітайскага панаваньня. Наш даслаў днямі вашаму віншаваньні з нагоды пяйсят-і-пяцігодзьдзя чырвонага Кітаю. Нас заахвочваюць прыкладам Вялікага Стырнавога. Нагадай, будзь ласка, да якіх год ён дажыў і аднаасобна кіраваў вашым мільярдам — да дзевяноста, да ста? Нашаму пакуль што — палова гэтага. Значыцца, у нас яшчэ ўсё наперадзе.

## Георгі Станкевіч

***

Калі ледзяшы,
Пазіраючы з дахаў,
Разумеюць,
Што іхнія справы — труба,
Калі зоркі
Зрываюцца зь неба ад жаху,
Спужаўшыся брэху
Вясковых сабак,

Калі сонцам становіцца
Кожная лужына,
І пульсуе цераз край
Чаравікаў адчай,
Калі ўсе мужыкі
Як адзін — недалужныя,
А прычынаю —
Стройныя ногі дзяўчат,

Калі сэрца ад шэрасьці
Больш не маркоціцца,
Атрымаўшы
Блакіту адрэналін,
Нават дзед стогадовы
Зь печкі скоціцца,
Каб напоем вясны
Галаву пахмяліць.

*в. Старыя Ранчыцы*



ЮРАСЬ ДЗЯДЗІНКІН

## Надзея Дзедава

УСІМ, ХТО АДВАЁЎВАЎ ВЯСНУ

на пляцы Каліноўскага ў сакавіку 2006, усім затрыманым і пацярпелым раней, усім, хто працягвае верыць і пераможа, прысьвячаю

Кажуць,
Яна... памірае.
Хоць, зрэшты, здароваю
Даўно не была.
Прысуд няўмольны:
Растане дазваньня...

А лекары й радыё:
Надта ж трывушчая
Гэтая хворая.
Ужо аднесьлі на сьметнік
Скамечанае крыльле,
З улюбёнай скрыпкі
Зьдзерлі —
Не здрыгануўшыся —
Званчэйшую струну,
А родным —
каб суцешыць —
Кудзеркі па пасмачцы
Раздалі.
На памяць.
(Ат, пасьпяшаліся!)
А пальцы апяклі
Двухвокісам страху,
Вядомай усім
Атруты.
Каб паспакайнела,
Зьмірылася
Са сьмерцю.
Каб ня рыпалася!

«Хворая — да таго ж
Вар'ятка!
Крычыць, што ЖЫВЕ,
Упартая!»
Яна, праўда,
Яшчэ ўстае,
Шчэ адрозьнівае
Чырвоны колер
Ад белага,
Шчэ сьпявае
Пад скалечаную скрыпку.
І многа плача,
Захліпаючыся
Ад шматгадовага стрэсу.
Вунь — наплакала
Цэлую плошчу!
А нехта
Зьдзекліва топча
Ейныя сьлёзы,
А ўсё ж баіцца,
Каб не паўтарылася
Гэткая гістэрыка.
Ды яна канаць,
Відавочна, не жадае
І прадуктыўна вырабляе
Парэпанымі ручкамі
Бусьлікаў
З блакітнае паперы.
За дзьвярыма выпадкам
Чуе дыягназ:
«У крыві
КРАІНЫ
Вашай
Бель».

Чакайце,
А хто сказаў,
Што гэта
Ня лекуецца?

*Менск*

# Да 100-годзьдзя газэты «Наша Ніва»

**РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар»**

**пры падтрымцы газэты «Наша Ніва», часопісаў «ARCHE», «Дзеяслоў», інтэрнэт-выданьняў «Літара.net», «Кнігі.com»**

**абвяшчае**

# КОНКУРС ДЛЯ МАЛАДЫХ ЛІТАРАТАРАЎ

Да ўдзелу запрашаюцца творцы ад 16 да 26 гадоў (на момант абвяшчэньня конкурсу). Ляўрэаты конкурсу будуць запрошаныя на літаратурны сэмінар і майстар-клясы, дзе перад імі выступяць знаныя пісьменьнікі, выкладчыкі ВНУ, вучоныя, сьпевакі, адбудзецца зацікаўленая гутарка аб творах маладых аўтараў і літаратурнай дзейнасьці.

На конкурс прымаюцца літаратурныя творы (вершы, апавяданьні, эсэ, п'есы, сцэнары, дзёньнікі і г.д.).

**Да разгляду будуць прымацца творы, дасланыя (паводле даты на паштовым штэмпэлі або даты адпраўкі электроннага ліста) не пазьней за 15 красавіка 2006 г. Падвядзеньне вынікаў першага туру адбудзецца 25 красавіка. Літаратурны сэмінар пройдзе ў Менску ў першай палове траўня.**

**Творы дасылайце на адрас:** e-mail: maladylitaratar@tut.by. **Паштовы адрас:** а/с 218, 220050, Менск, РГА «Беларускі ПЭН-цэнтар». У лісьце абавязкова пазначце дату нараджэньня і кантакты (паштовы і электронны адрасы, тэлефоны). **Даведкі праз электронную пошту ці тэлефон (017) 284-73-29.**

**Журы конкурсу:**

Уладзімер Арлоў, Андрэй Дынько, Ганна Кісьліцына, Барыс Пятровіч, Андрэй Хадановіч.





Штось надвор’е, як на грэх:
Ці то дожджык, ці то сьнег…

Штось надвор’е, як на злосьць:
Можа, ў небе дзірка ёсьць?



Зробім мы усё як трэба
Ды адрамантуем неба



Каб нам сонейка зноў зьзяла
Ды зямельку саграавала!

## Выстава Анатоля Клешчука

**7 красавіка** а 17-й у Нацыянальным мастацкім музэі (вул.Леніна, 20) адчыніцца фотавыстава Анатоля Клешчука «Боль сьціхае павольна», прысьвечаная 20-годзьдзю Чарнобыльскай катастрофы.



## КАНЦЭРТЫ

**Зьміцер Вайцюшкевіч**
**11 красавіка** (аўторак). Менск. Клюб «Графіці». Даведкі праз тэл.: 671-58-65.

**«Вечар добрага настрою»**
Бяруць удзел гурты «Altanka», «Гурзуф», «Срэбнае вясельле».
**8 красавіка** (субота). Менск. Палац мастацтваў. Тэл. для даведак: 671-58-65.

**Зіме капец**
**9 красавіка** (нядзеля) у фальварку «Добрыя мыслі» (Менск, Магілёўская, 12) гурт «Князь Мышкін» з праграмаю «Зіме капец».
Пачатак а 18-й.

**transit_06.by**
Міжнародны фэстываль экспэрымэнтальнага кіно, відэа- і мэдыяарту TRANSIT_06.BY.
Менск, музэй гісторыі кіно (вул.Сьвярдлова, 4). Да 30 красавіка.

## ТЭАТРЫ

**опэра**
*на сцэне Цэнтральнага дому афіцэраў*
**8** (сб) — «Кармэн».
**9** (ндз) — «Кот у ботах».
**9** (ндз) — «Царская нявеста».
*на сцэне Белдзяржфілярмоніі*
**9** (ндз) — Вечар папулярнай музыкі.

**Купалаўскі тэатар**
**7** (пт) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**8** (сб) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**9** (ндз) — «КІМ».
**13** (чц), **14** (пт) — «Сымон-музыка».
*Ранішнія спэктаклі*
**9** (ндз) — «Афрыка».
*Малая сцэна*
**8** (сб) — «Адчыніце кантралёру».
**9** (ндз) — «Востраў Сахалін».
**10** (пн) — «Саламея».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**7** (пт) — «Белы анёл з чорнымі крыламі».
**8** (сб) — «Ганна ў тропіках».
**9** (ндз) — «Айбаліт, Бармалей, пра жывёл і Брадвэй».
**9** (ндз) — «Нязваны госьць».

**Тэатар юнага гледача**
**7** (пт) — «Оскар і Ружовая дама».
**8** (сб), **9** (ндз) — «Тут-тук! Хто там?».
**8** (сб), **9** (ндз) — «Раба свайго каханага».

## СПОРТ

**Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі.**
Фінал. Да чатырох перамог.
«Юнацтва» (Менск) — «Дынама» (Менск). Лік у сэрыі 2:0.
**6 красавіка** (чацьвер)
3-ці матч. Менск. Палац спорту. 18.30.
**7 красавіка** (пятніца)
4-ты матч. Палац спорту. 18.30.
**9 красавіка** (нядзеля)
5-ты матч (калі будзе патрэба). Крыты каток у Парку Горкага. 13.00.

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 8 красавіка

**БТ, 14.30**
«Маем рэчы».
Беларусь, 2006, рэжысэр і вядоўца Алесь Матафонаў.
Тэма выпуску — «Матацыклы ў БССР».

**«Лад», 17.55**
«Харысты».
Францыя—Швайцарыя—Нямеччына, 2004, рэж. Крыстаф Барацье.
Псыхалягічная драма.
Настаўнік музыкі трапляе ў школу для цяжкіх падлеткаў. Насуперак жорстаму дырэктару, герой арганізуе ў школе хор...

**«Лад»**
«Воблака-рай».
Расея, 1991, рэж. Мікалай Досталь.
Трагікамэдыя.
Жыцьцё правінцыйнага гарадка мяняецца, калі Мікалай заяўляе, што зьяжджае. Усё гэта мана, але бурныя праводзіны ўжо пачаліся...

**БТ, 22.20**
«Па-за часам».
ЗША, 2003, рэж. Карл Фрэнклін.
Трымценьнік.
Шэф паліцыі Мэт мусіць тэрмінова раскрыць двайное забойства, пакуль сам ня трапіў пад нагляд...
У ролях: Дэнзэл Вашынгтон, Эва Мэндэз.

**СТВ, 23.10**
«Догвіль».
Данія—Швэцыя—Вялікабрытанія—Францыя—Нямеччына—Нідэрлянды, рэж. Ларс фон Трыер.
Драма.
Мінімалісцка-тэатральная гісторыя пра прыроду зла. Грэйс (Ніколь Кідман) трапляе ў маленькі гарадок Догвіль і становіцца закладніцаю мясцовых жыхароў.

### Нядзеля, 9 красавіка

**АНТ, 13.40**
«Бэтмэн: вяртаньне».
ЗША, 1992, рэж. Цім Бёртан.
Комікс.
Фантазіі Ціма Бёртана становяцца яшчэ больш гратэскнымі. Да Бэтмэна дадаюцца Пінгвін (Дэні дэ Віта) і Жанчына-котка (Мішэль Пфайфэр)...

**СТВ, 20.25**
«Бедны, бедны Павал».
Расея, 2003, рэж. Віталь Мельнікаў.
Гістарычная драма.
Жыцьцё і сьмерць расейскага імпэратара Паўла І. Фільм варты прагляду ўжо дзеля гульні Віктара Сухарукава, які выканаў ролю эксцэнтрычнага цара.

**АР**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Бэсон старэе

**Анёл А (Angel-A)**
Францыя, 2005, чорна-белы, 88 хв.
**Жанр:** дыдактычная камэдыя з рамантычнымі элемэнтамі.
**Адзнака:** 7 (з 10).

Люк Бэсон нарэшце вярнуўся да сваіх вытокаў і зрэжысаваў чорна-белую рамантычную камэдыю пра збавеньне душы чарговага недарэкі.
Герой фільму, паталягічны хлус Андрэ (Жамэль Дэбуз), вінны грошы ўсім мафіёзным групоўкам Парыжу. Калі шахрай вырашае зрабіць сабе сьмерць, нябёсы пасылаюць яму выратаваньне ў выглядзе даўганогай бляндынкі-анёла ў нэглiжэ. Анёл валодае каратэ — і па сумяшчальніцтве шлюха.
Найлепшае ў карціне Бэсона — чорна-белыя кадры ад апэратара Т'еры Арбагаста. Кадры стылёвыя, лірычна-вытанчаныя, па-восеньску сэнтымэнтальныя. Чорна-белы позірк нагадае «Неба над Бэрлінам», а пяро ў паветры — «Форэста Гампа».
Плястыка Анёла-бляндынкі (Ры Расмусэн) ідэальна ўпісваецца ў рамантычныя віды Парыжу, а яе звычкі скрадзеныя з колішняй музы Бэсона Мілы Ёвавіч.
Але гэта мілая, цёплая й дасьціпная карціна занадта простая для высакалобага арт-гаўзу, як і занадта аўтарская для камэрцыйнага кіно. Бэсону бракуе «няправільнасьці», юнацкага імпэту, затое бачны падзабыты рэжысэрскі статус.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

**Master Records**
**Пчаліны сэзон**
Драма, ЗША, 2005 рэж. **Скот МакГі, Дэйвід Сыгел**
У ролях: **Рычард Гір, Жульет Бінош, Флора Крос**
Маленькая Эліза здольная вымаўляць па літарах самыя складаныя словы, а сям'я яе распадаецца. Але калі словы падзяляюць, то любоў яднае...
**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**

# Зрабі з газэты часопіс. За 5 сэкундаў



Каб старонкі «Нашай Нівы» не разьляталіся, іх можна сшываць. Найбольш зручна гэта рабіць стэплерам з паваротным мэханізмам, як на здымку. Скобы тады кладуцца ўздоўж лініі згібу, і газэта ператвараецца ў акуратную кніжыцу. Праверана, што стэплерамі, разьлічанымі на 20 аркушаў, можна сшываць і 24 газэтныя развароты (48–старонкавы нумар). Газэта будзе выглядаць акуратнейшай, калі яе адразу сшыць, а ўжо пасьля разрэзаць.

Такі стэплер каштуе ў межах 7—10 тысяч рублёў.

Не забудзьцеся набыць і скобаў да стэплера. Адной упакоўкі за 500 рублёў хопіць, каб сшыць 500 нумароў «Нашай Нівы».

Пытайцеся ў канцылярскіх аддзелах і крамах.

У Інтэрнэце стэплеры з паваротным мэханізмам былі заўважаныя ў крамах ofiston.by і marker.by.


# «Тэорыі ня ведае, але вельмі здольная»

Сёлета жаночы й мужчынскі чэмпіянаты краіны амаль супалі ў часе.

У сярэдзіне сакавіка за першынство ў Менскім палацы шахмат і шашак змагаліся 14 мужчынаў ды 12 жанчын.

Спартовая інтрыга трывала да апошніх тураў: прагнозы аб месцах абвяргаліся скрозь і ўсюды. Леташні лідэр Аляксей Фёдараў умудрыўся ў лепшай пазыцыі прайграць аўтсайдэру Андрэю Малюшу. Майстар Малюш, чэмпіён Беларусі 2004 г., праславіўся хуткай рэакцыяй і… ігнараваньнем спартовага рэжыму. Паміж турамі ён апантана «бліцаваў» з аматарамі. «Андруха, ідзі рыхтуйся», — крычалі экс-чэмпіёну. «Навошта…» У выніку — 14-е месца.

Магілёўцу Фёдараву дасталося «срэбра», а першым да фінішу без паразаў прыйшоў найстарэйшы ўдзельнік, менскі гросмайстар Вячаслаў Дыдышка. Для 57-гадовага інжынэра гэта 11-ты ганаровы тытул — упершыню чэмпіёнам Беларусі ён стаў у 1965 г. Студэнт Андрэй Жыгалка, які чакае зацьвярджэньня гросмайстарскай годнасьці на Кангрэсе ФІДЭ, аказаўся трэцім.

Жанчыны паказвалі самавітую гульню, але многім зь іх папросту не хапала досьведу. Сярэдні век удзельніц склаў блізу 20 гадоў.

Найбольш упэўнена пачувалася за дошкай менская майстарка Наталя Папова, якая абышла старэйшых па званьні Рахіль Эйдэльсон і Вольгу Герасімовіч, а заадно і чэмпіёнку-2005 Ганну Шарэвіч. Другое месца нечакана заняла 16-гадовая дэбютантка, кандыдатка ў майстры Аляксандра Шарова з Рагачова. «Тэорыі ня ведае, але вельмі здольная», — адрэкамэндаваў яе арбітар.

**Як бы вы згулялі?**

Г.Шарэвіч—Т.Бэрлін. Менск, 2006. Ход чорных.



**Адказ**: 1...e5! 2. Ke5 (лепш было 2. 0-0 з роўнасьцю) 2…Te8 3. f4 Cf5! 4. Фf5 Фd4 5. Td1 Kg4! 6. Фg4 Te5+. Чорныя выйгралі фэрзя і партыю.

## ПАПРАЎКА

У №13 ва «Ўспамін пра Генадзя Нарчука» пратачылася няслушная дыяграма. Насамрэч, пазыцыя з шашачнай партыі Арустамаў—Нарчук выглядала так: Белыя простыя — a3, b2, d4, e1, e3, f2, f4, g1. Чорныя — a5, a7, b8, c7, e7, g5, h4, h6. Перапрашаем.



## У НУМАРЫ

### Беларусь і Расея: пагрозы і пэрспэктывы



За выбарча-рэвалюцыйным процістаяньнем неяк не заўважылася, што праграма-мінімум нацыянальнага руху пачатку 1990-х выканана. Піша Васіль Аўраменка. **Старонка 10.**

### Запомні гэтую ноч...



Вершы Сяргея Прылуцкага, Андрэя Хадановіча, Славаміра Адамовіча, Алеся Аркуша, напісаныя 19—25 сакавіка. **Старонка 16.**

### Акадэмік Гарэцкі Севярынцу, Сіўчыку: Гумар выратуе Беларусь



Акадэмік Радзім Гарэцкі напярэдадні Дня геоляга напісаў калегам-геолягам Вячаславу Сіўчыку і Паўлу Севярынцу, якія сустракалі прафэсійнае сьвята ў зьняволеньні. **Старонка 34.**

### «Ляпіс», «Індыга», «КлЁндайк»




Новыя дыскі агледае Сяргей Будкін. **Старонка 41.**

### Адрамантуем неба



«Газэтка дзеткам»: чарговая Плястыляндыя ад Алеся Кудрыцкага. **Старонка 45.**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Валодзю Б. зь Менску.** Наконт сустрэчаў у піварні «Аліварыя»: спачатку распачніце гэтую справу зь сябрамі, а пасьля абвесткаю далучайце іншых. У незалежных суполках моладзі Вы знойдзеце шмат гатовых падтрымаць Вас.

**Студэнту дыпляматыі БДУ.** Адшукаць матэрыялы пра БНР ня маем магчымасьці. Працуйце з крыніцамі самі, калі ласка, найперш з выданьнем «Архівы БНР».

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

В. **Князігініна** Менск. губ. У нас галадае скаціна. У гэту нядзелю, 27 марца, выгналі на пашу каровы, валы, авечкі. Бедная жывёла рыкала з голаду і холаду і ўцякала дадому ў зацішша ад ветру. Сена ў нас пайшло ў цану! Плацяць за пуд 60 і больш капеек, дый купіць недзе; салому плацяць па 30 кап. за пуд.

**Язэп Лявоха**

**«НН». 1911. № 14. 7 красавіка.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### САДОК

**Бацькі**, якія ў пэрспэктыве жадаюць аддаць дзіця ў беларускі садок, час дзейнічаць! Кантакты: т.632–27–43 (Крысьціна), e-mail: kryscina@tut.by; 8–029–403–15–35 (Натальля)

### МУЗЫКА

**Набуду** (за шалёныя грошы) CD «N.R.M.» «Акустычны канцэрт», «Пашпарт», CD «Крама» «Што дапаможа нам», касэты «Мроя» «Песьні 1990—1994», «Рок супраць рэвалюцыяў». Т.: 8–029–572–45–50

### КАНТАКТ

**Зварот** да невядомага чытача «Нашай Нівы» з дому №26 па вуліцы Каштанавай г.Магілёва

Сябра! Па тым, як сыстэматычна ты выцягваеш з маёй паштовай скрыні газэту «Наша Ніва», можна меркаваць, што ты сапраўдны патрыёт, што ты любіш і шануеш беларускае слова! Газэту, на вялікі жаль, цяпер мне перадаюць з рук у рукі, і ты можаш застацца без праўдзівай інфармацыі. Паколькі ў цябе, відаць, не стае грошай на падпіску, то я прапаную: паведамі мне нумар сваёй кватэры і табе ня прыйдзецца турбавацца і лазіць у маю скрыню. Я сам, па прачытаньні, буду класьці «Нашу Ніву» ў тваю. Каб табе не было няёмка, ты можаш не казаць свой адрас асабіста, паведамі мне яго праз газэту ці закінь мне ў скрыню.

З павагай, Аляксандар Агееў, Магілёў.




Прыватныя абвесткі ў «НН» (ня больш за 15 словаў) дасылайце поштай (а/с 537, 220050 Менск), праз e-mail (nn@promedia.by) або разьмяшчайце на форуме сайту www.nn.by.

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2521. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 23.00 05.04.2006.

Замова № 1881.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а